N 27-28 (90) 25 жніўня 1997 г.

НАША НІВА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. Ў ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. ЯК ШТОМЕСЯЧНІК. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ Ў МІНСКУ

Маршрут мы абіралі доўга. Сярод мноства варыянтаў (балазе, рэкаў у Беларусі хапае), абралі Віхру. Апроч спакусы яшчэ раз спраўдзіць памежны рэжым з Расеяй (хто ведае, колькі яшчэ пратрывае халява!..), намі кіравала жаданьне чыста па-дасьледніцку агледзець кавалак этнічнага абшару Беларусі, адрэзаны восемдзесят гадоў таму... А ёсьць яшчэ чыста эстэтычная цікавасьць да ракі з прыгожаю назвай і з суровымі назовамі прытокаў (Лютая, Гародня, Мёртва, Чорная), да іх абрысаў на мапе: мудрагеліста выкручаных, таямніча раскінутых сінім павучыньнем...

Старонка 5.

ВІЛЕНСКІ КЛЮБ

Рэктар падпольнага ўніверсытэту

Напрыканцы ліпеня ў Вільні памёр Лявон Луцкевіч. "Стары віленчук", — адзін зь ягоных псеўданімаў.

"Найбольш дасьведчаны дасьледчык беларускай Вільні" — гэтак называлі яго навукоўцы і журналісты.

Мы пазнаёміліся зь ім гадоў пятнаццаць назад. Я тады прыяжджаў у Вільню, праседжваў у яго часам да раніцы, і, абкладзены фотаальбомамі, слайдамі, старымі кнігамі, — слухаў. Мяркую, што такіх, як я, "пляменьнікаў" у дзядзькі Лявона было шмат. На мяжы 70-х і 80-х ягоная кватэра і Лясная хатка ягонай цешчы Зоські Верас сталі сапраўдным універсытэтам беларушчыны, дзе не адзін студэнт атрымліваў сваю навуку. Лявон Луцкевіч быў рэктарам і выкладчыкам гэтага ўніверсытэту.

Як журналіст ён супрацоўнічаў зь беларускімі, літоўскімі, польскімі газэтамі, з радыё і тэлевізіяй. Як дасьледчык, сыстэматызаваў масу матэрыялу. Як грамадзкі дзяяч, узначальваў школьнае таварыства. Мусіць, няма такога беларускага актывіста позьнесавецкага часу, з кім бы ў Луцкевіча не было перапіскі. І ўсё гэта толькі эпізоды ягоных шырокіх заняткаў.

Але ёсьць за Луцкевічам і пэўнае эксклюзіўнае месца ў культуры. Каб зразумець яго, трэба зьвярнуцца да Вільні — да гэтага суплёту многіх культураў і нацыянальных амбіцыяў, які адначасова сам культура, прычым наднацыянальная, сынтэтычная. Вільня — гэта як спэцыялізацыя.

Адначасова Луцкевіч быў галоўным прадстаўніком беларушчыны ўжо ў самой Вільні. А вылучыла яго на такія ролі права спадчыннасьці і разуменьне свайго пажыцьцёвага абавязку. Фактычна з усяе шматлікае інтэлігенцыі Вільні Луцкевіч заставаўся адзіным прамым беларускім нашчадкам тутэйшае старасьвеччыны, "Нашае Нівы", БНР, Гімназіі, Музэя... —усяго, што стварылі ў свой час ягоны дзядзька Іван і ягоны бацька Антон.

Артыкул памяці Лявона Луцкевіча на старонцы 8.

Ь

У верасьні ў Беларусі мае быць прыняты новы закон аб друку. Мяркуецца, што паводле гэтага закону выданьні, якія карыстаюцца дасавецкім беларускім правапісам, будуць пазбаўленыя права на законнае існаваньне.

Нагадаем, што наркомаўская "рэформа" 1933-га году мела на мэце "спрашчэньне" правапісу беларускае мовы і "набліжэньне" яе да расейскай. "Рэформа" сталася толькі прэлюдыяй для фізычнага вынішчэньня нацыянальнае інтэлігенцыі. Сьледам за мовай былі "спрошчаныя" і яе носьбіты.

Сучасны палітычны рэжым у Беларусі ўзяў курс на рэсавецтызацыю і адкрыта заўяляе пра сваё жаданьне "паўтарыць гісторыю". Трэба меркаваць, што новы закон аб друку мусіць стаць прэлюдыяй для новага фізычнага вынішчэньня нацыянальнае інтэлігенцыі.

У гэткіх умовах супрацоўнікі "Нашай Нівы" — адзінае цалкам беларускае газэты, якая выкарыстоўвае аўтэнтычны правапіс — пакідаюць за сабою права не "паўтараць гісторыю", г.зн. лёс сваіх папярэднікаў, расстраляных, замучаных і абязволеных у сталінскіх турмах і лягерах. Для нас не стаіць пытаньня выбару паміж законамі антыбеларускага рэжыму і роднаю мовай. Маральны выбар мы пакідаем тым, хто прыдумляе амаральнае заканадаўства.

"Наша Ніва" будзе надалей выходзіць "зь мяккімі знакамі". Гэта наш этычны і эстэтычны прынцып і воля нашага "электарату" — чытацкае аўдыторыі газэты.

"НН"

Віленскія сустрэчы

5-6 верасьня ў Вільні адбудзецца міжнародная канфэрэнцыя "Суіснаваньне народаў і добрасуседзкія адносіны — гарант бясьпекі і стабільнасьці ў Эўропе", у якой возьмуць удзел лідэры 12-ці дзяржаваў Усходняе і Цэнтральнае Эўропы. На канфэрэнцыі выступяць з прамовамі прэзыдэнты Літвы, Эстоніі, Латвіі, Украіны, прэм'ер Расеі Чарнамырдзін і Лукашэнка. Чынны ўдзел у канфэрэнцыі возьмуць навукоўцы, палітыкі, грамадзкія дзеячы зь Літвы, Польшчы, Беларусі, Эстоніі, Латвіі, Фінляндыі, Нямеччыны, Расеі, Украіны і ЗША.

Задума скліканьня такое буйнамаштабнае канфэрэнцыі высьпела падчас шпацыру прэзыдэнта Польшчы Квасьнеўскага з прэзыдэнтам Літвы Бразаўскасам на вайсковым караблі па Балтыйскім моры мінулай восеньню. Паводле першапачатковае задумы, у канфэрэнцыі мусілі б удзельнічаць заходнія суседзі Беларусі — Літва, Латвія, Польшча і Ўкраіна. Унесла свае карэктывы і катастрафічная паводка ў Польшчы — арганізацыю канфэрэнцыі на сябе ўзяла Літва. Фундатары сустрэчы — прэзыдэнтуры Літвы і Польшчы. Таксама да арганізацыі спрычыніліся Фонд падтрымкі літоўска-польскіх дачыненьняў імя Міцкевіча, Інстытут міжнародных адносінаў пры Віленскім універсытэце і Заходне-Ўсходні Інстытут (Нью-Ёрк).

Зьмяніўся і камэртон плянаванае сустрэчы. Ад пачатку яна ўяўлялася арганізатарам як працяг ініцыятываў па ўтварэньні Балтыйска-Чарнаморскае супольнасьці. Першыя практычныя крокі да рэалізацыі БЧС былі зробленыя ў свой час у Менску, на сустрэчы парлямэнцкіх групаў 23-24 лістапада 1990 году. У тую трывожную восень дэпутаты Вярхоўных Саветаў Беларусі, Літвы, Украіны і Латвіі прадказалі распад СССР і прапанавалі шэраг рэцэптаў для цывілізаванага разьвязаньня праблемаў, якія неўзабаве паўсталі перад народамі гэтых краінаў. На жаль, унікальны шанец для стварэньня новае інтэграванае прасторы быў неўзабаве страчаны, але сам дух Балтыйска-Чарнаморскага задзіночаньня аказаўся жыцьцяздольнай. Ідэі ўзаемапавагі, дэмакратыі, мірнага суіснаваньня, адкрытага рынку і свабоднага перамяшчэньня людзей, палітычнае і культурнае ўзаемападтрымкі за апошнія гады толькі набрынялі рэальным рэчаісным зьместам. Аднак, сустрэча лідэраў у Вільні сёньня мае іншы кантэкст...

Працяг на старонцы 2.

Цягнік праз пустэльню

Таццяна Сьнітко і Андрэй Дынько прадстаўляюць асобу і вершы Андрэя Шаптыцкага — украінца, які разам зь землякамі быў арыштаваны ў Менску пасьля Чарнобыльскага Шляху — 96 і толькі гэтым летам быў выпушчаны з Магілёўскае турмы.

На старонках 17 і 18.

ГІСТОРЫЯ

Сімяон Полацкі — беларускі дзяяч?

Пра тое, што Сімяон Полацкі выдатны дзяяч беларускае культуры чуў амаль кожны, нават той, хто мае самыя цьмяныя ўяўленьні пра нашу гісторыю. Сімяон Полацкі — постаць хрэстаматыйная. Ён так утульна разьмясьціўся сярод нашых славутых землякоў, што адпаведнасьць гэтага месца ўспрымаецца як аксыёма. Але...

Артыкул Андрэя Шпунта "600 рублёў золатам і 700 срэбрам" на старонцы 4.

ЛІТАРАТУРА

Дзесяць прычынаў, каб ня быць бацькам

У Празе выйшаў з друку раман чэскага пісьменьніка-дысыдэнта Мілана Кундэры "Вальс на разьвітаньне", які ўпершыню пабачыў сьвет у 1976 годзе ў французскім перакладзе.

Тэма разьвітаньня з радзімай, з рэжымам, з ілюзіямі схаваная за зьнешне банальны сюжэт. Мэдсястра тутэйшага санаторыя Ружэна зацяжарала і робіць усё магчымае, каб бацькам яе дзіцяці стаў славуты музыкант, які раз ці два быў тут з канцэртам.

Гэтая нагода сабрала трох мужчынаў, якія маюць розныя погляды на праблему бацькоўства.

Урывак з раману – на старонках 22-23.

Воўк сабакі не баіцца, але зьвягі ня любіць

Учора я іх бачыў каля менскай філярмоніі. Блізу дзесяцёх чалавек у чорным, з шэўронамі на рукавах. Ніякай міліцыі побач. Ніхто нікога не разганяе. З дэкрэтам №5 усё нармальна.

... Стаялі, дэманстравалі сваю друкаваную прадукцыю: "Русский порядок". Расейскія фашысты, члены "Русского национального единства" на нашай беларускай зямлі.

Гэтую "карцінку" я пабачыў гадзіне а сёмай вечара, едучы ў тралейбусе №2 з новай хлебніцай падпахі.

Сымбалічна, але якраз учора ў Рэдакцыю "НН" прыходзіў пракурор. Не, не з падзякаю за публікацыі антыфашысцкага, патрыятычнага ці гістарычнага зьместу, не за тое, што людзі робяць адзіную цалкам беларускамоўную газэту на недзяржаўныя сродкі, але ў дзяржаўных жа інтарэсах. Наадварот. Пракурор прыходзіў "указать" нам, што мы, бачыце, дужа расслабіліся, выявіўшы съмеласьць адлюстроўваць на старонках нашага выданьня ўласна беларускі погляд на гісторыю і сучаснасьць. Беларускі, паўтараю, погляд, а ня той, які навязвалі нам пілсудчыкі, бальшавікі, немцы, потым ізноў камісарыкі-гэбісты, а цяпер спрабуюць навязаць сучасныя акупанты ды іхныя марыянэткі.

Сымбалічна і тое, што акурат гэтымі днямі паліцыя Бэрліна арыштавала каля трохсот сваіх суайчыньнікаў, якія спрабавалі адзначыць дзясятую гадавіну зь дня съмерці ў бэрлінскай турме Шпандаў Рудольфа Геса, намесьніка Гітлера па NSDAP. Але гэта ў Нямеччыне, народ якой належным чынам засвоіў урокі гісторыі і не жадае наступаць на граблі другі раз. У нас жа выпадак клінічны: трывіяльная марыянэтка ўявіла сябе гаспадарыняй усяе Беларусі, "енералам", так бы мовіць, і спадзяецца з дапамогай дэкрэтаў выбрукаваць шлях да грамадзянскага канфлікту. Думаю, спадзяваньні марныя. Можна згуляць на падмене тэрмінаў, але нельга ігнараваць сутнасьць сёньняшняй сытуацыі, якая вызначаецца наступным лексычным радам: беларусы — (і) акупанты; легітымная ўлада (беларуская паводле зьместу) — нелегітымная (марыянэткі ў форме "палатаў", "вэртыкалі"); армія (на ўзроўні салдатаў і малодшых афіцэраў верная народу) — КГБ, МУС, іншыя сілавыя спэцпадразьдзяленьні (рэальна дзейны інструмэнт акупацыйнага рэжыму); законы і Канстытуцыя-94 — дэкрэты і ўказы акупантаў...

Пра чалавека, дастаткова ўпэўненага ў сабе, які, аднак, не сьпяшаецца лезьці ў бойку, ня вытрымаўшы паўзу, у народзе кажуць, што "воўк сабакі не баіцца..." Так і мы з вамі, беларусы, — нацыяналісты і ня вельмі, "шчукінцы", "шушкевічаўцы" і іншыя шматпартыйцы, але адной маці-Беларусі дзеці, — мы да апошняга засьцерагаем нашую зямлю ад зьвягі. А калі да нас ізноў заявіцца пракурор, але ўжо пад аховаю тых, з-пад філярмоніі чорнарубашачнікаў — гэта будзе нам апошні Знак.

Барані мяне, Божа, ад злога, але ня ўводзь у спакушэньне здрадай Радзіме! Як і маці маёй, і бацьку, і каханай жанчыне, і брату майму, і сябру, і ўсім, якія са мною.

Славамір Адамовіч

Супраць маргіналіі

Апошнія сто гадоў у беларускім бачаньні нацыянальнае пэрспэктывы дамінаваў плятонаўскі пачатак. "Філёзаф ідэяў" — Плятон, стварыў канцэпцыю ідэальнае дзяржавы, у якой кіруюць "філёзафы", дзе ахоўваюць грамадзкі лад "вайскоўцы", а асноўнае насельніцтва складаюць "рамесьнікі". "Справядлівасьць", паводле Плятона, ня мае нічога агульнага з "роўнасьцю", яна — "гармонія".

Беларуская думка практычна цалкам скіроўвалася на пабудову гарманічнае дзяржавы. Гэтай мэце служылі й пошукі сацыяльнага міру ў Дуніна-Марцінкевіча (чаго вартая адна назва "Ідылія"!) ды Францішка Багушэвіча, якога часта падазраюць у "пра-сялянскасьці". А беларускія дзеячы пачатку XX ст. былі проста захопленыя пошукам дзяржаўніцкіх канцэпцыяў — ад аўтанамізму ў складзе Расеі ды адраджэньня ВКЛ — да незалежнасьці Беларусі. І вось менавіта дзяржава, паводле ўсіх гэтых раскладак, мусіла была праводзіць унутраную культурную экспансію, трансфармуючы этнічнае ў нацыянальнае.

Падобная схема была зусім лягічнай для Беларусі пачатку стагодзьдзя, таму што ўпісвалася ў агульны геакультурны сцэнар разьвіцьця падзеяў сярэднеэўрапейскага рэгіёну — нацыянальная й сацыяльная эмансыпацыя, нацыянал-рамантызм, мадэрны праект "уласнае" дзяржавы. Тое, што паступова акрэсьлілася ў канцэпцыю Адраджэньня.

Урэшце беларускія практыкі сталі згодныя на дапамогу нават чужой дзяржавы — з захапленьнем успрынялі палітыку "карэнізацыі" й "беларусізацыі" камуністаў, уважліва прыслухоўваліся да словаў сымпатыі Вільгельма Кубэ, спадзяюцца скарыстацца з магчымасьцяў, якія ствараюцца ўжо пры нэакаляніяльным рэжыме, што нясе на сабе прыкметы ня толькі нацыянальна-культурнай аўтаноміі часоў БССР, але й аўтаноміі палітычнай.

Але найбольшым шокам для ўсяе канцэпцыі Адраджэньня сталася тое, што народжаная дзяржава аказалася такім звыродлівым стварэньнем. Гэта ўжо раздрабленьне самой ідэі дзяржавы ў галовах адраджэнцаў. І вось недзе тут, у разгубленасьці й незадаволенасьці хаваецца прадчуваньне таго, што беларускае грамадзтва нясе ў сабе задаткі будучых пэрспэктыўных соцыякультурных мадэляў.

З гісторыі мы можам узяць няшмат урокаў. Варта, прынамсі, зьвярнуць увагу на адну ўласьцівасьць — грамадзтва Беларусі заўжды было полімоўным, полікультурным, поліканфэсійным. За гэтым стаіць досьвед геапалітычнага, геакультурнага разьмяшчэньня, досьвед культурных уплываў. А ў XX ст. беларусы не пасьпелі скончыць фармаваньне дзяржавы паводле этнічных установак. І гэтая полімоўнасьць надалей ужо застанецца непазьбежнаю ўласьцівасьцю нашай краіны. Але тое, што выглядае на "паразу" для Адраджэньня, можа стаць вартасьцю ва ўмовах постмадэрну — калі губляюцца й распадаюцца стрыжні, дактрыны й канцэпцыі. (У дужках мушу заўважыць, што, разважаючы пра глябальныя тэндэнцыі, я ня маю на ўвазе монакультурнасьць ды аднамоўнасьць сёньняшняга палітычнага рэжыму ў Беларусі, які якраз праз свой мэханіцызм, ізаляцыянізм і дзяржаўніцкія ілюзіі спрабуе вырвацца з гэтых тэндэнцыяў ды супярэчыць ім.)

Праз сваю "слабасьць" беларускае грамадзтва стварае свой новы патэнцыял. Ужо цяпер беларуская полікультурная сацыяльная мадэль дае нейкі шанец на захаваньне культурнай ідэнтычнасьці палешукам, пра што ня можа весьціся ў Польшчы, а тым больш ва Ўкраіне. Новыя магчымасьці адкрывае й тое, што беларусам, ня толькі палітычным, можа ўсьвядоміць сябе чалавек не абавязкова беларускамоўны.

Тут заканамерным будзе пытаньне пра статус і функцыю беларускае мовы ды беларушчыны. Гэтая функцыя — інтэгральная, бо беларуская мова фармуе ўсю культурную сытуацыю і ў выніку стварае перадумовы разнастайнасьці Беларусі. Таму беларускамоўных людзей у сучасным горадзе нельга назваць меншыняю. Беларушчына не маргіналія, а фарматворчая й кантэкстуальная зьява. У даўняй дыскусіі Плятона з Арыстоцелем канцэпцыя ідэальнай дзяржавы паступова губляе актуалію, а тэза Арыстоцеля пра тое, што чалавек у сваёй сутнасьці ёсьць часткаю ўпарадкаванага грамадзтва, скідваючы марксысцкія ланцугі, нечакана робіцца прыкметаю постмадэрнісцкай эпохі.

Можна меркаваць, што пасьля падзеньня дыктатуры беларускае грамадзтва, падрыхтаванае цывілізацыйнаю адкрытасьцю беларушчыны ды сваёю спрадвечнай разнастайнасьцю, акажацца адным з самых адаптаваных да дынамікі й патрабаваньняў XXI стагодзьдзя.

Але сёньня непакоіць адно пытаньне, якое можна назваць галоўнаю этычнаю праблемаю Беларусі — гэта пэрспэктывы беларускае мовы.

Алег Дзярновіч

Віленскія сустрэчы

Працяг на старонкі 1.

Узурпацыя Лукашэнкам улады ў Беларусі, яго антызаходняя рыторыка і захады супраць NATO, мэтанакіраванае зьнішчэньне беларускае дзяржаўнасьці і нацыянальнае культуры, пошук хаўрусьнікаў сярод самых радыкальных савецкіх артадоксаў у Маскве, не на жарт пужаюць суседзяў, разбураюць спадзевы на стварэньне Цэнтральна-Эўрапейскай лучнасьці.

З другога боку, на працягу апошняга году праясьнілася пэрспэктыва пашырэньня NATO за кошт некаторых краінаў рэгіёну, што, у сваю чаргу, дэсынхранізуе працэсы агульнаэўрапейскае інтэграцыі і ўскладняе, на сёньня, сытуацыю... Пакуль суседзі не разышліся па чужых палітычна-вайсковых блёках, на разьвітаньне можна яшчэ пасядзець за сталом. Гэткім чынам склад удзельнікаў быў пашыраны за кошт прэзыдэнтаў Фінляндыі, Эстоніі, Румыніі, Баўгарыі, Славакіі ды інш. За прывітальнай прамоваю прэзыдэнта Літвы перад удзельнікамі форуму з дакладам выступіць Лукашэнка. За ім — прэзыдэнт Эстоніі Ленарт Мэры.

Паводле афіцыйнага тлумачэньня — лідэры краінаў мусяць выступаць па чарзе, адпаведна абэцэдзе. Але пазыцыя Лукашэнкі наперад вядомая і Бразаўскасу, і іншым прэзыдэнтам. Прэзыдэнт Літвы спадзяецца, што лідэры дзяржаваў адкрыта выкажуць свае меркаваньні Лукашэнку адносна ягонае дыктатуры і зьнешнепалітычнага валюнтарызму. Праўда, Бразаўскас тактоўна заўважыў, што "жорсткія меры" не прыдатныя для вырашэньня далікатных пытаньняў. Чаму Лукашэнку даецца слова для фактычна першага дакладу? З мэтаю крытыкаваць яго на працягу ўсёй сустрэчы? Выслухаць скрайні погляд антызаходніх сілаў, якія ўвасабляе сабою менскі рэжым? Ці... літоўскім "вярхам" вядома нешта большае? А можа папросту дзеля ўмацаваньня памкненьняў схавацца пад мілітарнае крыло NATO ўсіх нашых суседзяў па рэгіёне?

Хутчэй за ўсё сустрэча, дзе будуць прадстаўнікі краінаў, якія разам налічваюць звыш 300 млн. насельніцтва, ня будзе мець нейкіх урэчаўлёных практычных вынікаў. Апроч маральнае сатысфакцыі за тое, што з Лукашэнкам усё ж імкнуліся гаварыць па-добрасуседзку, за тое, што Вільня становіцца цэнтральнаэўрапейскім Брусэлем і ціхае летуценнае радасьці, што нэўзабаве ў Літве раскватаруюцца заходнія вайскоўцы, Літоўская рэспубліка нічога не атрымае. А Лукашэнка... наўрад ці зробіць якія канструктыўныя высновы з довадаў аж дванаццаці лідэраў дзяржаваў. Хутчэй наадварот, застанецца пры сваім невынішчальным пераканаьні ва ўласнай рацыі, ды ў дадатак атрымае салідныя дывідэнды для дэмагогіі на расейска-беларускай палітычнай арэне. Чарговы раз мы зможам пераканацца, што голас маралі мала што значыць у такой сфэры, як геапалітыка і эгаістычны прагматызм нашых суседзяў.

Наступствы гульні з Лукашэнкам сёньня ня ў стане прааналізаваць ні Бразаўскас, ні іншыя эўрапейцы, таму шоў зь ягонай прэзэнтацыяй можа мець для Літвы толькі адзін пазытыўны вынік — спачуваньне з боку Эўропы і спрыяньне ва ўмацаваньні межаў Беларусі з суседзямі.

Сяргей Харэўскі

BELINFO — для тых,

Ці ведаеце вы, "почему Республика Беларусь благоприятна для инвестиций"? Не ламайце галаву — такой робяць яе "политическая стабильность, общественное согласие, миролюбие и трудолюбие белорусского народа", а таксама "новые возможности в ряде секторов: коммуникациях, энергетике, сельском хозяйстве и услугах". А самае галоўнае — "экономическая политика и меры Правительства Республики Беларусь, направленные на стабилизацию экономики, либерализацию цен и торговли, приватизацию и улучшение законодательства". Гэтыя захапляльныя зьвесткі я здабыў з кампакт-дыска пад тытулам "BelInfo Belarus".

Яшчэ там можна даведацца, што "законодательным органом власти Республики Беларусь является Парламент, состоящий из двух Палат — Палаты представителей и Совета Республики", а прэзыдэнт "является главой государства, гарантом Конституции, прав и свобод человека и гражданина". Аўтары гэтага мясцовай вытворчасьці прадукту назвалі яго "система комплексной поддержки бизнеса", дэкляруючы рашэньне праблемы "достоверной информацией о реальных условиях бизнеса, существующих в СНГ" і з абяцаньнем "за пару секунд предоставить вам горячие данные с максимумом подробностей о любой из стран СНГ". Наконт "любых краінаў" ня ведаю, а інфармацыя аб радзімай Беларусі мяне вельмі зацікавіла.

Апроч ужо цытаванага эксклюзіву я знайшоў яшчэ нямала карыснага. Напрык-

БЕЛЫЯ ЛЮДЗІ

— Ну і колькі табе гадоў?

У адказ ён растаропіў пальцы.

— Пяць? Ну дык ты зусім ужо вялікі! Хутка мабыць у школу?

Ён паглядзеў насцярожліва й крыху зьдзіўлена, як паглядаюць на інпаземца.

— Ну, ты хочаш у школу?

— Неа. Там всякіе урокі задают.

— А ты, вядома, і так усё ведаеш. Ану праверым. Вось дзе ты жывеш?

— Тут, на Савецкай.

— Маладзец! А горад як называецца?

— Гомель.

— А краіна?

Пацан лыпаў вачыма, не разумеючы.

— Ты ведаеш, што такое краіна?

— Неа.

— Гэта значыць "страна" па-беларуску. Ты в какой стране жывеш?

— В Гомеле.

— Гомель — гэта горад, — я пачынаў трохі заводзіцца. — А ў якой стране ён знаходзіцца?

Ён яўна не разумеў, чаго я ад яго хачу. Але мне захацелася пачуць ад яго слушны адказ без падказкі. Здаецца, я ў свае пяць гадоў ведаў, што "мой адрес — Советский Союз". Я вырашыў пайсьці іншым шляхам, ад больш, як мне падалося, вядомага для яго кругагляду.

— Ты ж, напэўна, ведаеш, дзе ў нас знаходзіцца Расея?

— Не знаю.

Гэта мяне надзвычай зьдзівіла. Хоць хтосьці ў гэтай краіне ня ведае, дзе знаходзіцца Расея. Праўда, дзе знаходзіцца Беларусь майму суразмоўцу таксама вядома не было. Але размова ад гэтага ня страціла для мяне цікавасьці. У свае пяць ці шэсьць гадоў ён ведаў дастакова іншых словаў, і ведаў, што яны абазначаюць. Напрыклад, мама — гэта добра, таму што яна дае есьці, апранае і таму што яна мама. А папа гэта ня вельмі добра. Таму што ён прыходзіць раз на тыдзень, каб залезьці ў лядоўню і чагосьці зьнесьці з таго, што прыносіць з крамы мама. А яшчэ папа ніколі не прасыхае ад гарэлкі. Цікава было б даведацца, што гэта такое — гарэлка. А ў сябра Колькі ёсьць брат. І ён, гэты брат, бандыт. Ён езьдзіць на прыгожай машыне і добра апранаецца. І таму — што можа выглядаць больш прывабным для пяцігадовага чалавека, чым мара стаць бандытам? Я як мага больш прыгожа закурыў, і наша размова прыняла больш мужчынскі характар. Мы гаварылі пра машыны, зброю і дзевачак. Я стараўся спадабацца гэтаму невядомаму мне хлопчыку зь "неблагополучной" сям'і з вуліцы Савецкай. Не таму, што ён уразіў сваёй дасьведчанасьцю ў геаграфіі. Мне чамусьці было важна, пакуль ён не спазнаў, дзе знаходзіцца Расея, закадаваць гэтага падшыванца ад мясцовага вірусу непрыйманьня ўсяго свайго.

Калісьці, калі я быў не на шмат старэйшы за майго суразмоўцу, я трапіў сюды й, чамусьці, да гэтай пары не магу адысьці ад таго дзіцячага ўражаньня: "Тут сканчаецца Расея". Майго невялікага досьведу цалкам тады хапіла, каб адчуць розьніцу. Гэта ня значыла тады (ды й зараз), што там жахліва, а тут расцудоўна. Але мяне заўжды заводзіла тое, што мае тутэйшыя сябры зусім гэтай розьніцы не адчувалі, ці не хацелі заўважаць. Зараз, калі Расея тут сканчаецца ўсё больш заўважна, я, можа, зь ня вельмі прыстойным злорадствам сустракаю сьведчаньні маёй даўнейшае рацыі.

Малады гомельскі бізнэсмэн даўно чакаў чаго-небудзь сапраўднага. Перакід шмотак з Польшчы ды Ўкраіны на Расею пачынаў ужо патроху абрыдаць. Чым жа я горш за іншых? — думалася маладому бізнэсмэну. — Павінен жа калісьці прабіць і мой зорны час. Ня век жа займацца гэтымі шмоткамі. Свая справа — гэта свая маёмасьць. Заводы з параходамі й адпачынак на Гаваях. І зорны час прабіў. Ягоны польскі партнэр па шмотках знайшоў нямецкага паляка, які жадаў наладзіць "на ўсходзе" вытворчасьць нейкіх кансэрваў. Невялічкі заводзік сам ішоў у рукі. Малады гомельскі бізнэсмэн зразумеў усё слушна й свой шанец марнаваць не зьбіраўся. Месяц упартай працы зь беганінаю па інстанцыях, зь нятаннымі тэлефоннымі перамовамі, з пошукам месца пад, нарэшце, сапраўдную працу, прывялі да галоўнага — візыту польскіх таварышаў на гасьцінную гомельскую зямлю, дзе ім проста ня можа не спадабацца. Усё было пралічана маладым бізнэсмэнам. Акрамя адной дробязі. Малады бізнэсмэн ніколі не задумваўся: дзе пачынаецца Расея?.. Польскія таварышы пад'ехалі на беларускую мяжу, дзе безь ніякіх лішніх пытаньняў вырашылі ўсе гэтыя "дэкляратыўныя" пытаньні зь беларускімі мытнікамі. І зьбіраліся ўжо ехаць далей. Але літаральна праз мэтар іх спынілі мытнікі расейскія. І палякі наадрэз адмовіліся што-небудзь зь імі абмяркоўваць, матывуючы гэта тым, што яны прыехалі зусім не ў Расею. На што расейцы ўсьміхнуліся й прапанавалі ім прайсьціся... Іх пратрымалі на мяжы каля шасьці гадзінаў. Але яны трымаліся цьвёрда. Той, што меў нямецкі пашпарт, пагражаў нават міжнародным скандалам. Яны перамаглі расейцаў. Проста прыехаў нейкі галоўны расеец, загадаў вярнуць іх дакумэнты і нават папрасіў прабачэньня. Злыя і нясьвежыя яны прыехалі ў начны Гомель, каб раніцай жа ўзяць кірунак на Ўкраіну. Украіна пачынасцца праз сорак кілямэтраў, і там таксама ёсьць маладыя бізнэсмэны...

"А чаму я, цалкам нетутэйшы чалавек, павінен ім усім даказваць тое, што яны, карэнныя жыхары свайго краю, цудоўна ведаюць і безь мяне?" — часта задаваўся я гэтым пытаньнем. Кожнага разу з жахам уяўляючы сябе любімага нечым падобным да іх. Але, зрэшты, да каго гэта да іх? Колькі было ўжо спробаў адгарадзіцца ад іх даўно ўжо ня іхнаю моваю, і чым гэта ўсё сканчалася? Няцьвёрдым вымаўленьнем, як у тэатры пры кепскім веданьні сваёй ролі й чаканьні падказкі з боку партнэраў. Чаму я, пэўна, і "ташчыўся" ад размовы з гэтым падшыванцам. Ён мяне слухаў так уважліва! Можа я быў не зусім яму зразумелы, але ж я быў "вялікі"! І таму ўжо цікавы. Сустракаючыся на вуліцы зь "белымі" людзьмі, у балышыні сваёй разгубленымі перад сытуацыяй "дзе нам няма месца", дзе "нас не зразумеюць", дзе "нас так мала", я ў лепшым выпадку пастараюся іх не заўважыць, у горшым — перайду на іхны, амаль што, інтымны паўшэпт. Каб не парушыць іхнай моўнай канспірацыі, каб ня быць у вачах "акружаюшчых" падобным да іх. "Няшчасных дзівакоў, памяшаных на гэтай мове".

Пара ўжо станавіцца заўважнымі, стыльнымі, і па складах даводзіць сваю прысутнасьць. Як гэта зрабілі пара белых людзей у савецкай харчавальнай установе. Двое нашых сядзелі нападпітку ў рэстарацыі. Тоўстая бармэншa, як звычайна, з хамцой і без агню "адпускала товар". "А давай, — кажа адзін, — прасунем крыху гэтую пані". "А чаму б і не?" — пагадзіўся другі. Першы адразу ж пайшоў да стойкі і папрасіў падаць яму чыстую філіжанку. "Чаго?" — перапытала тоўстая бармэншa. Тады хлопец акуратненька ўзяў са стойкі патрэбны яму прадмет і, павярнуўшы яго перад ейнымі вачыма, падкрэсьлена ветліва прамовіў: "Запомніце, калі ласка, вось гэта называецца "фі-лі-жан-ка", і пайшоў да свайго століка. Праз пару хвілінаў падыйшоў другі і таксама скрайне шляхетна папрасіў чыстага відэльца. "Чаго, чаго? — залыпала сваймі вочкамі тоўстая бармэншa. "Вось гэта, ён гаварыў як мага больш выразна, — называецца "ві-дэ-лец". І пайшоў з тым відэльцам ад стойкі, са смакам адчуваючы на сьпіне вагнямётны погляд тоўстай бармэншы. Далей у сяброў паўстала новая праблема. Тоўстую бармэншу трэба было "дабіць" нечым незвычайным. Лыжкі, нажы і талеркі не падыходзілі. Трэба было нешта экстравагантнае. І тады быў знойдзены проста геніяльны выхад. Праз пару хвілінаў зноў падыйшоў першы і тым самым ласкавым тонам папрасіў сьцізорыка. "Ды што ж гэта такое?!" — уськіпела ўсімі целясамі тоўстая бармэншa. На што той узяў дзьвума пальчыкамі звычайны кухонны нож і міла ўсьміхаючыся ў тупы, злобны твар, бліскуча адгаварыў сваю рэпліку. "Вось гэта, добра запамятайце, — ён зьдзекліва падміргнуў, — калі ласка, называецца "сьці-зо-рык". І павярнуўшы "сьцізорык" перад белымі ад злосьці вачыма, пайшоў п'янствaваць далей. Тоўстая бармэншa доўга не зьўлялася на сваім пасту, і, я ўпэўнены, пры наступнай сустрэчы зь белымі людзьмі яна будзе старацца выглядаць больш прыстойна.

Патрэбны такі стыль, каб белых людзей пазнавалі адразу. Каб не пасьпявалі мы адкрыць рот, а яны ўжо ведалі якою моваю зь імі будуць моўіць. А зь першымі нашымі словамі пасьпявалі закрыць свае раты. Маючы пэрспэктыву атрымаць "дапамогу", якую практыкуе адзін мой знаёмы — дае поўху. Асабіста я ня стану гаварыць на "бел", знаходзячыся ў "нябелым" настроі, ці нават маючы нейкую хібу ў адзеньні. Каб нішто не дапамагло асацыяваць маю мову зь якім-кольвек убоствам. Каб мяне не закранула доля адной беларускай пані, што вымушаная сёньня працаваць пакаёўкай у "новых русских", і якой дачка-школьніца ўсё часьцей задае пытаньне: "Што? Даразмаўлялася?" А тых, з кім можна пагаварыць на поўны голас, дарэчы, становіцца ўсё болей. Нават дзівіься — адкуль бяруцца. Хаця, чаму дзівіцца? Уся справа, зноў жа, у стылі.

Ня так даўно ў Гомелі адбыліся дзьве падзеі, стаць удзельнікам якіх мне не давялося. Не было мяне тады ў Гомелі. Але па прыездзе мне распавялі ва ўсіх фарбах. Таварыства Беларускай Мовы плянавала наладзіць імпрэзу ў гонар Грунвальдзкай перамогі 15 ліпеня ў Румянцаўскім парку. А мясцовы БНФ зьбіраўся даць футбольны бой мясцоваму АГП у гонар Дня Незалежнасьці. Мясцовы ТБМ дазвол атрымаў. Правесьці імпрэзу 27 ліпеня ў нядзелю, толькі ня ў парку, а ля (нібы адмыслова) Палаца культуры глуханямых, у ціхім бязьлюдным закутку. Як кажуць, ад вачэй далей. Адбылося тое, што і адбылося. Трэба спадзявацца, тэрмінова выкліканым на акцыю амонаўцам сьпевы пад дуду спадабаліся, ня кажучы ўжо пра глуханямых. Значна больш цікавыя падзеі адбываліся на футбольным полі адной з гарадзкіх школаў. Мясцовы БНФ лічыў сваю перамогу пытаньнем закрытым. А як інакш, калі галоўны гомельскі бээнэфавец узначальвае катэдру фізычнай культуры мясцовага ўнівэрсытэту. У прызначаны час над брамамі супернікаў узьвіліся сьцягі: над брамай БНФ нацыянальны, над супрацьлеглаю —"чырвоны конь". Усё было ўсур'ёз — поўная брыгада судзьдзяў, "Пагоня" на магутных грудзёх футбалістаў фронту (большасьць якіх складалі баксёры-цяжкавікі ды штангісты), і галоўнае — была інтрыга. Не было толькі на момант стартавага сьвістка публікі. Але першы гол, забіты лібэраламі, прыцягнуў увагу нейкай кампаніі моладзі, што ціха піла піва непадалёк. Да другога гола зьбеглася ўся навакольная пацанва. Трэці гол у фронтаўскую браму ўжо глядзелі ўсе зацікаўленыя мінакі — падпітыя былыя васпныя маракі, што адзначалі сваё сьвята, дзяды, што пакідалі даміно, міліцыянты, прыбеглыя на шум. А шумець было з чаго. На перапынак каманды пайшлі пры ліку 8:3 на карысьць АГП, і пры аблепленым зацікаўленым людам полі. Фронтаўцы прайгралі ў той вечар 4:9, задаволіўшыся чарговай маральнаю перамогаю. Нацыянальныя сьцягі луналі над галовамі заўзятараў, якіх набралася з паўтысячы, п'яныя матросы, разьдзіраючы паласатыя грудзі, раўлі "Жыве Беларусь", міліцыянты ж сачылі за тым, каб нашае сьвята нічым не сапсавалася. А пасьля ўсе пайшлі піць за Беларусь. Ня ведаю, за каго болей "балела" публіка, але тое, што "ня нашых" на полі няма, гэта яна была павінна зразумець...

Як імклівa нас пакідае Расея! Яна ўжо скончылася тут для сваіх журналістаў. Яна яшчэ спрабуе нешта адыгрываць, маніпулюючы нафтай-газам і кандовай дэмагогіяй (быццам не разумеючы простай рэчы — ніякі паўнавартасны беларускі палітык ня будзе нават зайкацца аб нейкай інтэграцыі). Яна сыходзіць так імклівa, што мы проста не пасьпяваем займаць тую прастору, якую яна вызваляе для нас. Ці то ў палітыцы, ці то ў культуры. Для сёньняшніх нашых тынэйджэраў гэта краіна не Высоцкага і Таркоўскага, а хутчэй — краіна без кумірaў. Менавіта ад гэтае пустаты расейская мова стала ў нас моваю таннае папсы, а беларуская яшчэ ня стала моваю рок-н-ролу й высокай моды. А часу застаецца ня так і шмат. Роўна столькі, колькі будзе кіраваць першы й апошні...

— Ведаеш, чорт яго ведае, дзе знаходзіцца тая Расея. Не забівай сабе галаву ўсялякімі глупствамі. Ты мяне разумееш?..

Зьмiцер Бартосік

ХТО ХОЧА ЗГУБІЦЬ СВАЕ ГРОШЫ

лад, што "25 марта 1918 года — объявление независимости Белорусской Советской Социалистической республики (БССР)", ці што "национальными спиртными напитками являются настойка "Беловежская" и водка "Белая Русь". Зацікавілі мяне статыстычныя зьвесткі. Так, па колькасьці танкаў мая краіна пераўзыходзіць Гішпанію, Францыю і Вялікабрытанію ўзятыя разам, хоць, нажаль, крыху саступае французам па бронетранспарцёрах і, самае галоўнае, нават да Ўкраіны не дацягвае па штурмавых верталётах.

З новага дыску можна даведацца й куды пайсьці вечарам пагуляць на рулетцы, і колькі заплаціць таксоўшчыку, і яшчэ шмат чаго. Аснову яго складаюць тры часткі: "турызм", адкуль я павыцягваў зьвесткі і пра 25-га сакавіка і пра гарэлку, "статыстыка", дзе, апроч зброі, фінансаў, прамысловасьці ды іншага, ёсьць яшчэ, скажам, зьвесткі па ўзроўні жыцьця насельніцтва — чамусьці сьціпла пададзеныя толькі на 1995 год, хоць кампакт датаваны чэрвенем 1997-га. Апошняя частка — "бізнэс", запоўненая базай зьвестак, дзе можна даведацца пра заканадаўства, бізнэсцэнтры, мытныя працэдуры, крамы, а галоўнае — пра пэўную колькасьць зарэгістраваных прадпрыемстваў, дзе я, нажаль, не знайшоў згадкі пра кампанію "Science & Buisiness Software Group" (творцу самога прадукту), але выкапаў знаёмае мне таварыства з абмежаванай адказнасьцю "ЕвроФорум", у якім невядомая колькасьць службоўцаў, але вырабляе яно "книги, учебник, руководство".

Калі патэнцыйны партнэр беларускага бізнэсу ўжо праштудыяваў усю патрэбную навуку, ён можа ўпэўніцца ў сваёй кампэтэнцыі праз прыгатаваныя для яго тэсты. Той, хто правільна адкажа на пытаньні, накшталт, "колькі каштуе паездка на таксоўцы ад вакзала да любога гатэля", здагадаецца, што РБ палягае ня ў Азіі й не на Поўдні Эўропы, а таксама адгадае, што самыя цікавыя "белорусские изделия" вырабляюцца ня з косткі й дрэва і не з мармуру, а "из соломки", — цалкам гатовы для працы ў Беларусі. А калі вы зразумееце, што рэкамэндуецца ўвозіць кампутары і праграмы ці мэдыкамэнты, мець пачатковую суму ня менш за 100 тысячаў даляраў, супрацоўнічаць зь людзьмі старэйшымі за 25 год з досьведам працы ў органах кіраваньня, ды яшчэ будзеце ведаць "русский язык" — посьпех вам, як абяцае "BelInfo Belarus", абсалютна забясьпечаны.

Безумоўна, ідэя актуальнага нацыянальнага бізнэс-даведніка ў кампутарным фармаце заслугоўвае ўсялякае пашаны. З боку тэхналёгіі гэты прадукт таксама не выклікае прэтэнзіяў — зручны інтэрфэйс, лёгкае карыстаньне. Але, зразумела, чаму, як мне стала вядома, адміністрацыя прэзыдэнта адразу закупіла 500 штук "БелІнфы" — ідэя гэтага інфармацыйна "кульгавага" прадукту сьвеціцца праз усе шчыліны: дарагія вы нашы дурненькія замежныя інвэстары, ляціце сюды, "матылькі", нясіце свае прыгожыя зялёненькія грошыкі — на амон не хапае!

Вацлаў Арэшка

600 РУБЛЁЎ ЗОЛАТАМ І 700 СРЭБРАМ

Сімяон Полацкі — выдатны дзяяч беларускай культуры?

Пра тое, што Сімяон Полацкі выдатны дзяяч беларускае культуры чуў амаль кожны, нават той, хто мае самыя цьмяныя ўяўленьні пра нашу гісторыю. Сімяон Полацкі — постаць хрэстаматыйная. Ён абавязковая фігура ў шэрагу выдатных беларусаў нароўні з Францішкам Скарынам, Левам Сапегам, Кастусём Каліноўскім ды іншымі. Ён так утульна разьмясьціўся сярод нашых славутых землякоў, што адпаведнасьць гэтага месца ўспрымаецца як аксыёма. Але...

Жыцьцё гэтага чалавека прыпадае на "крывавы патоп" — пэрыяд вайны 1654-1667 г. Калі глядзець на Сімяона Полацкага ў кантэксьце тых падзеяў, а ня так як вучыла савецкая школа, атрымліваецца, што ў лепшым выпадку ён быў проста культуртрэгерам, які працаваў на ніве маскоўскае культуры.

Нарадзіўся ў 1630 г. у Полацаку. Сьвецкае імя — Самуіл Емяльянавіч (паводле іншых зьвестак — Гаўрылавіч) Пятроўскі-Сітніянавіч. Ва ўзросьце сямі гадоў бацькі адправілі яго вучыцца ў Кіева-Магілянскую акадэмію — буйную, полінацыянальную паводле свайго складу навучальную ўстанову. Вывучыў мовы стараслявянскую і лаціну. У 1651 ці 1652 г. пасьпяхова заканчвае акадэмію і вяртаецца ў Полацак, тым больш, што на Ўкраіне заставацца было небясьпечна, — ужо тры гады там палыхае грамадзянская вайна. Казацтва выступіла супраць ляхаў і езуітаў ды прыгнёту габрайскіх арандатараў, учыніўшы сапраўдны галакост, і спачатку толькі патрабавала зраўнаньня ў правах, каб быць як Карона ці Вялікае Княства. Але Варшава і слухаць аб гэтым не жадае. Вайна зь пераменным посьпехам цягнулася шэсьць гадоў, пасьля чаго Багдан Хмяльніцкі, ці папросту "Хмель", каб схіліць шалі вагаў на свой бок, паставіў на сьмяротнага ворага Рэчы Паспалітай — Маскоўшчыну.

Самуіл тым часам працягвае адукацыю і ў 1651 г. паступае ў Віленскую езуіцкую калегію — адну з самых вядомых установаў у Эўропе. Езуіты давалі бліскучую адукацыю і давалі яе бясплатна. Доступ у езуіцкія навучальныя ўстановы быў адкрыты для прадстаўнікоў усіх канфэсіяў. Гэтыя перавагі Самуіл улічваў, і яны адыгралі не апошнюю ролю ў выбары ім месца вучобы. Ранейшыя некаторыя расейскія, савецкія даследчыкі (Д.Жукаў, Л.Пушкарёў. Русские писатели XVII в. Масква, 1972) меркавалі, што ў Вільню ён паехаў для таго, каб вывучыць прынцыпы і мэтады каталіцкае прапаганды, для больш пасьпяховае барацьбы зь ёю ў будучыні. Сумнеўна, каб у яго маглі ўзьнікнуць такія далёкія намеры, тым больш што Самуіл быў уніятам.

І зноў не да вучобы. І кастрычніка 1653 г. Земскі Сабор у Маскве аб'яўляе вайну Рэчы Паспалітай. Вораг абрынуў на нашыя ўсходнія рубяжы аграмадную 100-тысячную армію, якой Вялікае Княства Літоўскае магло супрацьпаставіць тады толькі 10-12 тысячаў абаронцаў. У кароткі тэрмін былі захопленыя больш за 200 гарадоў, мястэчак, замкаў. Палі Смаленск, Віцебск, Магілёў, Ворша, Барысаў, Менск, Полацак. Раніцай 29 ліпеня 1655 г. баярын князь Якаў Кудзянетавіч Чаркаскі разам з казацкімі аддзеламі Залатарэнкі, прысланымі Хмяльніцкім, падступілі да Вільні. Стрымаць іх было немагчыма. У тых абставінах на гэта ня быў здольны нават ваенны талент Януша Радзівіла. Першымі ў горад уварваліся казакі... Як прыгадваў віленскі біскуп Тышкевіч, "не было літасьці ані ўзросту, ані полу; усе месцы былі запоўненыя крывёю забітых і трупамі..." Загінула прыкладна палова жыхароў сталіцы — 7-8 тысячаў. Горад гарэў 17 дзён. Так маскоўцы адпомсьцілі "братняму народу" за пажар свае сталіцы ў 1612 г. Самуілу пашчасьціла ўцалець, і на другі дзень акупацыі ён уцёк зь Вільні.

Што далей? Адныя ішлі простым шляхам да канца і гінулі са зброяй у руках, іншыя пераходзілі на бок ворага. Тое, што сёньня заслугоўвае асуджэньня, тады магло ўспрымацца як норма. Шчырасьць лёзунгу "Родина-мать зовёт!" тады выклікала б мабыць усьмешку. Самуіл пакуль толькі шукае месца, якое надзейна забясьпечыла б яго ад неспадзяванак лёсу, і дала магчымасьць займацца навукай. Дапамог выпадак. Былы прафэсар Самуіла ў Кіева-Магілянскае акадэміі, ігумен полацкага праваслаўнага Багаяўленскага манастыра Ігнацій Іяўлевіч прапануе прыняць законьніцтва і выкладаць "отрочатам" у брацкай школе пры манастыры. 8 чэрвеня 1656 г. Самуіл пераўтвараецца ў Сімяона (пазьней яго назавуць Полацкім).

Першы час працаваў дыдаскалам — настаўнікам у малодшых клясах. Добра ведаючы перавагі лацінскае адукацыі і выхаваньня, Сімяон палемізаваў з прыхільнікамі грэцкага напрамку, якія заклікалі адгарадзіцца "жалезнай заслонаю" ад усякага ўплыву Захаду, і ўсю ўвагу сканцэнтраваць на вывучэньні грэцкага (якога, дарэчы, Сімяон ня ведаў) і праваслаўнага багаслоўя. Заходніцтва не перашкаджае яму выступаць апалягетам агрэсіўнае маскоўскае палітыкі. Пра гэта яскрава сьведчыць першы выступ Сімяона перад царом Аляксеем Міхайлавічам, які "вызваліцеляў". І ня ўсім падабалася вернападданскія пісаньні маладога законьніка. Захавалася нататка Сімяона Полацкага аб яго злапрыгодах і ўцісках з боку полацкага япіскапа Кабіста Рытарайскага.

Багаяўленскі манастыр дабіваецца немалых ільготаў ад цара. У 1660 г. Іяўлевіча выклікаюць на Царкоўны Сабор у Маскву, ён бярэ з сабой Сімяона Полацкага, у якога ўжо падрыхтаваная для такога выпадку дэклямацыя. Нарэшце песьняру маскоўскае зброі выпала магчымасьць наведаць сталіцу "сапраўднага праваслаўя". Пасьля руйнаваньняў і ваенных нягодаў, што ён шмат гадоў назіраў на Бацькаўшчыне, Масква зрабіла моцнае ўражаньне. Да таго часу тут працавала шмат беларускіх здольнікаў. Асабліва іхны прыток павялічыўся з пачаткам вайны. Сярод усіх магчымых ваенных трафэяў палон лічыўся самай каштоўнай здабычай. Бо хто аздабляў Маскву, як не палонныя здольнікі? Хто ажыўляў культуру Маскоўшчыны новымі помнікамі мастацтва? Дзякуючы беларускай культурнай экспансіі маскоўцы пазнаёміліся са сьвецкім партрэтам, беларускай рэзьбою, кафляй і г.д. А хто працаваў на баяздольнасьць царскага войска? Яшчэ ў 1657 г. у Шклоў, Барысаў, Магілёў і Менск на загад Аляксея Міхайлавіча быў накіраваны суздалец Пётар Балотнікаў "для пищальныя покупки и для призыву ратных дел мастеров".

Дапушчаны да цара, Полацкі з вучнямі чытаў дэклямацыі, напісаныя ў пышнай барочнай манеры. Ён шырока ўводзіць традыцыйныя прыёмы народнае паэтыкі для праслаўленьня царскае сям'і, называе цара Сонцам, царыцу — Месяцам, іх дзяцей — зоркамі.

20 верасьня 1660 г. Сабор скончыўся, і Полацкі вяртаецца ў Беларусь. Становішча на франтах зьмянілася і наводзіла на непрыемныя роздумы. Пад час Патопу Маскоўшчына ўступае ў змаганьне са Швэцыяй, пакінуўшы Хмяльніцкага самнасам з Рэччу Паспалітай, "Хмель" у адказ разрывае хаўрус.... Тая частка насельніцтва акупаваных абшараў, якая на пачатку мела ілюзіі наконт Масквы, канчаткова расчаравалася ў ёй. Усе былі сытыя па горла новымі парадкамі. Партызанскі рух супраць захопнікаў узмацняўся. Калі казакі і іншыя вернікі ўсходняга ці грэцкага абраду сустракалі маскоўскае войска, яны думалі знайсьці блізкі сабе праваслаўны народ. Потым стала зразумела, што гэта амаль што розныя цывілізацыі. Нават вера. Праваслаўе ў Беларусі было для маскоўцаў "латинствующим", а часам "літоўскай ерасьсю". Беларускія здольнікі, напрыклад, калі траплялі ў Маскоўшчыну, лічыліся носьбітамі "каталіцкае і іншае заразы", і хоць, паводле словаў Абэцэдарскага, у пераважнай большасьці яны былі праваслаўнымі, іх прымушалі выконваць абрад "Приведения к вере" і прыносіць царкоўную прысягу.

Акупанты страцілі Вільню, Горадню, Полацак. Войскі Рэчы Паспалітай кантралявалі большую частку Вялікага Княства. Для Сімяона пачаліся цяжкія часы. Нехта напісаў на яго данос. Прыйшла пара трымаць адказ за дэклямацыю. Але на яго шчасьце, улады ці то не сьпяшаліся штосьці прадпрымаць, ці проста не зьвярталі на яго ўвагі. У ліпені 1663 г. ён назаўсёды пакідае Беларусь і пераяжджае ў Маскву.

У гэты час Полацкі стварае свае галоўныя творы. Паэзія яго добра адлюстроўвае разьвіцьцё стылю барока ў Маскоўшчыне. Стыль гэты пампэзны, афіцыёзны. Сімяон пачынае зьбліжаць паэзію з навукай. Вершы абцяжараныя рознага кшталту фактычным матэрыялам, так што ў сукупнасьці маглі б служыць сапраўдным энцыкляпэдычным слоўнікам. Уся творчасьць Сімяона прасякнутая маралізатарствам. Уся паэзія яго напісаная сылябічным вершам і чыталася з вылучэньнем кожнага складу. Напрыклад:

"Царь не-кий, пре-бо-га-тый Дщерь крас-ну и-мяше, Ю-же от все-го серд-ца Сво-е-го лю-бя-ше" і г.д.

У паэтычнай творчасьці Полацкі ня быў наватарам. Кім бы ён быў на Бацькаўшчыне, дзе адукаванасьцю нікога ня здзівіш, а тым больш сылябічным вершаскладаньнем? А вось Маскоўшчына — зусім іншая справа. Тут ён чалавек Захаду — чужаземец! Бадай, адзін з галоўных культуртрэгераў. На тле маскоўскага грамадзтва Сімяон Полацкі самы вучоны чалавек. Хто мог скласьці канкурэнцыю, калі нават ерархі праваслаўнае царквы тут не заўсёды валодалі дастатковай адукацыяй? Пасевін пісаў: "Некаторыя манахі ня ведаюць, які у іх ўжываецца манастырскі статут, пачаткаў граматы". А Бэрынтэйн яшчэ ў 1579 г. сярод белага сьвятарства ня мог знайсьці ніводнага чалавека, які растлумачыў бы яму розьніцу паміж каталіцтвам і праваслаўем. А сьвятарства ў Маскоўшчыне традыцыйна лічылася самай адукаванай часткай грамадзтва.

Цікава, што ва ўласнай бібліятэцы гэтага сьвятога манаха і маскоўскага апалягета былі знойдзеныя кнігі з наступнымі надпісамі: "Гэтыя кнігі ёсьць надзейнае ёмішча ведаў Сімяона Пятроўскага-Сітніянавіча, полацкага іераманаха, Ордэна Сьв. Васілія Вялікага. Жнівень 1670". Тут ясная дэклярацыя прыналежнасьці да ўніяцкага закону. Ды хто ж вы, Сімяон Полацкі?

Да часу прыезду Полацкага ў Маскоўшчыне сфармавалася два погляды на шляхі разьвіцьця дзяржаўнасьці, адукацыі і г.д. Абедзьве плыні прадстаўлялі групы, якія можна назваць "лаціньнікамі" і "старамаскоўскай партыяй". "Лаціньнікі" выступалі за заназычаньне ў Захаду дасягненьняў адукацыі, культуры, вайсковае справы, і наогул, больш цесную сувязь з Эўропай. Гэта былі людзі інтэлігентныя і адукаваныя — кіраўнік Пасольскага прыказу Афанасі Ордзін-Нашчокін, акольнічы Фёдар Рцішчаў, шваґер цара Барыс Марозаў, баярын Артамон Мацьвееў, прыяцель і аднадумец Сімяона Полацкага кн. Васіль Галіцын, і, натуральна, сам Сімяон. "Старамаскоўская партыя" — поўная супрацьлегласьць. Яна стаяла за сівую даўніну, заклікала адгарадзіцца ад уплыву заходняе заразы, бачачы ва ўсёй эўрапейскай вучонасьці д'ябальскую блазноту. Непісьменнасьць лічылася вартасьцю, а роздумы, меркавалася, вядуць да ерасі. Прыярытэт аддаваўся толькі грэцкай мове.

Людзі з другога лягеру бачылі, якую небяспеку ўяўляе Сімяон Полацкі са сваімі поглядамі і адукацыяй. Таксама яны добра бачылі, што пад адзеньнем сьвятога законьніка хаваецца беспрынцыпны кар'ерыст. Законьнік з Чудаўскага манастыра Яфімі ў сатырычным "Слове" паказаў Сімяона Полацкага ў выглядзе пеўня, які любуецца сваім багата аздобленым хвастом. Сімяон Полацкі, спрытны парадворац, пакорліва б'е чалом і кланяецца да зямлі для таго, каб набраць каменьняў і кінуць у тваю галаву... Ён кажа, што вінаваты, а сам за дзьвярыма прыгатаваў для цябе "сем лапат". Пакорліваецца яго воўчая, а не авечая.

Сімяона Полацкага вельмі падтрымлівала блізкасьць да царскіх пакояў. Ён рабіў уплыў на Аляксея Міхайлавіча, а потым і на новага цара — Фёдара Аляксеевіча. Патрыярх Якім, прыхільнік старамаскоўцаў, супраць простага законьніка Сімяона, пры ўсёй паўнаце свае улады, зрабіць нічога ня мог. У 1678 г. Сімяон Полацкі адкрывае друкарню ў Крамлі, адзіную ў краіне друкарню, якая пазбаўленая духоўнае цэнзуры. Больш таго, як бы ў насьмешку над Якімам, на сваіх кнігах ён ставіць пячатку з паведамленьнем, што яны выйшлі ў сьвет з дазволу патрыярха. Можна зразумець гнеў і абурэньне Якіма і яго партыі.

Чаму ж Сімяон Полацкі, карыстаючыся любоўю і аўтарытэтам у самадзяржаўцаў, будучы кар'ерыстам, заставаўся на нізе ерархічнае царкоўнае лесьвіцы? Дык жа ў такім статусе была свая рацыя. Чорная вопратка Сімяона Полацкага моцна кантраставала з залатымі і жамчужнымі ўбраньнямі патрыярха і вышэйшых дзяржаўных дзеячоў. У вышэйшых сферах Сімяон быў бачны лепей за ўсіх, чаго і хацеў.

Дык якое ж значэньне Полацкага для беларускае культуры? Мабыць тыя 600 рублёў золатам і 700 срэбрам, якія ён завяшчаў манастырам — Куцеінскаму, Полацкаму, Віцебскаму, Сьвятадухаўскаму, Менскаму і Мёрскаму? Толькі не беларускім манастырам пакінуў ён тыя грошы, бо ў яго разуменьні манастыры былі на землях, якія зьяўляліся ўсяго толькі часткай Маскоўскага царства.

Андрэй Шупт

На Ўсход!

Сонечная раніца, мікрааўтобус Ford, ганак рэдакцыі. Апошні фундамэнтальны закуп — соль і запалкі.

Па дарозе — прыпынак у цэнтры Магілёва. Падстава падсілкаванцца магілёўскімі гастранамічнымі вырабамі. Пасьля таго, як мы скупілі з аднае яткі ўсе калдуны, бяляшы і сасіскі, ледзьве ня ляснулі ад прамоўленага гандляркаю: "Так эта наша речь такая, беларуская? А я думала какая паляцкая..." Беларусь, мая старонка, куток цемнаты...

Перад самай мяжою апошняя крамка, прыдарожнае сельпо. Асартымэнт уражвае ўбоствам. Нехта з нас заўважыў, што ўсё тут, як дзесяць гадоў таму. На што гандлярка з годнасьцю заўважыла, што дзесяць гадоў таму не было "Трайплу". Прагрэс!

На мяжы з Расеяй — капітальныя збудаваньні мытняў, але рэжым на іх, як на шараговых блёкпастах, што папатырканы па ўсёй Беларусі. Падыйшоў разамлелы ад сьпёкі міліцыянт з аўтаматам напераўвес, запытаў, чаго едзем у Расею, і, махнуўшы рукою, адпусьціў нас, адзінаццаць чалавек, у цяжкагружанай машыне, нават ня спраўдзіўшы дакумэнты.

Расейскія памежнікі празь сьпёку нават ня выйшлі да машыны. Тыя з нас, хто нeабачліва забыўся на пашпарты, з палёгкаю ўздыхнулі. Мы на тэрыторыі, куды не дапяў менскі рэжым, а маскоўскі яшчэ не прачнуўся — "інтэграцыйнае" дзікае поле са слабою інфраструктураю, кепскімі дарогамі і з малалюднымі паселішчамі. Дзякуй Богу, няма блёк-пастоў.

Як высьветлілася пазьней, тое, што нас не пракантралявалі — выпадковасьць. Вяртаючыся ў той жа дзень, наш кіроўца натрапіў на жорсткі памежны кантроль. Ужо парожні Ford літаральна перапатрашылі.

Дарога па Смаленшчыне: то лапікамі асфальт, то зноў грунт. Нядаўнія дажджы і разьлівы рэкаў ператварылі дарогі і маёсты ў небясьпечны для нашага Ford'а шлях. Прыпыніўшыся аднаго разу на ўзбочыне, наш аўтамабіль ледзьве не сарваўся ў адхон: асфальт, пакладзены бяз броўкі, падчас паводкі падмыла вада, і, як толькі на гэтую асфальтавую корку наехалі колы, яна адразу ж праламілася. Ford завіс над стромым кюветам. Намаганьні дзесяці мужчынаў апынуліся марнымі, давялося "стопіць" старэнькі "ЗИЛ", гружаны сенам, з утыркнутымі калгаснымі сахарамі...

Пакружляўшы па дарогах, мы нарэшце прыпыніліся ў промнях дагараючага злога сонца, на бруднаватым, зморшчаным ярамі выгане над Віхрою (альбо, па-тутэйшаму, Вяхрёю). Адплыўшы колькі кілямэтраў, мы сталі на другім выгане, на высьпе пад самаю Манастыршчынай, спудзіўшы тутэйшых гаспадароў — шэранькіх кастрамскіх каровак з вострымі і выгнутымі, як ухват, рогамі. Побач у рацэ мыліся манастыршчукі, ня вельмі цікаўныя да нашае пярэстае экспэдыцыі. Зь іхных словаў мы дазналіся, што царква ў Манастыршчыне (якую ў 1912 годзе пабудаваў Лесь Вітан-Дубейкаўскі) зруйнаваная і сёлета толькі пачалі яе адбудоўваць, што маста няма (у райцэнтры!), але наперадзе ёсьць новая дамба, што прадуктовыя крамы зачыненыя, бо "хлебны дзень" — праз пару дзён...

Дарэчы, што датычыць тутэйшага насельніцтва, людзі тут сапраўды дабразычлівыя і гаваркія. Аднаго разу пастух-рассеец гаварыў з другога берага па чарзе з кожным з нас, хто спускаўся да ракі, больш гадзіны, пакуль мы, ягоныя суразмоўцы, не разышліся. Іншым разам, калі нам захацелася паглядзець на краявіды з апошняга маста ў Рассі, мы пачулі як за сьпінамі кляцнуў затвор... Аказалася брыгада рыбнагляду зь міліцыяй, усё начальства. У кожнага свая форма, свая мадэль зброі, усё набакір, усё расхрыстана. Загадалі ўсім нам выйсьці на бераг, і... страцілі да нас цікавасьць. Пасьля загаманілі, наперабой распавядаючы, якая была паводка, як у іхным раёне браканьерыць беларуская міліцыя, ізноў пераключыліся на іншае: то памацюкаліся, што нехта вось тутака ўчора скраў усё з электрападстанцыі, то раптам сталі спыняць запар старэнькія легкавікі, настаўляючы стрэльбы ў шкло, нарэшце, сфатаграфаваліся з намі і з гігіканьнем зьехалі...

Ізноў навакольле агарнула ціш. Недзе тут, за пагоркамі, руіны старажытных манастыроў, курганы, замчышчы, слынны хасыдзкі Любавіч...

На мапах рэчка Віхра сапраўды выглядае віхраста, але наяве гэта нават няма з чым параўнаць. З-за бясконцых петляў часам здавалася, што мы ніяк ня дойдзем да канца маршруту. Лясы, да якіх нібыта можна было дастаць вяслом, на чарговым павароце раптам зьнікалі на колькі кілямэтраў убок і выглядалі ўжо недасяжнымі.

Першае, што кідаецца ў вочы на рацэ — чысьціня. Ні плястыку, ні бутэлек, ні іншага сьмецьця. Па-просту чыстая хуткая вада. Другое, што зьдзіўляе — гэта амаль поўная, у параўнаньні зь Беларусьсю, адсутнасьць мастоў. Дзіўнае відовішча — вёскі стаяць на абодвух берагах, а транспартнай сувязі паміж імі няма... Хоць для турыстаў на байдарках гэта тое, што трэба. Менш праблемаў, болей асалоды ад краявіду.

На прымітыўнай дамбе, складзеная з валуноў за Манастыршчынаю, паміж вёскамі Котава і Каровіна, хуткая плынь кіпіць на камянях, абдаючы ахвотных чыстымі моцнымі струмянямі. Дзякуючы гэтай новай дамбе, кожны год цяпер Віхра залівае многія кілямэтры лугоў, а ніжэй па рацэ зьявіліся ракі.

Краявіды тут вусьцішна натуральныя. Дастаткова ўскараскацца на любую з гораў, якія тут пульхныя і шырокія, каб пабачыць шырачэзныя разлогі мала кранутай, дакладней, даўно не крананай чалавекам зямлі... Пачуваесься тут як піянэр на Дзікім Захадзе, не стае толькі статкаў бізонаў. Ані слупа, ані плата. Нават ворыва нідзе не відаць. Часам трапляюцца сенажаці. А збольшага — чысьць. Зьдзічэлы Захад Расеі.

Камары — гэта тэма асобнае гутаркі. Незвычайная сёлета і цяпло паспрыялі шалёнай камарынай плоднасьці. Паветра па вечарах аж зьвінела ад уедлівых крывасмокаў. Першыя дзьве ночы даводзілася прыкладаць нямала намаганьняў, каб хоць неяк абараніць сябе і сваю псыхіку ад гэтае напасьці. Але пазьней наш эпідэрміс

стаў менш адчувальны да насатых інсэктаў. Урэшце, будуць камары — будзе і рыба. Рыба была. Як не згадаць таго незабыўнага шчупака, які літаральна на нашых вачох зжэр прынаду і адчайна затрапятаў на жылцы. Кіраўніку хора "Унія" Кірылу Насаеву давялося, крывавячы рукі, нямала зь ім пацягацца, перад тым, як на вячэру менавіта гэты шчупак стаў асноўным інгрыдыентам наварыстае юшкі, якое хапіла на ўсю вандроўную брыгаду...

... У адрозьненьне ад нашай пазалеташняй выправы ў Расею, на рэчку Мяжа, сёлета мы бачылі буяньне жыцьця на рацэ. Рыбы ў Віхры шмат, на яе йдуць ня толькі двухногія істоты, але цэлы сонм птушак — чапляў, жораваў, качак, кірляў, вялікіх і маленькіх рыбаедаў, то зьлева, то справа плюхнецца ў ваду ці то выдра, ці то вадзяны пацучок. Жыцьцё! Наглядная ілюстрацыя экалягічнага ланцугу: камары — рыба — птушкі са зьвярамі...

А рака станавілася ўсё больш пакручастай... Ніколі раней мы не траплялі ў такую колькасьць затокаў — тупікоў, шырокіх бясплынных тоняў. Па Віхры шмат выспаў, якія рака поратка й вясёла абцякае, прыўносячы ў сам працэс веславаньня нямала разнастайнасьці. Найбольшая выспа — каля вёскі са сьмешнаю назваю Туфля — каля кілямэтру даўжынёю.

Мала, напэўна, хто ўяўляе сабе, наколькі высокія на Заходняй Смаленшчыне горы. Чым бліжэй да Беларусі, тым вышэй і вышэй становіцца зямля, захінаючы далягляды. Ды і назвы вёсак тут адпаведныя: Холм, Палом, Крутая... З гораў краявід выглядае несамавіта, адкрываючы панарамы на ўсе 360 градусаў і ўздымаючы нас пад самае неба.

Неба ў Рассі бяскрайняе. Седзячы на плешцы якое гары можна бачыць цэлую сымфонію нябёсаў. З аднаго боку палымнее зарніца з другога — двубой аграмадных лілёвых і шызых хмараў, у адначасьсе плаўніцца раскалены закат і ў кобальтавай цішыні завіс маладзік. Колькі б мы ні спрачаліся, у якіх жывапісцаў можна пабачыць такое аграмаднае ўрачыстае неба, усё ж неба Расеі можна адчуць толькі праз расейскіх пэйзажыстаў...

Чым далей на Захад, тым больш назваў, мілых нашаму слыху: Кіславічы, Бачанкі, Слаўнавічы, рэчка-прыток Вяльнянка, што цячэ ад Любавічаў. Ды і людзкая гамана становіцца пакрысе ўсё больш сакавітай, усё больш беларускай. Але нарэшце за апошняй вёскаю на расейскім баку, Платкова, пачынаецца Беларусь. Тут каля пяці кілямэтраў мяжа цягнецца ўздоўж ракі. У гэтым месцы Віхра сьціснутая паміж высокіх крутых пагоркаў, зьлева —расейскі лес, справа — беларускія гоні.

Мяжа адчувальная ва ўсім. Найперш у вочы рэзка кідаецца чорна-белы пярэсты статак кароў-галяндак. На расейскім баку — выключна пясочна-шэрыя каровы. Семяннае разьмеркаваньне. Становіцца больш людзей... Як толькі ў Віхру ўпадае Чорная, рака сыходзіць углыб Беларусі... І вось ужо па берагах электрычныя слупы, велізарныя сьцірты сена, машыны, народ уміхаецца: хто за ральлёю, хто за сенам, цэлымі сем'ямі, а хто і за пярэстымі, нашымі каровамі. Людзі з ахвотаю адказваюць па-беларуску, жартуюць. Але пакуль ты не раскрыеш рота і яны будуць маўчаць. Недалёка ад вёскі Лютня першы за тыдзень сад над берагам, хай сабе пакуль калгасны...

Пад Лютняю прыпыніліся. Філёзаф Валянцін Акудовіч пераносіў зь берага на бераг старую кабету, а Кірыла Насаеў катаў на байдарцы малых дзяцей. Яны пыталіся: "А вы з Расеі плывеце? А гэта ў вас там такі флаг", — і паказвалі пальцамі на белчырвона-белы сьцяжок на носе байдаркі.

Як толькі выйшлі на пагон, што над крутым абрывам, раскрылася нам панарама на старасьвецкі Мсьціслаў... За пяць-шэсьць кілямэтраў горад відаць, як на далоні: бялее кармэліцкі касьцёл, за ім відаць старую вежу каланчы, зьлева гмах колішняга езуіцкага касьцёлу і, нібыта ў шаты, увесь Мсьціслаў убраны ва ўльтрамарынава-зялёныя лясы.



Легендарны Мсьціслаў усьцешыў. Насуперак усім стэрэатыпам, насуперак пляскаваму лёсу, ён стаіць. Места вялікіх падзеяў і радзіма вялікіх людзей. У касьцёле знайшлі сваіх даўніх знаёмцаў — братоў Маліноўскіх, дзякуючы якім атрымалі магчымасьць агледзець усё, пра ўсё дазнацца... Усё ж зьмяняецца Беларусь, спакваля, нягучна, але прыходзіць у норму... Колькі б ні лілося хлусні з радыёскропак, колькі б ні вешалі "народнай" бутафорыі, як бы ні было цяжка пераадольваць новыя й новыя вывіхі абсурднага ладу. Кармэліцкі касьцёл, які трыццаць гадоў прастаяў у рыштаваньнях, і, здавалася, ня будзе таму канца, ужо зіхіціць залатымі крыжамі; велізарная спаруда былога касьцёлу езуітаў, якая, якіх пяць гадоў таму была ў безнадзейным стане, сёньня спавітая рыштаваньнямі і ўжо адноўлены дах, франтон, растуць вежы; прыбраныя да рук і цэрквы; дамкі, якія перажылі СССР, зіхацяць ахайна пафарбаванымі сьценамі, пад якімі красуюць пярэстыя кветнікі. Для гэтых краёў гэта калі ня цуд, то нешта вельмі да таго падобнае. Можна жыць з розумам, можна жыць прыгожа, галоўнае быць у суладзьдзі з краем, месцам, дзе жывеш... Нават сьмешныя карцінкі местачковага жыцьця, кшталтам, БТРа перад Клюбам аматараў відэа ў былым кляштары, з гербам Мсьціслава над дзьвярыма, выглядаюць ня брыдка, а постмадэрністычна, здарова ад пачатку. Мэмарыяльная шыльда Міхасю Ткачову... Чысьцюткі бярозавы гай на стромкай гары за старасьвецкімі могілкамі...

Адзін тыдзень, адна рака, адна краіна.

Сяргей Харэўскі

ЭЙРЭ

Вітрына празрыстай кулеадпорнай камізэлькай ахінае нацыянальныя сьвятыні: ілюмінаваныя манускрыпты канца мінулага тысячагодзьдзя. Адзін з добраахвотных галернікаў сярэднявечнага скрыпторыя прызнаўся на палях свайго шэдэўра, што стварэньне рукапіснай кнігі з акампанэмэнтам фігурных літар, застаўак, ілюстрацыяў, велічнай вокладкі каштуе столькі ж сілаў і часу, колькі пабудова сабору. Схіліўшыся над кніжнымі манумэнтамі ірляндзкай мінуўшчыны, мімаволі ўспамінаеш той выпадковы радок стомленага манаха-ананіма. Эйрэ мае тры галоўныя сымбалі: Кнігу, Крыж і Арфу.

КНІГА

Іспыты па мэдыевістыцы (клубку ведаў, што тычацца Сярэднявечча) заўсёды нагадвалі мне допыт у папскім трыбунале. Было цяжка і трывожна. Дапытвала жыўцом прадстаўленая пецярбурская прафэсура, па кнігах якой займаюцца цяпер юнаты з БАМ. Але за тую даўнюю дрэсуру засталася шчырая ўдзячнасьць эўрапейскага правінцыяла, які часьцей за ўсё не губляецца, сустрэўшы старых знаёмых па хрэстаматыях. Вітаю цябе, "Book of Kells"! Кніга раскрываецца пастырскімі абдымкамі і прымае грэшную душу ў сьвет недасягальнай абстракцыі. Тысячы сьпіраляў, хітраспляценьняў, вузлоў, рытмізаваных крывых (дарагіх сэрцу кожнага крывіча) заварожваюць сваім узьнесеным над банальнасьцю шматгалосьсем. Іхная сьпеўная геамэтрыя — гэта тое ж адлюстраваньне Вечнасьці, горняга сьвету, што і золата абразоў усходнехрысьціянскай традыцыі. Вочы няўпэўнена прачытваюць у віры фарбаў і ліній ініцыял "XPI" — імя Збаўцы напісана па-грэцку!

Ірляндзкіх манахаў не засмучала адсутнасьць роднага востраў. Для сярэднявечча іхная экспансія мае надзвычай шырокі размах. Заснаваныя імі кляштары ў Францыі, Швэйцарыі, Італіі на стагодзьдзі сталіся наймацнейшымі цэнтрамі рэлігійнага і культурнага жыцьця. Так, кляштар Монтэ-Касіна, які па дарозе на Рым давялося штурмаваць беларускім жаўнерам з Арміі Андэрса ў 1944 г., таксама твор пасланцоў далёкай Гібэрніі (старажытная назва востраў Ірляндыя). Можа невыпадкова, што адзін з галоўных сьвятых гэтай пасіянарнай нацыі называецца Сьв. Калюмба (!).

Якраз ягонымі сьлядамі трапляю ў Кэлс, маленькае мястэчка, услаўленае на ўвесь сьвет ілюмінаваным Эвангельлем IX ст. Ажно ня верыцца, што менавіта тут наканавана спыніцца амаль на месяц маёй ірляндзкай камандыроўкі.

КРЫЖ

Ён стаіць ужо 11 стагодзьдзяў на скрыжаваньні двух найважнейшых гасьцінцаў востраў. Ён — адзін з 400 хрысьціянскіх волатаў Ірляндыі, на каменным целе якіх рэльефамі разгарнулася "Біблія для непісьменных": прарокі, апосталы, змаганьні, аршакі і зноў бясконцая мэлёдыя кельцкага арнамэнту. Толькі савок, пабачыўшы крыжы, успамінае выключна могілкі. На гэтых дараманскіх помніках Хрыстос — не змардаваная ахвяра. Ён царуе над сусьветам, раскінуўшы рукі ня з волі катаў, а ў магутным жэсьце ўладараньня, як увасабленьне перамогі над сьмерцю і цемрай паганства.

Кельцкія плямёны эйраў не зазналі рымскага панаваньня. Са скалістага берага ў яснае надвор'е бачная недалёкая Брытанія, адкуль лацінянін Агрыпа саманэўнена гукнуў: "Я б скарыў Гібэрнію з адным легіёнам". Будучыня паказала, што эйры здольныя стагодзьдзямі бараніцца ад нарманскіх і ангельскіх захопнікаў. Упартасьць і кансэрватызм гэтай нацыі ярка выявіліся ў VII ст. Папа Рыгор Вялікі жалезнай рукой рэфармаваў каталіцкую Царкву. Тады ўзьніклі грыгарыянскі каляндар, грыгарыянская імша, грыгарыянскі харал. Ірляндыя, канкурэнцыйны цэнтар каталіцызму, доўга трывала за старымі догмай і абрадам.

Ангельскім акупантам урэшце ўдалося раскалоць эйраў, прышчапіўшы, асабліва на поўначы востраў, пратэстантызм. Да канца XIX ст. каталікі маліліся ў палях, дзе дагэтуль стаяць каплічкі катакомбнай царквы, якая мае тысячы пакутнікаў ад біскупаў да простых вернікаў. Да апошняй балканскай вайны 25-гадовае рэлігійнае змаганьне ў Ольстэры, дагэтуль акупаваным брытанцамі, выглядала нейкім архаічным рарытэтам Старога Сьвету. Рэчаіснасьць ўпэўнена разбурае стэрэатыпы.

АРФА

Калі Сьвяты Патрык у 432 г. пачаў хрысьціянізацыю Ірляндыі, эйры-нэафіты, безумоўна, упадабалі біблейскага цара Давіда, майстра арфічнай музыкі. Як дуда ў шатляндцаў, так арфа на вольным востраве была голасам душы народа. Цяпер тут часьцей пачуеш скрыпку і гармонік, а залатая арфа на смарагдава-зялёным фоне застыла сымбалем ірляндцаў усяго сьвету.

Калі выяжджаеш з ірляндцам на месца гістарычных падзеяў, ён камэнтуе мінуўшчыну, як эпізод біяграфіі свайго пакаленьня. Вось магіла паўстанцаў 1798 г. у старажытнай сталіцы Тары. Тады ўпершыню над аддзеламі паспалітага рушэньня ўзьняўся нацыянальны сьцяг. Кожныя ўгодкі бітвы на рацэ Бойнэ, што адбылася ў чэрвені 1690 г. і скончылася паразай каталіцкага войска, адзначающца ў Ольстэры пратэстанцкімі маршамі і арганізаваным супрацівам каталікоў. Сёлета вулічныя сутыкненьні і пажары набылі асабліва катасрафічны характар. У сем'ях захоўваюцца рэліквіі партызанскай вайны 1919-21 г. Дарэчы, адозвы акупанцкай улады, рэпрэсіўныя цыдулкі губэрнатараў і судоў да сьмешнага падобныя на знаёмую цяпер нам рэчаіснасьць.

Бяз доўгіх тлумачэньняў зразумелая нам і моўная сытуацыя ў Ірляндыі. Сваю старажытную (і выключна складаную) гэльскую мову вывучаюць усе дзеці ў школе. Некаторыя бацькі пасылаюць сваіх дзяцей у летнікі на паўночна-ўсходнюю і паўночна-заходнюю ўскраіны востраў, дзе яшчэ жыве мова продкаў у натуральным асяродзьдзі. Але ангельшчына пусьціла надта глыбокія карані, невядома чым скончыцца гэтае лінгвістычнае спаборніцтва. Эйрам дастаўся агрэсіўны сусед, са зноў жа знаёмай нам прэтэнзіяй на ўнівэрсалізм.

Аднак, напойвае аптымізмам просты візыт на Галоўпаштамт у Дубліне. Адправіўшы лісты ў адну флегматычную краіну, чытаеш радкі Дэкляцыі незалежнасьці, абвешчанай у гэтым будынку, які быў цэнтрам гераічнага паўстаньня ў красавіку 1916 г., "Poblacht Na H Eireann" (Часовым урадам Ірляндыі): "У імя Бога і памерлых пакаленьняў, ад якіх яна прымае старажытную нацыянальную традыцыю, Ірляндыя праз нас заклікае сваіх дзяцей пад свой сьцяг на барацьбу за свабоду".

Да перамогі заставалася пяць гадоў...

Валеры Буйвал

Ігар Міхно

ПА СЬЛЯДАХ ЛІЦЬВІНСКАЙ

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ВАЙНЫ...

На пачатку XV ст. Чэхія знаходзіцца ў складаным становішчы — моцныя суседзі аказваюць значнае ўзьдзеяньне на падзеі ў краіне. Вялы і нерашучы кароль чэхаў Вацлаў балянсуе і дапускае пранікненьне ў краіну нямецкага ўплыву.

30 ліпеня 1419 году пад кіраўніцтвам Яна Жэліўскага ў Празе падымаецца паўстаньне. Вацлаў памірае, не пакідаючы спадкаемца. Карона чэскага караля прапанаваная польскаму каралю Ягайлу. Ягайла адмаўляецца ад яе. І тады запрашэньне прымае вялікі літоўскі князь Вітаўт — адзін зь пераможцаў крыжацкага Тэўтонскага ордэна пад Зялёным Гаем (Грунвальд) у 1410 годзе, які намінальна становіцца каралём Чэхіі. Ён дасылае ў Прагу свайго намесьніка.

З блаславеньня Папы Рымскага Марцьна V імпэратар Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі Сыгізмунд I выступае арганізатарам пяці крыжовых паходаў на гэтыя землі, якія падтрымала мясцовая фэадальная рэакцыя. 1 сакавіка 1420 году папа абвяшчае І крыжовы паход супраць ератыкоў-чэхаў.

Чэхі ўспрымаюць каталіцкую і моўную агрэсію варожа. У 1420 годзе ў горадзе Табар зьбіраюцца радыкальна настроеныя паўстанцы, якія ствараюць армію і атрымліваюць назоў табарыты. 5 жніўня таго ж году яны прымаюць сваю праграму "Дванаццаць праскіх артыкулаў".

Гетманам табарытаў становіцца Ян Жыжка — палкаводзец, удзельнік Грунвальдзкай бітвы, пад час якой ён страціў вока. Жыжка ўводзіць у арміі сыстэму вагенбург (ад ням. Wagen — павозка і Burg — абарона) — умацаваньне з павозак у форме чатырохкутніка, кола або паўкола, якое магло ўзмацняцца вазамі альбо іншымі перашкодамі. Кожная такая вайсковая адзінка ўключала 10 чалавек: вазьніца, 4 малацільшчыкі з цапамі, лучнікі, арбалетчыкі, аркебузьнікі. На павозках нерухома мацаваліся гарматы, якія білі ва ўпор на ўзроўні грудзіны каня. Пешае войска падтрымлівала лёгкая коньніца.

Жыжку ўдаецца дамовіцца з другім паўстанцкім крылом — памяркоўнымі чашнікамі, і канчаткова разьбіць у 1421 годзе чужынцаў, спыніўшы тым самым І крыжовы паход. Страціўшы ў адным з баёў і другое вока, ён працягвае камандаваць войскам.

Але Сыгізмунд арганізоўвае паходы адзін за адным. Табарыты дзейнічаюць рашуча. Іх падтрымліваюць лаварнікі і, спадзеючыся на перамогу, яны просяць Вітаўта аказаць вайсковую дапамогу. Вітаўт адгукаецца на просьбу. Ва ўсходніх абласьцях Вялікага княства зь ліку праваслаўных набіраецца трохтысячная дружына, якая перадаецца пад кіраўніцтва князя Жыгімонта і ў 1422 годзе прыбывае ў Чэхію.

Табарыты разам зь ліцьвінамі адбіваюць тры крыжовыя паходы. Пасьля сьмерці ў 1424 годзе Яна Жыжкі армія табарытаў падзяляецца на дзьве часткі — табар вялікі і табар малы альбо сіроты, якія ўзначалілі Пракоп Вялікі альбо Голы і Пракоп Малы альбо Прокупэк. Шэраг атрыманых імі перамогаў над чужынцамі і мясцовай рэакцыяй дазволіў перанесьці вайсковыя дзеяньні на варожыя тэрыторыі — у Вугоршчыну, Маравію, Баварыю, Сілезію. У 1432 годзе яны ідуць вялікім паходам супраць брандэнбурскіх фэадалаў, які скончаецца толькі ў 1433 годзе: табарыты прайшлі да Кюстрына — самага ўзьбярэжжа Балтыйскага мора.

Тым часам рознагалосьсі паміж табарытамі і чашнікамі ўзрастаюць і, урэшце, перарастаюць у збройнае змаганьне. У 1433 годзе чашнікі аб'ядноўваюцца з рэакцыяй. У 1434-м ля Ліпанаў яны наносяць табарытам вырашальную паразу. Гінуць Пракоп Вялікі і Пракоп Малы. Асобныя атрады табарытаў вялі барацьбу яшчэ да 1452 году.

... І ЛЁС АДНОЙ ЛІЦЬВІНСКАЙ ДРУЖЫНЫ

Нашыя ваяры ваявалі ў Чэхіі восем гадоў. Вялікі літоўскі князь Вітаўт аддаваў ім загад вярнуцца на радзіму. Але князь Жыгімонт з дружынай прынялі рашэньне застацца з табарытамі. Ніхто зь іх адтуль не вярнуўся.

ПЕРАДУМОВЫ ВЫЦЕЧКІ

Перадумовы для нашае вандроўкі стварыў Стась Івашкевіч, які, жывучы цяпер у Празе, ня кінуў там свайго старога захапленьня рыцарствам і "прыбіўся" да мясцовага вайскова-гістарычнага клюбу "Streitax" ("Баявая сякера"). Ён і паведаміў у Беларусь, што на пачатку жніўня там адбудзецца рэканструкцыя адной зь бітваў гусіцкіх войнаў — штурм замка Млазавіцэ па сцэнары захопу яго войскам Яна Жыжкі ў 1424 годзе. Зь ягонага ж клопату мы атрымалі і афіцыйнае запрашэньне на ўдзел у гэтай рэканструкцыі.

УДЗЕЛЬНІКІ

Асноўную частку нашых байцоў склалі сябры Вайскова-гістарычнага клюбу "Kalumny". Побач таксама стаялі ўзмужнелыя хлапцы з клюбу "Грунвальд" і вельмі сымпатычная і бойкая паненка з клюбу "Срэбны Адзінарог". Разам з намі адправіліся ў дарогу і аматары падобнага роду відовішчаў, пакуль для Беларусі ўнікальных.

Двое дзецюкоў з "Kalumnaй" — Максім Макараў і Аляксандар Серавін — дабраліся да Млазавіцэ раней за асноўную грамаду і сур'ёзна дапамаглі зьдзіўленым арганізатарам у пабудове замку і падрыхтоўцы падзеі.

ДАРОГА

Аўтобус "Neoplan" вынес нас у Польшчу і мы, натуральна, утаропіліся ў нязвыклы для нас пэйзаж. Цікава паназіраць за тымі зьменамі, што адбываюцца ў суседзяў.

Болей чым тысячакіламэтровую дарогу ўдала скрасілі нам рыцарскія фільмы. Хітом, безумоўна, стаў "Адважнае сэрца" з Мэйлам Гібсанам.

Чэхія сустрэла нас сонцам і адсутнасьцю чэргаў на мяжы. Прадчуваньне Прагі, а ад мяжы да яе ўсяго тры гадзіны язды, часова адсунула пасьлязаўтрашнюю падзею на задні плян.

ПРАГА

Прага, акрамя ўсім добра вядомай старажытнасьці і ўнікальнай захаванасьці і прыгажосьці, цікавая была нам і сьлядамі гісторыі беларуска-чэскіх кантактаў: Францішак Скарына, урад БНР у эміграцыі, Міхась Забэйда-Суміцкі, беларускае міжваеннае студэнцтва. Ну і, безумоўна, ваярства нашых продкаў у XV ст.

Чатырохгадзінавай экскурсіі па Празе

БЫЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ, ЗМАГАЦЦА

Мы сустрэліся ўвечары, калі спала пасьляпалудневая сьпёка, у недарагой кавярні ў Маратанасе на ўскрайку Мадрыду. Мой суразмоўца — Раман Б. — належыць да руху Геры Батасуна (на мове баскаў — Аб'яднаны Народ). Створаны ў 1977-м з ініцыятывы радыкальных басконскіх нацыяналістаў, Геры Батасуна лічыцца палітычным крылом ЭТА — арганізацыі, што больш за трыццаць гадоў вядзе ўзброеную барацьбу за незалежнасьць рэгіёну. Тэма гутаркі — актуальная сытуацыя на лініі супрацьстаяньня ЭТА і гішпанскага ўраду.

Кампаньера Лёлік: Кампаньера Раман, на працягу апошніх месяцаў з телеэкранаў сьвету не сыходзяць ролікі велічных дэманстрацыяў пратэсту супраць ЭТА. Кажуць, што пасьля забойства баевікамі ЭТА маладога кансэрватара М.Бланко ўся Гішпанія выйшла на вуліцы прадэманстраваць сваё абурэньне. Што ж адбывалася насамрэч з пункту гледжаньня басконскіх індэпэндыстаў?

Кампаньера Раман: Кампаньера Лёлік, сёньня відавочнае абвастрэньне басконска-мадрыдзкага канфлікту. Аднак яго вытокі знаходзяцца не ў пакараньні М.Бланко, а ў новым курсе, што праводзіць цэнтар у адносінах да баскаў з 1995 году. На працягу першай паловы 90-ых сацыялістычны ўрад Гансалеса намагаўся весьці дыялёг з басконцамі. У прыватнасьці, праз ляўрэата Нобэлеўскай прэміі П.Эсківэля вяліся перамовы з гістарычнымі лідэрамі ЭТА, дэпартаванымі ў Лацінскую Амэрыку. Але з 1995 году правая Народная Партыя, што прыйшла да ўлады, адмовілася ад дыялёгу на карысьць новай канфрантацыі. Першымі ахвярамі наступу новага ўраду сталі легальныя арганізацыі басконскіх патрыётаў. У 1995 годзе быў праведзены паказальны судовы працэс над басконскай леварадыкальнай маладзёжнай групай Commando Y. Пад час працэсу ўлады ўсялякімі сродкамі даводзілі сувязь вулічнай апазыцыі і маладзёжнай арганізацыі Геры Батасуна.

К.Л.: Ты ўзгадаў пазапарлямэнцкую маладзёжную апазыцыю. Што гэта такое?

К.Р.: Сапраўды, у Краіне Баскаў побач з палітычнай і баёвай апазыцыяй існуе вельмі моцны маладзёжны супраціў. Гэта вельмі творчы рух. Сацыяльная глеба для гэтага — вялізнае беспрацоўе сярод урбанізаванай моладзі, недзе ад 11 да 22 працэнтаў. Замест тупога сядзеньня ля тэлевізара або сьмерці ад наркотыкаў яны выбіраюць барацьбу. Амаль штодня ў паліцэйскія "апоркі" ляцяць "кактэйлі Молатава", акупуюцца будынкі пад жыльлё, ладзяцца палітычныя і культурныя мерапрыемствы. У ідэалягічным сэнсе гэта спантанна-анархічныя ініцыятывы, якія крытыкуюць ЭТА і Геры Батасуна за празьмерную дысцыпліну. Такім чынам, казаць пра нейкую сувязь паміж Commando Y і намі бессэнсоўна.



К.Л.: Вернемся да падзеяў 1995-96.

К.Р.: Пасля спробаў крыміналізацыі Геры Батасуна Мадрыд пачаў шалёную прапагандысцкую кампанію супраць басконскага незалежніцтва. Выпускі тэленавінаў будаваліся паводле прынцыпу: 10 хвілінаў сюжэт пра кепскіх басконцаў, 5 хвілінаў пра добры ўрад і нарэшце пра спорт і надвор'е. Аднак ЭТА пачала рэагаваць на новы наступ ураду толькі пасля таго, як у турмах Гішпаніі пры загадкавых абставінах загінулі два басконскія палітвязьні.

К.Л.: Ты можаш распавесьці пра сытуацыю ў турмах Гішпаніі?

К.Р.: На вымогі басконцаў Мадрыд і Парыж заўсёды адказвалі рэпрэсіямі. Зараз у турмах Гішпаніі і Францыі знаходзяцца каля 600 басконскіх патрыётаў, яшчэ 2000 чалавек дэпартаваныя. Мы маленькая нацыя (насельніцтва Краіны Баскаў — 3 мільёны) і кожны вязень — гэта вялікая трагедыя для ўсяго басконскага грамадзтва. Неадкладная амністыя была і застаецца адным з самых галоўных патрабаваньняў нашага руху. Зразумела, што сьмерць палітвязьняў адразу падштурхнула ЭТА да новых тэрактаў. У сваю чаргу ўрад арыштоўвае ў верасьні 1995-га ўсё кіраўніцтва Геры Батасуна. Увесну 1996-га паліцыя жорстка разганяе дэманстрацыю баскаў у Більбао, што не практыкавалася з часоў Франка. Парушэньне правоў чалавека было настолька відавочным, што нават камісія гішпанскага парлямэнту па правах чалавека прыняла рэзалюцыю з асуджэньнем дзеяньняў урада. Каб неяк апраўдацца, урад пачаў рэанімаваць стары міт кастыльскіх нацыяналістаў аб сувязі басконскага сэпаратызму і ўнутранай левай апазыцыі .

К.Л.: ЭТА і Геры Батасуна ў пачатку сваёй дзейнасьці зьвязвалі нацыянальнае вызваленьне з рашэньнем сацыяльнага пытаньня. Што ўяўляе сабой антыкапіталізм па-басконску сёньня?

К.Р.: Пасля каляпсу сталінізму мы зьмянілі свае першапачатковыя сацыялістычныя прыярытэты на карысьць незалежніцкіх лёзунгаў, але мы працягваем разглядаць наш сацыяльна-палітычны канфлікт з Мадрыдам і Парыжам, як барацьбу з капіталізмам. Прынцыпы арганізацыі басконскага грамадзтва — гуманізм, салідарнасьць, экалягізм — ня маюць нічога агульнага з каштоўнасьцямі капіталістычнай цывілізацыі — грошы, індустрыялізм, поп-культура...

К.Л.: Вяртаючыся да гісторыі раскручваньня сьпіралі напружанасьці паміж Мадрыдам і ЭТА: што адбылося пасьля таго, як ЭТА забіла М.Бланко? Ці сапраўды мільёны людзей выйшлі на вуліцы ?

К.Р.: Ведаеш, кампаньера Ушкін, адразу пасьля выкраданьня М.Бланко рэжым мабілізаваў увесь апарат мас-мэдыя дзеля кампрамэтацыі басконскага руху. 24 гадзіны на суткі з экрану гаварылі толькі пра левых фашыстаў з Краіны Баскаў. На маю думку, можна казаць аб перамозе маніпуляцыі: мільёны людзей выйшлі на вуліцы. Пад шумок абурэньня правыя і нэафашысты арганізавалі сапраўдныя пагромы басконскіх культурных цэнтраў, офісаў Геры Батасуна... Зноў адбыліся арышты лідэраў басконскіх арганізацыяў.

К.Л.: Што зьбіраецца рабіць Геры Батасуна цяпер?

К.Р.: Краіна Баскаў — гэта рэальнасьць, якая паўстала як наступства супрацьстаяньня з рэпрэсіўнай стратэгіяй Мадрыда і Парыжа. На гісторыі барацьбы пабудаваная сацыяльная структура нацыі, мова, культура. Адмовіцца ад барацьбы значыць для баскаў — сысьці з рэальнасьці.

Лёлік Ушкін

Менск – Мадрыд

ДРУЖЫНЫ

нам падалося мала і мы ўсе дружна пакідалі з Карлавага мосту ў Влтаву чэскіх кронаў. Каб прыехаць яшчэ.

ЧЭСКІЯ РЫЦАРЫ

Вайскова-гістарычны рух распачаўся ў Чэхіі некалькі дзясяткаў гадоў таму, сёньня па ўсёй краіне дзейнічаюць каля трыццаці клюбаў "historickeho sermu". Многія зь іх працуюць на базе старажытных замкаў, ёсьць спэцыялізаваныя па пэўных накірунках, напрыклад, рэканструююць гарматы, стралковую зброю і сярэднявечнае стралковае мастацтва. Сярэднявечны стыль чэскіх ваяроў выяўлены літаральна ва ўсім — вопратцы, фрэзуры, манерах, кашальках, люльках, упрыгожваньнях, дзецях.

Са словаў чэхаў, сябры вайскова-гістарычных клюбаў праходзяць адмысловае навучаньне, здаюць іспыты, плоцяць значныя грошы і тады атрымліваюць права на занятак ваярскай справай. Многія рыцары тут выкладаюць спэцыфічныя дысцыпліны ў агульнаадукацыйных школах.

На сёлетнюю традыцыйную сустрэчу зьехалася з усёй Чэхіі каля двухсот пяцідзесяці чалавек.

ПЕРАД БІТВАЙ

Яшчэ за дзень да бітвы арганізатары пачалі папярэджваць: "Перад бойкай — ні кроплі алькаголю".

У першай палове дня бітвы адбыўся інструктаж, які пачаўся з хвіліны маўчаньня па дзяўчыне, якую летась выпадкова застрэлілі зь пішчалі. Стась Івашкевіч, які вольна валодае чэскай гутарковай мовай, пераклаў нам: "Трох беларусаў будуць абараняць замак. Астатнія ідуць пад начала пана Яна — на правае крыло. Вам выдадуць алебарды і ў вашай задачы будзе пад час трэцяй атакі прасекчы замкавую сьцяну, уварвацца ў замак і выціснуць абаронцаў праз браму насустрач нашым аддзелам. Пры шыхтаваньні перад замкам паміж аддзеламі мусяць строга захоўвацца калідоры — хаця гарматы мусяць страляць халастымі (дарэчы, мукой), гарматы гэтыя і іхныя стрэлавыя хвалі ўсё ж сапраўдныя. Пасьля перамогі мы бярэм у палон жанок і дзяцей. Жанок гвалцім і выцягваем, выцягваем і гвалцім, а пасьля "рэжам": і палонных, і недабітых".

За дзьве гадзіны да пачатку ўсе ўдзельнікі лягеру прайшлі вольным парадам з цэнтральнага пляцу Млазавіцэ да поля бітвы. Усьлед за імі пакрысе пацягнуліся мясцовыя жыхары і турысты. Яны, дарэчы, плацілі за ўваход грошы.

Увесь лягер стрымана вонкава і засяроджана ўнутрана рыхтаваўся да бою, грымеў жалезам — народ апранаўся. Да кульмінацыі нашае выцечкі заставалася паўтары гадзіны. Адчуўся прыток у кроў адрэналіну. Асабіста я ў гэты дзень пакуль нічога ня здолеў зьесіці.

БІТВА

Дзейства пачалося пад чэскую сярэднявечную музыку ў тры гадзіны па палудні паводле сярэднеэўрапейскага часу.

Жанчыны перад замкам малоцяць жыта, дзеці гуляюць, дзяўчаты танцуюць. Швэйцарскія пехацінцы са сьценаў і брамы спакойна ўглядаюцца ўдалеч. Іхныя раптоўныя крыкі абрываюць ідылію —усе бяззбройныя ўцякаюць у замак, насустрач перадавому аддзелу Жыжкі выбягаюць крыжакі. Пасьля дробнай сутычкі ворагі разыходзяцца. З рукатам зачыняецца брама.

Начальства сыходзіцца перад замкам на перамовы. У гэты час юрлівы крыжацкі блазен атрымлівае смачнага высьпятка ад чэскага ваяводы. Ізноў дробная сутычка, якая прадвяшчае ўжо блізкую "сур'ёзную справу".

Пад немыя крыкі і неймаверны бразгат жалеза на замак накатваюцца і адкатваюцца дзьве чэскія атакі. Нядоўгі перадых перапыняе даволі працяглая гарматная перастрэлка. Жыжка дае каманду на трэцюю атаку. Магутнымі ўдарамі алебардаў беларусы здолелі прабіць замкавую сцяну, першымі ўварваліся ў цытадэль, тым самым перадвырашыўшы лёс абаронцаў.

ПАСЬЛЯ БІТВЫ

Піва пацякло ракой. Празь вялікую калёнку загрымела музыка (як пасьля высьветлілася — на ўсю ноч). "Трупы" прастаўлялі сваім "забойцам" піва і дарылі сувэніры. Зь беларусаў больш за ўсё атрымаў іх Аляксандр Серавін, як кажуць, і на шыю, і ў кішэню.

Навуковы кансультант "Kalumnaй", супрацоўнік Інстытуту гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Юрась Бохан тлумачыў свайму чэскаму калегу асаблівасьці беларускага вайсковага строю і ўзбраеньня. Знакаміты бард Зьмітро Сідаровіч сьпяваў пры вогнішчы сваім і чэхам "Тры жалуды на цабэрак". Кола маіх кантактаў і калекцыя візытовак значна пашыралася штогадзіны.

ПАТОП

Багата хто перад ад'ездам пытаўся пра патоп, які захапіў паўднёвую Польшчу і часткова Чэхію і Нямеччыну — ці праедзем? Сапраўднага патопу мы ня бачылі, але па дарозе дахаты, едучы па аб'ездах, пабачылі і панюхалі ягоныя сьляды — пакладзеная ў адзін бок брудна-шэрая трава, разьнесеныя будынкі лецішчаў з ссохлымі дрэўцамі побач, вымытыя на дарогах ямы, дзе-нідзе яшчэ даволі вялікія калюжыны і смурод цывілі праз вокны "Neoplana".

ЭПІЛЁГ

Чэхі літаральна на сабе ацанілі высокі ўзровень баявой падрыхтоўкі нашых хлопцаў. Была нават невялікая кроў.

У адрозьненьне ад сярэднявечных падзеяў зараз на радзіму вярнуліся ўсе беларусы. Жывыя, здаровыя, задаволеныя.

Арганізатары акцыі з клюбу "Streitax" дамовіліся зь мясцовымі млазавіцкімі ўладамі пра тое, што пабудаваны сёлета замак, у адрозьненьне ад мінулых гадоў, ня будзе разабраны. Наадварот, на лета ён будзе дабудаваны ўверх і ўшыркі, і зноў прыме на сябе баявыя атакі.

Беларусы пачулі ў свой гонар гарматны салют, словы асобнай падзякі за ладны ўдзел і атрымалі запрашэньне на наступную "вайну".

Здымкі Андрэя Нікалаева

РЭКТАР ПАДПОЛЬНАГА ЎНІВЭРСЫТЭТУ

Памяці Лявона Луцкевіча

Напрыканцы ліпеня ў Вільні памёр Лявон Луцкевіч. "Стары віленчук", — адзін зь ягоных псэўдонімаў. "Найбольш дасьведчаны дасьледчык беларускай Вільні" — гэта вызначэньне з прадмовы да публікацыі ягонай кнігі ў часопісе "Нёман".

Мы пазнаёміліся зь ім гадоў пятнаццаць назад. Я тады прыязджаў у Вільню, праседжваў у яго часам да раніцы, і, абкладзены фотаальбомамі, слайдамі, старымі кнігамі, — слухаў. Мяркую, што такіх, як я, "пляменьнікаў" у дзядзькі Лявона было шмат. На мяжы 70-х і 80-х ягоная кватэра і Лясная хатка ягонай цешчы Зоські Верас сталі сапраўдным універсытэтам беларушчыны, дзе не адзін студэнт атрымліваў сваю навуку.

Лявон Луцкевіч быў рэктарам і выкладчыкам гэтага ўніверсытэту. Шкада, што ў тыя гады мы яшчэ ня ўмелі назваць усё гэта менавіта такім чынам.

Але нефармальнай выкладчыцкай працай далёка не абмяжоўвалася дзейнасьць дзядзькі Лявона. Як журналіст ён супрацоўнічаў зь беларускімі, літоўскімі, польскімі газэтамі, з "Нашай Нівай", з радыё, у тым ліку з Радыё Свабода, меў уласную тыднёвую праграму на літоўскім радыё, з тэлевізіяй. Як дасьледчык, сыстэматызаваў масу гістарычнага, краязнаўчага і біяграфічнага матэрыялу. Як грамадзкі дзяяч, узначальваў школьнае таварыства. Мусіць, няма такога беларускага актывіста позьнесавецкага часу, з кім бы ў Луцкевіча не было перапіскі. І ўсё гэта толькі эпізоды ягоных шырокіх заняткаў. Некалі энцыкляпэдысты будуць мець праблемы зь ляканічным вызначэньнем гэтае асобы.

Але ёсьць за Луцкевічам і пэўнае эксклюзіўнае месца ў культуры. Каб зразумець яго, трэба зьвярнуцца да Вільні — да гэтага суплёту многіх культураў і нацыянальных амбіцыяў, які адначасова сам культура, прычым наднацыянальная, сынтэтычная. Вільня — гэта як спэцыялізацыя. Ну, напрыклад, мы кажам, што ў аўстрыйскай мэдыцыне ёсьць выдатныя герантолягі. Гэтак у польскай, літоўскай, жыдоўскай, беларускай культурах ёсьць выдатныя прадстаўнікі Вільні, якія разам з тым самадастатковыя і самакаштоўныя, як тыя герантолягі.

Для палякаў Вільня — гэта "белая костка" культуры, пазначаная імем паэта першае велічыні Адама Міцкевіча. Сёньня, напэўна, галоўны мэтафізычны выразьнік віленскае пальшчызны — Чэслаў Мілаш, які жыве ў Амэрыцы. Для літоўцаў гэта тэрыторыя засвасьня. Галоўны прадстаўнік віленскае літоўшчыны Владас Дрэма памёр пару гадоў назад, а яму на зьмену прыйшоў Томас Венцлава (ЗША). Для жыдоў гэта страчаны Ерусалім. Галоўны прадстаўнік — Георгі Кановіч ня так даўно эміграваў у Ізраіль. Для беларусаў сёньня гэта тэрыторыя адчужэньня. Галоўны прадстаўнік віленскай беларушчыны Лявон Луцкевіч. Пералічаны шэраг асобаў — гэта той культурны кантэкст, у які ён міжвольна трапляе. Як адзіны дасьледчык і выразьнік Вільні ў беларускай культуры.

Адначасова Луцкевіч быў галоўным прадстаўніком беларушчыны ўжо ў самой Вільні. (Гэта як бы мы казалі пра аўстрыйскую школу ў геранталёгіі.) А вылучыла яго на такія ролі права спадчыннасьці і разуменьне свайго пажыцьцёвага абавязку. Фактычна з усяе шматлікае інтэлігенцыі Вільні Луцкевіч заставаўся адзіным прамым беларускім нашчадкам тутэйшае старасьвеччыны, "Нашае Нівы", БНР, Гімназіі, Музэя... — усяго, што стварылі ў свой час ягоны дзядзька Іван і ягоны бацька Антон.

Да апошняга дня Лявон Луцкевіч са шчырасьцю і энтузіязмам стараннага гімназіста імкнуўся, як мог, працягваць



1981 год. Лясная хатка на Ніжніх Панарах у Вільні. Іван Пратасеня, Зоська Верас, Лявон Луцкевіч, Віталь Скалабан.

тытанічныя высілкі сваіх магутных папярэднікаў-сваякоў.

Больш за 10 гадоў жыцьця ён правёў у ГУЛАГу. Усе астатнія гады — ад нараджэньня ў 22-м — пражыў у Вільні, вучыўся тут у Беларускай Гімназіі, працаваў інжынэрам на заводзе, зьбіраў матэрыялы пра ўсё, што тычылася беларушчыны і роднага гораду.

Колькі згадваю свае гутаркі зь ім, ягонай галоўнай тэмай быў Віленскі беларускі музэй імя Івана Луцкевіча — своеасаблівая сьвятыня беларушчыны, створаная намаганьнямі Івана і Антона, які стаў дырэктарам музэя пасьля сьмерці брата. Ужо сёньня аднавіць гэты музэй у поўным аб'ёме немагчыма — ягоныя фонды раскіданыя па ўсім сьвеце. Але ў прынцыпе ідэя аднаўленьня заўсёды займала Лявона Луцкевіча і ён рабіў для гэтага захады.

"Бацька вельмі рупіўся, каб папаўняць фонды музэю, створанага ягоным братам Іванам, — успамінаў дзядзька Лявон. — Аднойчы ён прынес дадому вялізны, цяжкі двуручны меч. Гэта быў меч віленскага ката, якім той адсякаў галовы асуджаных на сьмерць. Бацька прыдбаў меч у знанага антыквара Рапапорта, крама якога знаходзілася, здаецца, на Віленскай вуліцы. Сёньня гэты меч экспануецца ў гісторыка-этнаграфічным музэі Літвы.

Радасны настрой бацькі ад такога каштоўнага набытку перадаўся й дзецям. Меч быў прынесены ў наш дзіцячы пакой. Ён быў заржавелы й брудны. Зараз зьявіліся анучы й бутэлька з нафтаю. (У той час страву гатавалі на "прымусах", таму нафта была ў кожнай гаспадыні пад рукою.) Мы ўтрох: бацька, брат Юрка ды я, — пачалі заўзята чысьціць ды адмываць шырокае, вострае з двух бакоў лязо мяча. Па ўсёй яго паверхні былі выгравіраваныя рысункі, якія паступова рабіліся відочнымі..."

Тэму Вільні Лявон Луцкевіч пераняў непасрэдна ад бацькі. Менавіта бацька Антон першы дасьледаваў гэтую праблему, напісаўшы, між іншым, два хрэстаматыйныя артыкулы "Вільня ў беларускай літаратуры" і яшчэ раней — у 18-м годзе — "Два цэнтры".

"За апошнія паўтрэцця году Вільня і Менск — гэтыя два галоўныя цэнтры Беларусі — жылі ў зусім розных варунках — як палітычных, так і агульных... Вільня за час вайны аказалася цэнтрам беларускай культурна-нацыянальнай працы, а Менск — палітычным цэнтрам.

Вільня ці Менск? Пытаньне, якое з нашых местаў мае быць цэнтрам Беларусі, нам даводзілася чуць ня раз... Але й сёньня, хоць літвіны аб'явілі Вільню за сталіцу незалежнай Літвы, даць адказ на гэтае пытаньне нялёгка: бо культурныя цэнтры не заўсёды разьвіваюцца там, дзе ёсьць цэнтар адміністрацыйны. І незалежна ад таго, ці між Беларусьсю і Літвой будзе праходзіць дзяржаўная мяжа, ці Вільня апынецца з аднаго ці з другога боку гэнае мяжы, гэты старадаўні цэнтар культурнага жыцьця ўсяго Беларуска-Літоўскага краю будзе заўсёды прыцягваць да сябе культурныя сілы ўсіх краёвых нацыянальнасьцяў, як архіў мінуўшчыны, як "пільны сьведка мінулых учынкаў". І калі думка беларускага палітычнага дзеяча зьвяртаецца сёньня да Менску, думкі вучоных плывуць да Вільні.

Вільня ці Менск? Гэтае пытаньне, бясспрэчна, разьвяжа толькі будучыня. Але здаецца, што разьвязка тут можа быць толькі кампрамісная: Вільня пры ўсялякіх варунках павінна абслугоўваць абодва народы, для якіх гэтае места было калыскай у часах нарадзін іх культуры".

Так пісаў у 18-м годзе Антон Луцкевіч. Ягоны сын Лявон успрыняў бацькавы падставовыя думкі, як уласную ідэалёгію.

Як аналітык Луцкевіч раскрыўся ў постсавецкі час, у самы бадай драматычны час для ягонае ідэалёгіі. На вачах дасьледчыка віленскай беларушчыны адбывалася адчужэньне ягонага гораду ад ягонае нацыі. Новая непразрыстая дзяржаўная мяжа прайшла ня дзе-небудзь, а па самім Луцкевічы, які, застаючыся карэнным віленчуком і беларускім патрыётам, мусіў стаць грамадзянінам іншай краіны. У Вільні пачалася афіцыйная палітыка літуанізацыі, а адначасова стваралася шмат буларускіх суполак. Паміж дзяржавай і беларускай грамадзкасьцю пачыналі складвацца дачыненьні зусім новага кшталту, як паміж органам большасьці і меншасьцю. Многія сьведамыя беларусы апынуліся перад пытаньнем, якое і пазначае драматызм часу. Яны мусілі рабіць выбар, якога рабіць не хацелі. Сэрца дзялілася паміж іх Бацькаўшчынай і родным горадам.

Абсалютна натуральна беларусу-віленчуку хацець, каб Вільня —горад Скарыны, Каліноўскага, "Нашай Нівы" — была зь Беларусяй, а не за візаваю мяжой. Гэтаксама як паляку або літоўцу. Хіба можна гэткае пачуцьцё назваць падступным або злачынным? Жывая чалавечая натура не ўспрымае алягізмаў палітычнае гульні, якая вымагае ад людзей зусім непатрэбнае, на здаровы розум, ахвяры. Калі працягваць ранейшую аналёгію, гэта тое самае, што аўстрыйскага геранталяга гвалтам прымусіць рабіць выбар паміж Аўстрыяй і геранталёгіяй. Становішча сапраўды незразумелае і драматычнае.

І вось у такім часе шмат хто ў Вільні пазіраў на Лявона Луцкевіча, які мусіў вытлумачыць становішча, прапанаваць нейкі новы кшталт дачыненьняў. У гэтым часе Луцкевіч піша некалькі артыкулаў, дзе разглядае праблему, намацвае балючую лінію кампрамісу:

"Хацелася б зьмякчыць міжнацыянальную напружанасьць, —адказваў ён у 92-м годзе ў інтэрвію для "НН", — таму што ў карысьць якой бы нацыі яна ні йшла, яна заўсёды будзе выклікаць варожасьць з боку ўсіх трох. Я маю на ўвазе: польскую стыхію, расейскую, беларускую й літоўскую — гэты чатырохкутнік мусіць сёньня неяк прыціскаць, каб не ствараць напружанасьці. Бо заўсёды тут так выходзіць. Літоўцы адбіваюцца ад уплываў трох нацыянальнасьцяў: польскай, расейскай і цяпер — зноў — беларускай (таму што адраджэньне беларускасьці ў Беларусі стварае як бы дадатковую нагрузку пры гэтым ціску). Палякі, тыя, што прытрымліваюцца рэваншысцкіх поглядаў (межаў 39-га году), адчуваюць, што супраць будуць літоўцы, расейцы, беларусы. Расейцы-вялікадзяржаўнікі... паколькі гэта быў Савецкі Саюз, значыць, Савецкая Расея, значыць, Расея, значыць, усе гэтыя — іншародцы, прыдуманыя нацыі, якія не павінны йснаваць. Так вось і атрымліваецца, што ў кожнага прэтэнзіі да ўсіх трох... Вільня ўвесь час фармавалася ў такіх умовах.

— Цяпер на мяжы поўным ходам ідзе ўзьвядзеньне "заслоны" з абодвух бакоў. Мабыць, хутка зьявяцца ўзараныя палосы...

— Так, гэта вельмі сумная зьява. Але мне здаецца, што гэта ўсё ж такі будзе пераходным этапам. Калі ўпарадкуюцца эканамічныя адносіны, дык, напэўна, на ўзроўні Эўропы ня будуць патрэбныя гэтыя палосы. Мяжа застанецца як дзяленьне чыста адміністрацыйнае, таму што недзе ж павінна скончацца адна ўлада, пачынацца другая, гэтаксама як паміж раёнамі, абласьцямі й г.д. Мы, памятаю, у ранейшыя часы часта на сваім старэнькім масквічыку, як яго называлі — бобіку, езьдзілі зь Вільні пад Менск. І заўсёды, калі пераяжджалі мяжу, то з добрай дарога рабілася адразу поўная выбаін, а мы крычалі: ура! мы пераехалі мяжу! Вось такое адчуваньне мяжы й павінна быць. Толькі дай Бог, каб дарога па сваёй якасьці з двух бакоў была аднолькава добрая".

У апошнія гады жыцьця дзядзька Лявон актыўна супрацоўнічаў з новымі літоўскімі ўладамі і адначасова вёў сваю штотыднёвую беларускую праграму на дзяржаўным радыё, шмат пісаў і публікаваў асьветніцкіх матэрыялаў. Ён цудоўна разумеў, што беларусам у Вільні сёньня пакідаецца адзіная пэрспэктыва —натуралізацыя. Як паўнамоцны прадстаўнік віленскіх беларусаў, ён мусіў зрабіць выбар за ўсіх і ён прызнаў новую Літву. Апраўданьнем такога выбару было тое, што прынамсі сёньня Літва дае віленскім беларусам магчымасьць разьвівацца, нават большую, чым у Беларусі. Ведаючы, як часта зьмяняліся ўлады ў родным горадзе на працягу толькі ягонага жыцьця, Лявон Луцкевіч зрабіў ***часовы*** выбар.

З уласьцівай яму сьціпласьцю дзядзька Лявон не прэтэндаваў на кваліфікацыю прафэсійнага дасьледчыка, а пакідаў сабе ролю энтузіяста, аматара, краязнаўцы. Гэта па-свойму характэрная зьява для вэтэранаў беларушчыны. Калі замест некалькіх грунтоўных падрыхтаваных да друку манаграфіяў яны пакідаюць пасьля сябе сотні публікацыяў у пэрыёдыцы пераважна папулярызатарскага кшталту і вялізныя асабістыя архівы.

Не пакінуў Лявон Луцкевіч і кнігі ўласных успамінаў. Хоць калі па каліву сабраць эпізоды ягонага жыцьця з публікатак у пэрыёдыцы і эфіры, зь лістоў ды чарнавых накідаў і злучыць гэта ўсё ў адно цэлае, такая кніга можа атрымацца. Як пераказ багатага на падзеі, уражаньні і досьвед жыцьця. Але гэтую працу будзе рабіць ужо нехта іншы.

Сяргей Дубавец

P.S. Пахавалі Дзядзьку Лявона на Літарацкай горцы на могілках Роса — побач з магіламі Антона і Івана Луцкевіча, непадалёк ад помнікаў Ядвігіна Ш., Ф.Аляхновіча, К.Сваяка, Л.Вітан-Дубейкаўскага, там, дзе магілы Сыракомлі, Лялевеля, Чурлёніса...

інфармацыйнае забеспячэнне
Belorusian Public Relations Association

ІНФАРМАТАР

БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Дай нам, Божа, такую ўладу, пры якой мы ня думалі б аб сабе, не прыніжалі іншых. Дазвалялі казаць праўду адзін аднаму, не лічылі б сябе бязгрэшнымі. Сымон Будны. Беларусь, XVI стагодзьдзе

Людзі, Беларусы, любіце свой край, мову, гісторыю, змагайцеся за іх, перамагайце! Няхай будзе вольнаю Беларусь! Ільлюк з-пад Менску

Запрашаем ліцьвінаў. Адродзім ВКЛ!!! 246012, Гомель, а/с 124. Алесь Чорны

Хлопчык Максім (4 гады) шукае беларускамоўных сяброў і сябровак для сумесных гульняў. Тэлефанаваць маме Юлі: 31-40-80

Запрашаем ліцьвінаў праварадыкальнага, манархічнага кірунку. Ліцьвіны, надышоў час гуртавацца! Адродзім ВКЛ!!! Не — псэўдаадраджэньню. Пішыце: 246012, Гомель, а/с 124, "OD" Алесь Чорны

Прыхільнікі беларускай рок-музыкі! Напішыце мне, калі ласка. 220037, Менск, зав. Сталетава, 12-1. Алена

Мне 20 гадоў. Шукаю сяброў. 220073, Менск, а/с 11 (пажаданае фота)

Гурт "Дзяньніца" сардэчна вітае спадара Алеся Пушкіна з уступленьнем у шлюб. Працуй і надалей на дабро і волю

Беларускамоўныя перадачы Радыё Ватыкан штодня а 6.20 ды а 20.00 на кароткіх хвалях

Польская мова: пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальныя заняткі. Тэл.: 221-24-81

Праца дома, апрацоўка буклетаў. 15$ у дзень. Капэрта са зв/а + купон б/а. 220073, Менск, а/с 26

Набуду кожнае беларускамоўнае выданьне на "лаціцы". Тэл.: 255-57-47



Спадару Балахонаву з Гомеля патэлефанаваць Віталю Саўчыку. Тэл.: 520433 ці 31884 наконт кніг

Маю на рэалізацыю кнігі "Менская вясна — 96", "Аршанская шляхта", Н.Арсеньнева "Яшчэ адна вясна...", С.Дубавец "Практыкаваньні" і інш. Тэл.: 310408 і 490888, Віталь

Малады некамэрцыйны рок-гурт "Інтэльмэдыя" шукае бас-гітарыста. Тэл.: 48-47-42, Руслан

Скрыпа! Нарэшце ты дарос, каб выдаць першую касэту "Жыгімонт Ваза". Віншуем! Твае фанаты

Матэматыка. Падрыхтоўка ў ВНУ. Дацэнт ВНУ. Тэл.: (017) 226-78-19

Vinšuju Pinsk i pinčukoŭ z 900-mi ŭhodkami viečna maładoha horada i zaprašaju ŭsich na hetaje śviata (6-7 vicraśnia). Juraś

Польская, чэская і славацкая мовы. Тэл.: 248-79-94, Алена

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

ВУЧОБА Ў ВІЛЬНІ

Віленскі пэдагагічны ўнівэрсытэт на конкурсных падставах набірае студэнтаў на 1 курс факультэта славістыкі на спэцыяльнасьці:

беларуская мова, літаратура і гісторыя культуры;
беларуская і расейская мовы і літаратуры;
беларуская і польская мовы і літаратуры.

Навучаньне платнае.
Форма навучаньня: дзённая (4 г.), завочная (5 г.).
Прыём дакумэнтаў з 25.08.1997 да 01.09.1997.

1. Атэстат (арыгінал) альбо дыплём вышэйшае школы (выпіска).
2. Мэдычная даведка.
3. 4 фотакарткі (3x4)
4. Пашпарт.
5. Выпіска з працоўнае кніжкі (калі ёсьць).

Уступны іспыт — тэсты па беларускай мове.
Па даведкі, калі ласка, зьвяртацца на адрас:

Катэдра беларусістыкі ВПУ
Studentų, 39-527, Vilnius 2034, Lietuva
Тэл. у Вільні: 8-0122-725801, факс:
8-0122-26-03-17. Тэл. у Менску: 8-017-259-85-63.

ДАКУМЭНТЫ ТБМ

Заява сакратарыяту ТБМ імя Ф.Скарыны

З боку прэзыдэнцкай адміністрацыі працягваецца наступ на асяродкі беларушчыны ў нашай краіне. Беларускамоўныя культурніцкія ўстановы і арганізацыі абкладзеныя вялікімі падаткамі, пазбаўленыя льготаў і дзяржаўных датацыяў; зараз у іх адбіраюцца памяшканьні. Ужо больш за месяц ідзе змаганьне за будынак адзінага ў Беларусі беларускамоўнага ліцэя. Рэальная пагроза навісла над Домам літаратара.

Сакратарыят ТБМ выказвае рашучы пратэст супраць гэтай акцыі і патрабуе адмены распараджэньня прэзыдэнта аб перадачы Дома літаратара Ўпраўленьню Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Дом літаратара — традыцыйны цэнтар нацыянальнай культуры ў самым высокім разуменьні гэтага слова. У ім пастаянна гучыць роднае мастацкае слова, праводзяцца юбілеі любімых пісьменьнікаў, прэм'еры фільмаў, сустрэчы са славутымі артыстамі і кампазытарамі. Ужо сёньня ён мае права стаць мэмарыяльным музэем, месцам выхаваньня павагі да самага сьвятога ў нашай гісторыі і сучаснасьці. Мы цалкам падтрымліваем беларускіх пісьменьнікаў у змаганьні за Дом літаратара, за паважлівыя адносіны дзяржавы да духоўнага набытку беларусаў.

Домам літаратара павінны распараджацца тыя, хто стварае славу і аўтарытэт нашай роднай Беларусі ў сьвеце.

Сакратарыят ТБМ

***

Тысячы беларусаў у імкненьні далучыцца да Сусьветнай культуры наведваюць іншыя краіны Сьвету, пакідаючы па-за ўвагай родную Беларусь зь яе нацыянальнымі багацьцямі, магчыма, ня менш зайздраснымі для іншых народаў. Менавіта таму цяжка ўбачыць вялікі натоўп людзей у беларускім Нясьвіжы альбо Міры. Там, сярод незвычайных помнікаў даўніны, ідзе звычайнае правінцыйнае жыцьцё, і наўрад ці хто-небудзь зь мясцовых жыхароў надае належную павагу месцу свайго нараджэньня, ганарыцца ім і пакланяецца яму.

9 жніўня Сьвіслацкая рада БНФ разам з ТБМ Ленінскага р-ну Менску арганізавалі падарожжа ў Мір і Нясьвіж, што надоўга застанецца ў памяці ўсіх яго ўдзельнікаў. Незабыўную экскурсію, якая, здавалася б, магла доўжыцца вечна, правёў беларускі археоляг і гісторык Алег Трусаў. Трыццаць дарослых людзей слухалі яго аповед так, быццам бы толькі зараз, каля Мірскага і Нясьвіскага замкаў, пад уплывам цудоўнай беларускай мовы, глыбокіх ведаў, апантанасьці і ўлюбёнасьці ў сваю справу чалавека для іх адкрыўся новы сьвет роднай гісторыі. Здольнасьць зацікавіць іншага дадзеная далёка ня кожнаму, таму хацелася б выказаць глыбокую падзяку спадару Алегу за тое "адкрыцьцё", якое засталося з кожным з нас пасьля падарожжа.

Шанаваньне гісторыі і павага да яе — гэта тое, без чаго чалавек ня можа па-сапраўднаму ўсьвядоміць сябе асобай. Нішто не ўзьнікае само сабою, таксама, як і не зьнікае бясьсьледна.

Вікторыя Леванкова

БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЧНЫ СЬПЕЎНІК



"Наша Ніва" супольна з камэрным мужчынскім хорам "Унія" працягвае новы праект — стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга "Беларускі патрыятычны сьпеўнік" і аднайменная аўдыёкасэта або CD у выкананьні хору "Унія".

БІТВА ПАД ВОРШАЙ

Музыка старабеларуская. Словы народныя.

Ой, ў нядзельку параненьку
Ўзыйшло сонейка хмарненька,
Ўзыйшло сонейка над борам
Па-над Сялецкім таборам.

А ў таборы трубы граюць,
Да нарады зазываюць.
Сталі рады адбываці,
Адкуль Воршу здабываці:

А ці з поля, а ці зь лесу,
А ці з рэчкі невялічкі?
Сталі хлопцы-пяцігорцы
Каля рэчкі на прыгорцы.

Гучаць разам з самапалаў,
Б'юць паўсоткаю з гарматаў.
Масква стала наракаці,
Места Воршу пакідаці.

А як з Воршы уцякалі,
Тую рэчку пракліналі:
"Бадай ты павысыхала,
Наша слава тут прапала..."

ПАДЗЯКА

Сакратарыят ТБМ імя Ф.Скарыны шчыра дзякуе "НН" за надрукаваньне нашага звароту ад дапамозе ТБМ і просіць выказаць праз газэту падзяку наступным суполкам ТБМ, установам і прыватным асобам, якія падтрымалі Таварыства ў гэты нялёгкі час, —

Генадзь Бураўкін — 1 млн. руб.
Алег Трусаў — 0,5 млн. руб.
Данат Яканюк — 0,5 млн. руб.
Станіслаў Багданкевіч — 450 тыс. руб.
Аляксей Каўка (Масква) — 100 тыс. рас. руб.
Таціяна Сеськова — 100 тыс. руб.
Аргкамітэт па Адраджэньню Грамады — 200 тыс. руб.
Горадня, РАА — 1 млн. 32 тыс. руб.
Гарадзенскі РАА — 230 тыс. руб.
Суполка "Тэлесябрына" — 3 млн. руб.,

а таксама сп.сп. Таціяне Процьцы, Віктару Івашкевічу, Аляксандру Дабравольскаму, Генадзю Карпенку, Я.Скварчэўскаму, М.Шкялёнку, А.Курысу, Міколу Мікалаеву.

Сакратарыят ТБМ

ПАЭЗІЯ СУПРАЦЬ РЭЖЫМУ

4 верасьня а шостай гадзіне вечара ў Менску каля помніка Янку Купалу адбудуцца паэтычныя чытаньні з удзелам паэта Славаміра Адамовіча. Аўтар прапануе слухачам новыя вершы, выканае арт-мэтафару "Нехта з чацьвертай палаты", адкажа на пытаньні. Арганізатарамі чытаньняў выступаюць ТБМ імя Ф.Скарыны і БСДП "Народная Грамада".

ГРАМАФОН.

Ніна Аксёнчык

НЯ ПАДАЙЦЕ ДУХАМ, БРАТЫ!

Там, дзе пануе гнусь
Камунафашысцкай сілы,
Помніце, ёсьць Беларусь —
Бог наш аж да магілы.

Ня падайце духам, браты,
Кіпіць у нас кроў Рагнеды.
Свой край, як абраз сьвяты,
Пранясем празь нягоды й беды.

Камунафашысцкай хлусьні
Мы супрацьпаставім сэрцы
З адвагі і дабрыні —
І нам празь вякі ня ўмерці.

Мы выйдзем на вольную шыр
Пад сонцам сьвятой Пагоні.
Нібы сакавіцкі вір,
Чакаюць нас верныя коні.

Ты волю сваю прымусь
Гатоваю быць да схваткі.
Кліч наш "Жыве Беларусь!"
Падхопяць празь век нашчадкі.

Ганна Атрошчанка

***

О, як ня хочацца мірыцца
З тым часам,
Калі белы сьнег,
Ля галавы будзе кружыцца...
Пакіне свой
Адметны сьлед.

***

Прыходзіць зноўку лета
Ва ўсёй сваёй красе,
Ды толькі фея гэта
Цяпло нам не нясе.

Вунь дожджычак ігрыва
Пацалаваў мурог,
І чэрвень, як на дзіва,
Зірне на мой парог.

Вадзянік Няміскі

ЛІСТ ДА БОГА

Магамэт, Ягова, Буда...
Божа, як жа тваё імя?
Пераблыталі ўсё да бруду —
Кураць ладан, званы зьвіняць,

Хрэсьцяць лоб і душу пустую,
А ў галовах ізноў лухта:
То басэйны яны будуюць,
А то храм самаго Хрыста.

Рапартуюць, як быццам з БАМа.
Бач! Ужо пачапілі крыж.
Атэісты будуюць храмы.
Божа мілы, навошта сьпіш?!

Нешта ты пераблытаў, Божа,
І ня грымнуў Ты перуном,
Калі тых прайдзісьветаў рожы
Табуном папаўзьлі ў твой дом.

Запаскудзілі храм пачвары,
Неадмытыя ад крыві.
Цьвердалобыя камісары
Б'юць ілбом алтарам Тваім.

То з тэатра абсурду сцэна —
Камуніст у царкву пралез,
На прагнутых стаіць каленях
На плятформе КПСС.

Звар'яцеў атэіст шалёны,
Так падобны да пацука,
Абразам тваім б'е паклоны,
Як калісьці Бюро ЦК.

Сьвятары ў залачоным храме
Адпускаюць яму грахі,
Быццам танную сечку ў краме —
Даражэй за тавар мяхі.

Не! Маліцца я так ня буду
І ў храм не пайду да іх,
Калі нават ў царкве Іуды,
То я самы сьвяты з усіх.

Выбачай, памянуў Іуду.
Той хоць сорам тады адчуў.
Тут такога ня будзе цуду,
І таму не малюся — крычу!

Калі ганьбу такую бачу,
Разумею, што трэба ім:
Хвалі зьдзеку, крыві і плачу,
Над Чачнёю кадзілам дым.

Выюць бомбы і гінуць дзеткі,
І зямля на ўвесь сьвет крычыць,
А галоўны сьвятар Алексій
Як Вялікі Нямы маўчыць.

Ад людзей "зачышчаюць" вёскі.
Над зямлёю то "Смерч", то "Град".
Мо нясе запавет твой Боскі
Ўсім народам "старэйшы брат"?

Двухгаловы арол драпежны
Зноў палез са свайго гнязда,
Каб зручней было шырыць межы
У хаўрусьнікі ўзяў Хрыста.

Не дабраў шчэ ад Краю дані,
І каб вольнасьць кругом здушыць,
Пачалі яго тыя здані
Перахросным агнём хрысьціць.

Забіваюць з Тваёй ухвалы,
Бо маўчыш праз сваіх папоў.
Ці табе ўсё пакут замала
І на могільніках крыжоў?

Не хапіла навук Аўгана —
Ледзь хаўтур тых збылася Русь,
Лезе, быццам за півам п'яны,
То ў Чачню, то ў Беларусь.

І няздольна яна спыніцца,
Ажно пыл закурэў слупом.
Калі дурань пачаў маліцца,
Ен падлогу праб'е ілбом.

Нешта ў сьвеце тваім няспраўна.
Божа мілы, навошта сьпіш?!
Не дазволь, каб арол "двуглавый"
Кіпцюрамі паскудзіў крыж.

.....

Крышна, Яхвэ, Алах, Ісусе...
Божа, колькі ў цябе імён!
Пакараньне нам за спакусу
Або, можа, за Бабілён?

Ты ня шлі на мяне праклёны,
І ня злуйся за тое, што
Амаль век пражыў нехрышчоным,
А цяпер і запозна мо...

Усевалад Гарачка

***

Гляджу трохмерным поглядам
На плошчу, поўную люду,
Трохмерны вецер гайдае
Трохмернай дзяржавы сьцягі.

Завуць трохмерныя крыкі
Вярнуць трохмернасьць свабоды.
Гляджу ў трохмерныя твары...
І раптам — усьмешка твая.

***

Сьмейся і плач. Жыві.
Што табе яшчэ трэба?

Радасна — жоўтае лісьце,
Сумна — дык шэрае неба.

Хочаш схаваць свой плач,
Чыстага сьмеху срэбра?

Сумна — дык жоўтае лісьце,
Радасна — шэрае неба.

Сьмейся і плач. Жыві.
Ну, а памрэш калісьці:

Сумна — дык шэрае неба,
Радасна — жоўтае лісьце.

ЭСКІЗ

Жаўцеюць вербы праз туман.
І боль, і плач — самападман
Над сьветам болю і нястач —
Па болю боль, па плачы плач.

Яўген Гучок

***

Тады наш край свабодным будзе,
Калі ў сурдуце у яго
Братамі будуць мужыкі і шляхта.

***

Яшчэ й тады ратуецца Радзіма,
Калі яна й за межамі Зямлі,
Калі яна яшчэ і ў Бога.

***

І шыбеніца ваша
Мяне
Не запражэ.

***

Нас, беларусаў, многа,
Ды шкада,
Што на Чачню зусім мы не падобны.

***

Нат спадцішка любіць свабоду
Тут многія
Ужо ня здольны.

***

На што падняць такі народ,
Калі ён галавы да зор
Не падымае?

***

Нібы грыбы сялянская дзятва,
Параненых у лесе інсургентаў
Імпэрцы і прысьпешнікі шукаюць.

***

Былі сяляне ўдзячны Кастусю,
Што "даў" магчымасьць
Зарабіць на інсургентах.

***

Як буракі ў карыце вось ляжаць,
Такі ж чакае лёс
І беларусаў.

***

Маўчыць Эўропа, Азія маўчыць:
Злучае шыбеніца іх...
І я павіс між імі.

Андрэй Захаранка

НА РАССТАНЬНЕ

Я руку тваю пацісну,
Шчыры погляд зьберагу,
Застануся непахісны
На пэроне убаку.

І калі цягнік зялёны
Увап'ецца ў далячынь,
І за ім віхор шалёны
Скокне зь ветраных вышынь,

То тады ў душы пачую
Неадольную тугу
І пакутліва адчую,
Што усьлед табе бягу.

А калі усё ж заціхне
Грукат колаў, я сыйду
І па горадзе прыціхлым
Бессэнсоўна набрыду.

Хай пустынных вуліц подых
Сэрца цішай ахіне
І празрыстай прахалодай
Неспадзеўкі абліе.

І ў душы навее зьзяньне,
І пакуту скіне з плеч.
І народзіцца чаканьне
Непаўторных нашых стрэч.

Андрэй Крывіч

НА СЭНАЦКІМ ПЛЯЦЫ...

На Сэнацкім пляцы
сабраліся хлопцы,
супраць тыраніі
абвясьціўшы шыхт.

Каб мець перамогу
у крывавай бойцы,
Скасаваць прыгоны,
зямлі трохі даць.

Толькі ўсё дарэмна,
Толькі ўсё бяз сэнсу.
Пастралялі хлопцаў,
Кінулі ў турму.

Шмат каго зь іх вольных,
Вольных, незалежных
На Каўказ пагналі —
Весьці там вайну.

З тыраніяй разам
лепшыя з расейцаў.
Бо, кто ты ні быў бы —
Кананір ці драб,

Ды калі ваюеш
і народ рабуеш —
Ты ўжо ня вольны,
А таксама РАБ.

Źmitro Kudłaty

VARJAT

Što ja varjat, usie tut znajuć.
Na hołaŭ časta kpinaŭ hrad;
Dy honiać časta, časam łajuć,
Bo ja varjat! varjat!! varjat!!!

Hladziać varoža i padazrona,
By skraŭ ja bulbu ź niečych hrad;
Dy kruciać palcami la skroniaŭ:
"Smatrycia, ludzi, vot varjat!"

Tamu varjat? Skažu vam "česna" —
Trasiancy ja nia duža rad,
A pa-rasiejsku — choć ty trešni,
Ani pramoŭlu, ja ž varjat!

Kažu paŭsiul, užniaŭšy hołaŭ
Pa-biełarusku, akurat!
Hladzicie ž, šmiejciesia, žyvioły,
Što voš taki ja vam varjat!

Tak, ja varjat. Plavać chacieŭ ja
Na tych vysokich Mam dy Tat,
Ja jdu praz pnieŭje i karčeŭje,
Ja jdu da praŭdy, ja ž varjat.

Nia maju roŭnaje darohi,
Ja stanu nat pad vadaspad;
Nie abivaju ja parohi
Śmiardziučym złydniam, bo varjat.

Da tych pahanly nie chavaju,
Chto liža maskaloŭski zad;
Bo ja chranična nie ŭsprymaju
Ludziej "narmalnych", ja ž varjat!

Mianie ŭ varjacki dom zabrali...
Pryvyk zdajecca ŭžo da krat.
Ale nadzieju šče nia skrali;
Ja byŭ dy jošć taki ž varjat!

***

Zołak. Śvitaje imkliva.
Šery ŭščynajecca dzień.
Kvoły zhasaje vahmień
U sercy ziamli pałachliva.

Dzień. Dy hamonak nia čutna,
Tolki adno dalačyń
Stohnie, dy nizka hurčyc
Viecier kryvavy, atrutny.

Viečar. Sutońnie ŭciskaje
Žach u abdojmy svaje;
Mocy tryvać nie staje...
Serca pavoli ŭcichaje.

Noč... Ź nieba łava rakoju;
Mory, vaziory kipiać;
Vieży dy zamki rypiać
Pad sakrušalnaj rukoju...

Rańnie... Acichłaja vuściš...
Stynie čyrvonaja łava.
Znikła žyćcio... Heta java,
Viečnaja, miortvaja hustaš.

Марыля Лагодзіч

***

Ці варта шкадаваць сваю душу,
Калі зламаная каханых вуснаў квадра,
Калі ня мець з-за кратаў свайго заўтра
І да прадоньня йсьці цераз мяжу,
Ці варта шкадаваць сваю душу?

Ці варта ратаваць сябе ад сну,
Калі нам выпадае Рай і Пекла,
Калі начны нябыт ды золак сьветлы
Караюць за дабро і за ману,
Ці варта ратаваць сябе ад сну?

Ці варта марыць пра бялюткі сьнег,
Калі ў душы снуюць брыдот прывіды,
Калі бісься чыстага блакіту,
Калі пужае твой няшчыры сьмех,
Ці варта марыць пра бялюткі сьнег?

Ці варта слухаць сэрца крыгаход,
Калі ліецца на стале гарбата
Адчайнай думкі і калючай здрады,
Калі трапляеш ў болю сумны ход,
Ці варта слухаць сэрца крыгаход?

Ці варта плакаць па былой вясьне,
Калі у браму б'юць начныя цені,
Калі зіма упала на калені, —
Цалуе рукі вазы у вакне,
Ці варта плакаць па былой вясьне?

Ці варта?..

Зьміцер Літвін

ЗЛОСНЫЯ ДУМКІ ГАНІ АД СЯБЕ...

Злосныя думкі гані ад сябе,
Не панукайся ты чорным хмарам,
Дапамажы Радзіме ў бядзе
Супрацьстаяць варожым ударам.
Родную мову ты не згубі,
Мову, што продкі на ёй размаўлялі.
Родныя словы, як караблі,
Вольна плывуць што ў акіяне.
Не дазваляй сваю душу згубіць
Сярод абыякавасьці балота,
Шмат кілямэтраў трэба прайсьці.
Сваё каб жыцьцё не было дармотай.
Даруй мне ты, Божа, калі што ня так,
Дапамажы ў надзею паверыць,
У тое, што спыніцца хутка бардак,
Што спаднадзейсьнілі ліхадзеі.

Алесь Менскі

***

Мая краіна на поўначы
для тых, хто жыве на поўдні,
мая краіна ўнізе
для тых, хто жыве ўверсе.
Мая краіна — як месячык
для тых, хто жыве на поўні,
для тых, хто жыве ў канюшыне,
краіна мая ў верасе.
Мой край — гэта бохан хлеба,
з усіх бакоў паламаны,
як быццам глыбокае неба
зь сівымі шматкамі аблокаў
Мой край — як дзірван вясновы,
дашчэнту чужынцам стаптаны,
нібыта жаданая зорка,
што так недасяжна далёка.
Народ мой — чароды птушак,
што ў вырай шляхоў шукаюць,
магутная плынь рачная,
якую ў ставы загналі.
Народ мой — як Кветка-Папараць,
чыёй зьявы, як шчасьця чакаюць,
пра якую скрозь процьму стагодзьдзяў
валуны пад дубамі шапталі.

Агата Нагорная

***

Нашай Ніве

Ты — пякучы глыток гарбаты,
Ты — ільдзінка ў сьпякотны дзень,
Ты — прамень, які точыць краты,
і пухнатай таполі цень,

сакавітая мая трускаўка
і пяшчотная сон-трава,
слоўца любае, беларускае,
яшчэ рана цябе хаваць!

Адпачні, чужамоўны тубылец,
бо заўчасна капаеш дол.
Адпачні. Гэта праца ня крыліць.
Лепш паслухай — сьмяецца анёл:

Ен трымае жывое слова,
не убітае ў сьмецьце й бруд,
у казённы пыл пратаколаў,
што выносілі слову прысуд.

Забіванае — не забітае,
здратаванае — а жыве,
бо рупліўцамі не забытае,
што ня здрадзілі самі сабе,

не дазволілі слову памерці
на адвечна нашай зямлі,
і прытулак далі ў сэрцы,
загадаўшы: "Заўсёды жыві!"

***

Ты мне кажаш, што трэба ехаць
У краіну, дзе лёгка, утульна,
Дзе гучыць па-іншаму рэха,
Дзе ня ведаюць слова "бульба",

Дзе нішто нам не нагадае
Пра нязбыўнасьць Вялікай Мары,
Дзе я распушчуся, сканаю,
Зьнікну ў небе маленькай хмарай,

Дзе душа паціху загіне,
Дзе зраблюся бяз стрыжня алоўкам.
Тут я ўсё ж такі гаспадыня.
Там — я вечная пакаёўка,

Там я буду глытаць паветра
І шукаць у эфіры "Свабоды",
Галасы беларусаў сьвету
Невядома зь якой нагоды...

Я свой дом наўрад ці пакіну,
Бо у сьценах пакуль халодных
Майго сэрца жывога цагліна,
І таму ён адзіны, родны.

***

Зялёная трава і вербалоз
Зямлі схавалі зморшчыны і шрамы.
Ізноў прынесла лета сінь нябёс,
Суніцы і вясёлкавыя брамы.

Зьвініць, квітнее, ўецца, зіхаціць
і жыць сьпяшаецца усё наўкола,
Ўздоўж неба сонца яркае бяжыць,
Нібы купальскае палаючае кола...

Сьпякота. І паветра, нібы дым,
А смагу наталяюць успаміны:
Зіма, сьнег белы, а на ім —
Пунсовай стужкай кроплі-журавіны.

***

Я вылузваюся з лупін
Абыякавасьці шэрай
Ў асяродку белых купін
Даравальнае паперы,
Адчыняю куфар думак
І выпростваю пачуцьці —
Я шукаю свой прытулак
У жыцьцёвай каламуці,
Зноў вандрую у бязьмежжы
І, забыўшыся на сьлёзы,
Я пішу лісты і вершы,
А ня скаргі і даносы.
І зусім гэта ня дзіва,
Не прыкмета злога лёсу,
А праява супраціву
Жорсткасьці жыцьцёвай прозы.

Сяргей Патаранскі

ЕЗАВІТАЎ

Марна спадзявацца на народ.
Славяне — зброд,
а маё племя — гной
пад іх нагамі.
У бруднай жыжы луж
расхрыстаны спакой
мінулай велічы разьбіты батагамі.

Што зробіш ты цяпер,
загнаны ў клетку зьвер,
уласнай годнасьці, адбыўшыхся абставін.
Я добра ведаю, што ты паранен
лязом ілюзій. Што рабіць цяпер?

Наканавана нам пад куль драпежны сьвіст
памерці ў цэнтры злых падзеяў.
Такі наіўны, мой сьвяты капрыз,
бывай навек. Няхай памруць надзеі.

Сяргей Прылуцкі

***

Красавіцкі сьнег...
Зіма взлюмам йскрыстым
Нечакана, раптоўна
Ахапіла зямлю.

Пад тым покрывам чыстым -
Сьцюжай, сьмерцю пранятым -
Штосьці дыхае ўпарта
Й цягнецца ў вышыню.

Упарта цягнецца ўверх,
Да далёкага Сонца,
Каб там, там, на паверхні,
Адчуць цеплыню,

Каб убачыць бясконцасьць
Невядомай прасторы,
Каб адчуць й усьвядоміць
Сутнасьць й ролю сваю.

Прагне быць сярод многіх -
І падобных, і розных.
Гэта штосьці
Сабой хоча быць!

Прагне сініх нябёсаў
І паўднёвага ветру...
Прагне жыць,
Усяго толькі жыць!

Браніслаў Пяткевіч

ПАЭТ

У паэта ёсьць свой арэол,
Дзе пануе разумны плебей,
Там арлы не паганяць на дол,
Дзе гняздо сваё зьвіў верабей.
Ен ня ведае дробных пакут,
Па надзённага хлеба турбот,
І навукі яго інстытут
У падзеньні — высокі ўзьлёт.
Не кляне ён нягоду й лёс,
Бо стварае ўласны свой сьвет,
Дзе ў рыпе паходных калёс
Чуе песьню далёкіх плянэт.
Валадар яго сонечны час,
Не бянтэжыць жыцьця мішура,
Ен пэгаса вядзе на папас,
Дзе ніколі ня вяне трава.
Не пазнаць: ці ён добра жыве,
Бо на выгляд такі, як усе.
Бруду думак няма ў галаве,
Жабраку на руку паднясе.
І на крытыку ён не плюе,
Што на лейцах трымае аброць,
Ен шунуе, як матку, яе,
Як сваю неад'емную плоць.
Усяму ёсьць пачатак, канец,
Бо такі ў прыроды закон,
А паэт — гэта вечны жылец,
Перад ім у бясьсільлі палон.

Пятро Раманёнак

***

Прыемна ў летняй прахалодзе
ляжаць у ценю пад гарой
і марыць у ляной зьнямозе,
што некалі ты па дарозе,
па стромкай, зьвілістай, цяжкой
дакрочыш да вяршыні той,
адкуль адкрыюцца абсягі
і яснасьць растуманіць зрок.
Ды толькі ты, у снах бадзяга,
ў душэўных высілках з адвагай
зрабіць павінен першы крок,
ці... на другі кульнуцца бок.

Тацяна Ульянычава

ПРЫПАВЕСЬЦЬ ПРА БЛУДНАГА СЫНА

(Новы запавет ад Лукі 15.11-24)

Час быў такі.
Аднойчы сын малодшы
Патрабаваў ад бацькі
Падзелу іх насьледзтва часткі.
І бацька падзяліў паміж сынамі
Маёмасьць, на якую зарабляў між снамі.
І тыдня не прайшло, а сын малодшы
Забраў усе грошы, вандраваць пайшоўшы.
Тым грошам ён цаны ня ведаў
І як багач заўсёды сьнедаў.
А грошы выцеклі між пальцаў, як вада,
Не засталося ад багацьця і сьляда.
Пайшоў блукаць ён жабраком
І не цураўся есьць сьвінячы корм,
Калі дазволіць яму хто.
Да бацькі сорамна вяртацца,
Ен не згадзіцца зноў яднацца...
Аднойчы ўсё ж вярнуўся ён дахаты:
"Прабач, мой бацька, вінаваты".
І бацька хлопца падтрымаў,
З кален яго падняў,
І сынам зноў назваў:
"Згубіў я сына аднаго,
Але знайшоў ізноў.
Мне сёньня Бог вярнуў яго,
І маю зноў я двух сыноў".

Юры Чарнякевіч

МОЙ КРАЙ

Струмень адносіць воды хутка.
Над поплавам лётае бусел.
Схаваўшысь ў траве, незабудкай
Квітнее абшар Беларусі.

У сьветлай, блакітнай вадзе
Купаецца воблачны трус.
Куды ён ад нас паплыве?
Няўжо не застанецца тут?

А жальбы халодных сузор'яў
Ў касьмічных прасторах зьнікаюць,
Патрэбнае, важкае слова
Стаміўшыся, сэнс набывае.

Барвяныя дрэвы гамоняць,
Курган безназоўны маўчыць
Ва ўсім — безнадзейная стома,
І хочацца ўсім адпачыць.

А хмаркі зь вясёлкамі граюць
На гусьлях дажджу і праменьня
Аб любым паветры сьпяваюць
Бяз клопату, без разуменьня..

Струмень адносіць воды хутка.
Над поплавам лётае бусел.
Скаваўшысь ў траве, незабудкай
Квітнее абшар Беларусі!

Алёна Шарэпа-Лапіцкая

***

Запяю над хваляй сваю песьню,
Як вятры сьпяваюць дзень-дзяньскі,
Аб зарніцах сьветлавокіх весьніх,
Каб разьвеяць жоўтыя пяскі!

Бо пяскі дарожкі засыпаюць,
Дзе ўспамін застаўся дарагі,
Толькі Чайкі белыя пазнаюць,
Дзе згубілісь нашыя шляхі...

І пара ля прыстані кіпучай
Звонка Чайку Белую спытаць:
— Над якою
Хваляю зыбучай
Можна зноў
Каханага
спаткаць?

Ірэна Янчанка

***

Я не люблю чужых загадаў
Ды не люблю мазгоў прамыўку.
Бывае вельмі крыўдна падаць
Ці атрымоўваць па загрыўку.

Я не люблю людзей бяз густу,
Мне цяжка зь імі, непрыемна.
Я не люблю яшчэ распусту
Ды калі плачуцца дарэмна.

Я не гляджу саўковых фільмаў
Ды не выношу гладкіх думак.
Яны абрыдлі мне зь дзяцінства,
Як "родны" ментаў пастарунак.

Ня слухаю я наш брахальнік,
Бо не люблю лапшу на вушы.
Цураюся "айцоў народных",
Іх заклікаў — адкрыць ўсім душы.

Адкрыць душу было б магчыма,
Калі б туды радзей плявалі
Ды болей дбалі пра сумленьне
І працу розуму давалі.

Хаця ўсё ж ёсьць такія рэчы,
Што могуць любымі назвацца.
І нават рукі ёсьць і плечы,
Што дапамогуць не зламацца.

Бо я люблю сваю Радзіму,
Ды не зьбіраюся скарацца.
Лічу яе я тым адзіным,
За што ня грэх і пазмагацца.

+++

Вітаю я празрысты ранак
І жаўрукоў ў нябёсах звон,
Але выходжу я на ганак
Маёй Зямлі і чую стогн.

Яна мне кажа: "Ты, дачушка,
Павінна хмары адвясьці.
Хадзі сюды, хачу на вушка
Табе мой лёс распавясьці.

Як ганьбілі мяне чужынцы,
Як я піла гаркую кроў
І іх, і тых, хто найбліжэй мне —
Маіх дачок, маіх сыноў.

Але ня плач, мая ты доню,
Ўсё ж людзі помняць з тых часоў
Наш сьветлы сьцяг, маю Пагоню,
Паганскіх стомленых багоў.

Ды й сэрцы вашы не змарнелі,
Мой зьніч у іх яшчэ гарыць.
Таму, што б ворагі ня мелі
Зрабіць нам — а мы будзем жыць!

Мы вечна вольныя, бо сэрцы
Ў палон нікому не забраць.
Іх можна на шматкі разьдзерці,
але ў пакор — не закаваць.

Я ганаруся вамі, дзеткі,
Пакуль няшмат вас. Але зноў
Вас хутка будзе — нібы кветак
У маім полі, васількоў.

І я квітнець ды вамі буду,
Нікому болей не скарусь
Мяне ніхто з вас не забудзе
Бо ўсім імя нам — Беларусь".

НЕ ПАМІРАЙМА!

творы з-за кратаў

Публікацыя Язэпа Янушкевіча ("НН", 21 красавіка 1997 г.), акрамя вострых эстэтычных перажыванняў, выклікае пэўныя "праблемныя" роздумы. Творца за кратамі — вось яшчэ тэма, праблема беларускага літаратурнага працэсу і, шырэй, нашага нацыянальнага супраціву, нашае трывучасьці. Мяркую, і адпаведную анталёгію (тэкстаў) сустрэў бы з удзячнасьцю і звычайны чытач, і дасьледчык. Сапраўды, чаму б не аб'яднаць пад адной вокладкай адпаведныя творы Кастуся Каліноўскага, Якуба Коласа, Максіма Танка, Тодара Лебяды, Ларыса Геніюш і г.д. У гэтым высокім радзе пакутнікаў-змагароў беларускіх на месцы была б і постаць Уладзімера Дубоўкі. Можа ня ўсе паклоньнікі аўтара несамавітае "Шыпшыны" (О, Беларусь, мая шыпшына...) ведаюць, што зьбеларушчаны ім байранаўскі "Шыльёнскі вязень" пачынаў сваё шэсьце па нашай краіне з... камэры Пішчалаўскага замку ў Менску, скуль на зыходзе вясны 1931 году пачаліся драматычныя й трагічныя шляхі-ростані нашых славутых "нацдэмаў". Да таго ж Муза за кратамі праймалася ня толькі перакладамі. Мікалай Улашчык — пабратым Паэта па вязьніцтву й выгнаньніцтву — на самым пачатку 1986 г. пераказаў мне разам зь іншымі старонкамі свайго машынапісу (рыхтавалася для ЛІМа гутарка з Гісторыкам пад Ягоныя 80-я ўгодкі) асобны невялічкі тэкст (захоўваецца ў маім архіве). Вось ягоны зьмест:

"Дубоўка Ўладзімер
31 траўня 1931 году

Шумеце, шумеце, высокія сосны,
Пілуйце вы дошкі адна у адну,
Зьбянтэжаны вораг шукае ратунку,
Сабе ўжо самому рыхтуе труну".

Далей, унізе, пад саменькай страфой — словы Мікалая Мікалаевіча: "Усіх прыблізна пяць такіх разьдзелаў". Дарэчы, на тым самым аркушыку, на адвароце, ім жа, але ўжо ад рукі "прасыгналена" яшчэ адна паэтычная, зь нязнаных, дэталь:

"Далі шэсьць паветаў,
Ну, дзякуй за гэта.
Янка Купала".

Тады ж са словаў М.М. удакладніўся час паўстаньня Купалавых радкоў: 1922-1923 год (абнародваныя ў нашым зборніку "Жывом!", стар. 144).

Аднак — пра паэта-вязьня, аднаго з прыпушчальных аўтараў апублікаванага Янушкевічам верша, правільней, пратографа гэтага твору. Цікавымі меркаваньнямі на закранутую тэму падзяліўся са мною, гады тры таму назад, у сваім лісьце Максім Лужанін. Зьвяртаўся я да шаноўнага Парнасьніка-"узвышэнцы" ў сувязі з росшукамі зьвестак пра Аляксандра Мікульчыка (1882-1918?), аўтара славутага, у свой час сапраўды агульнанароднага паводле ўзнаньня, папулярнасьці вершапесьні "Беларуская марсэльеза" (у Анталёгіі беларускай паэзіі, т. 1. — Менск, 1993, стар. 484 памылкова залічаны на творчы рахунак Ул.Галубка), але аб ім спэцыяльна — іншым разам. Дак вось, Алесь Амвросевіч, сярод іншага, закрануў тады, у лісьце і прозьвішча свайго некалішняга калегі па "Ўзвышшы", — спадзяюся ласкава, што дзядзька Максім ня будзе мець жалю за цытаваньне некалькіх радкоў зь ягонага ліста:

" ... Варыянт "Марсэльезы" пачуў ад рабочага "Звязды". Сядзелі ў адной камэры "амэрыканкі"; яго прозьвішча не называю, сярод рэабілітаваных не сустракалася. Вось што запомнілася:

Ад веку мы спалі і нас разбудзілі,
Сказалі, што трэба рабіць,
Ды ў с... нам далі, ізноў палажылі,
Каб перад дарогай спачыць.
Пагоняць на шахты, у пушчы, на Мурман,
Каб з нашых касьцей выкладалася гаць,
Пагоняць этапам праз царскія турмы,
Якія хацелі зь зямлёю зраўняць.
Зраўняць не зраўнялі, а новых прыдбалі..."

"І ўсё! — працягваў аўтар ліста. — Ці сам забыў, ці не даказалі; намякнуў жа на аўтарства Дубоўкі. А ён на маё некарэктнае запытаньне замахаў рукамі: "ня ведаю, ня чуў ніколі". Гэта падказала здагадку: можа сапраўды ён перарабіў, што гэтак асьцерагаецца і адмаўляецца. Падставаў асьцерагацца ўжо не было: атрымаў кватэру ў Маскве, шырока друкаваўся, меў павагу ад людзей..."

Ітак, зьбірайма раскіданыя камяні нашага роспачу і гневу. А ўрэшце, зьбіраньне ўжо распачата. "Гарт" — дзіўная, вострая кніга беларускага змаганьня. Пойдам далей...

Аляксей Каўка,
Масква

ПАЎНАМОЦТВЫ РАДЫ БНР

Якія дзяржавы прызналі БНР і да чаго магло б абавязваць іх тое іхнае прызнаньне сёньня?

Віталь С., Менск

Пра паўнамоцтвы і легітымнасьць сёньняшняй Рады створанае ў 1918 годзе Беларускае Народнае Рэспублікі "Нашай Ніве" распавёў гісторык Анатоль Сідарэвіч:

Пасьля ўтварэньня БНР яе прызналі дэ-факта ці дэ-юрэ наступныя краіны: Арменія, Аўстрыя, Грузія, Латвія, Літва, Польшча, Чэхаславаччына, Фінляндыя, Турцыя, Украіна, Эстонія.

Меўся дыпляматычны пашпарт БНР, працавалі дыпкур'еры.

У 1919-20 у Латвіі, Літве, Эстоніі, Чэхаславаччыне, Баўгарыі, Фінляндыі, Турцыі працавалі дыпляматычныя і вайскова-дыпляматычныя місіі, консульствы і прадстаўніцтвы БНР.

Пэўны час (1921-1922) суб'ектам міжнароднага права была БССР. Яе прызнавала Нямеччына. Калі быў створаны СССР, Нямеччына — адзіная з заходніх дзяржаваў — адразу ж прызнала яго, бальшавіцкі ўрад. Прызнаньне БССР, РСФСР, а потым і СССР аўтаматычна вяло да таго, что эміграцыйны ўрад БНР страчваў прызнаньне і падтрымку Латвіі, Чэхаславаччыны ды іншых дзяржаваў.

Пасьля Другой сусьветнай вайны, калі ў Амэрыку перасялілася другая хваля беларускай палітычнай эміграцыі, Рада БНР ды беларускія арганізацыі наладзілі адносіны з кангрэсам ЗША, Дзяржаўным дэпартамэнтам і ўладамі паасобных штатаў.

Пасьля развалу СССР эміграцыйныя ўрады Літвы, Украіны ды іншых краінаў здалі свае паўнамоцтвы новым урадам у мэтраполіях. Адрозна ад іх Рада БНР не прызнала ўрад Кебіча, хоць захады дзеля гэтага менскія афіцыйныя асобы і рабілі (асабліва перад І зьездам беларусаў сьвету ў 1993 г.). Дзяржаўная пячатка застаецца ў Прэзыдэнта Рады БНР.

Сёньняшняе міжнароднае прызнаньне Ўраду БНР адзіным легітымным азначала б аўтаматычнае скасаваньне прызнаньня сёньняшняй Рэспублікі Беларусь. На Захадзе чуюцца галасы пра тое, што Рада БНР і сёньня цалкам легітымны орган улады. Пра гэта, у прыватнасьці, заявіў першы амбасадар Злучаных Штатаў у Беларусі Дэвід Суорц. Справа прызнаньня Рады БНР суб'ектам міжнароднага права залежыць ад палітыкі ўладаў Рэспублікі Беларусь, ад амаладжэньня ды ініцыятыўнасьці самой Рады.

ЧЫТАЙМА МАКСІМА ГАРЭЦКАГА, МІХАІЛА ГАНЧАРЫКА І "БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ"!

У "НН" 28 ліпеня 1997 г. (№25-26) Андранік Антанян надрукаваў падборку публіцыстычных тэкстаў Максіма Гарэцкага, што не ўвайшлі ў Дадатковы том збору твораў пісьменьніка (Менск, 1990).

Цалкам падтрымліваючы шляхетныя намеры газэты і яе аўтара, мушу зазначыць, што крыптанім М.Г-к належыць не Максіму Гарэцкаму, а Міхаілу Ганчарыку (1899-1986), вучонаму-біёлягу, члену-карэспандэнту АН Беларусі, пісьменьніку. І адпаведна зьмешчаны ў "Нашай Ніве" артыкул "Нацыянальна-культурная праца Горы-Горацкіх вучняў-беларусаў" упершыню надрукаваны ў газэце "Беларусь" 6 лістапада 1919 г. пад крыптанімам М.Г-к, таксама належыць не Максіму Гарэцкаму, а Міхаілу Ганчарыку. Прынамсі, такія зьвесткі прыведзеныя ў 2-м томе шасьцітомнага біябібліяграфічнага слоўніка "Беларускія пісьменьнікі", дзе пра Міхаіла Ганчарыка зьмешчаныя біяграфічная даведка і бібліяграфія.

На жаль, у публікацыі А.Антаняна не ўказаны і першадрук артыкула "Падбухторываньне". Як сьведчыць біябібліяграфічны слоўнік, Максім Гарэцкі зьмясьціў артыкул "Падбухторваньне" ў газэце "Беларускія ведамасьці" 25 сьнежня 1921 г. У слоўніку таксама ўлічаныя перадрукаваныя "Нашай Нівай" артыкулы Максіма Гарэцкага "Аб урадах на Беларусі і ўрадзе Беларускае Народнае Рэспублікі", "Беларусы і жыды". Вядома, у шасьцітомным слоўніку процьма пропускаў, памылак і недаглядаў. У нашым выпадку "Падбухторываньне" "ператварылася" ў "Падбухторваньне", ня ўлічаныя артыкулы "Аб справах дня" і "Гдзе ёсьць беларусы або нашы маленькія жаданьні".

Тым ня менш, выдадзены ў 1992-95 г. біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменьнікі" — унікальны дапаможнік, настольная кніга кожнага, хто вывучае гісторыю беларускае літаратуры. Слоўнік, як і Дадатковы том збору твораў Максіма Гарэцкага, убачыў сьвет у "залаты час беларускага кнігадрукаваньня" (Барыс Сачанка). І таму — чытайма Максіма Гарэцкага, Міхаіла Ганчарыка і "Беларускіх пісьменьнікаў"!

P.S. Зьміцер Давідоўскі, бібліятэкар аддзела беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ласкава дапамог зьверыць артыкул Максіма Гарэцкага "Гдзе ёсьць беларусы або нашы маленькія жаданьні" ў "Нашай Ніве" з першадрукам у "Беларускіх ведамасьцях". Грубыя памылкі ў публікацыі пачынаюцца з загалоўка, у арыгінале чытаем іншае: "Гдзе есьць беларускасьць або нашы маленькія жаданьні", прапушчана ў трэцім абзацы фраза "у часе вайны аплачывалась нямецкімі грашмі", папраўленыя ці апушчаныя асобныя словы...

Віталь Скалабан

ПАВАЖАНЫ СПАДАР РЭДАКТАР!

У №23-24 "НН" я прачытала артыкул Віктара Нагнібяды "Расклад дня" і інтэрвію з Барысам Рагулем "Сем капеек за кулю". Спачатку хачу паведаміць некаторыя заўвагі наконт артыкула. Пэнсіянэр Цімох, які згадваўся ў артыкуле, — мой стрыечны дзядзька. Я была трохі зьдзіўленая скланеньнем ягонага імя. Мы, радня, ніколі ня кажам: Цімоха, Цімоху. Мы кажам: Цімаха, Цімаху. Далей. Я выросла ў той самай вёсцы Ачукевічы. Кожныя летнія канікулы праводзіла ў сваёй бабулі Ганны Мікалаеўны Кузьмы. Ніколі ня чула, каб мясцовыя жыхары казалі: пойдзем у Любчу. Заўсёды казалі: пойдзем да Любчы. Гэта я пішу, таму што ва ўсіх сродках чытала, што Любча чамусьці лічаць словам жаночага роду, а мясцовыя жыхары скланяюць яго як слова ніякага роду. Я лічу, што трэба прыслухоўвацца менавіта да мясцовых жыхароў. Але гэта не галоўнае, аб чым я хацела напісаць.

Мяне вельмі зацікавіла інтэрвію з Барысам Рагулем. Справа ў тым, што ўжо амаль год я працую над раманам пра гэтую вёску, пра яе жыхароў і менавіта пра той час, аб якім згадвае Барыс Рагуля. Я пішу мастацкі твор, а не гістарычны, але пэўныя гістарычныя матэрыялы мне, зразумела, вельмі патрэбныя. Гэты матэрыял, на жаль, я магу атрымаць толькі ад сваіх сваякоў. Але мая мама, галоўная крыніца маіх ведаў, у тыя часы была васьмі-дзесяцігадовай дзяўчынкай, таму шмат чаго проста ня ведала. Дзядзька Цімох, зразумела, ведае больш, але як і ўсё ягонае пакаленьне, ня можа даць зусім аб'ектыўнай адзнакі тым часам, бо трэба ўлічыць шматгадовы ўплыў савецкай улады на людзей ягонага пакаленьня. А раман гэты я павінна напісаць. Я лічу гэта сваім маральным абавязкам, бо пра тыя часы на Наваградчыне ў нас, на мой погляд, існуе вельмі аднабаковая адзнака — савецкая. А людзі павінны ведаць усю праўду. Пройдзе ня гэтак шмат часу, і мы страцім апошняга сьведку тых падзеяў. Гісторыя не павінна быць зь белымі плямамі. Іх у нас і так дастаткова. Мне б вельмі хацелася наладзіць кантакт з Барысам Рагулем, я спадзяюся, што ён, як ніхто, валодае найбольшымі звесткамі аб тым часе. Можа Вы мне дапаможаце знайсьці яго, каб я змагла напісаць яму ліст. А таксама вытрымкі са свайго раману. Я думаю, яму будзе цікава пачытаць пра тыя мясьціны, дзе ён некалі жыў.

Лілія Сазанавец,
Ліда

Выданьні Фонду "Наша Ніва"

ГАРТ. САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПАТРЫЁТАЎ

Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў (Глыбокае, Паставы. 1945-1947 г.). — Менск: Наша Ніва, 1997. — 352 с. ISBN 985-6374-014

Саюз Беларускіх Патрыётаў — гэта падпольная маладзёжная арганізацыя, якая ўзьнікла ў 1945 годзе сярод студэнтаў пэдагагічных вучэльняў Глыбокага і Паставаў. Спачатку гэта былі суполкі. Яны склаліся стыхійна — як рэакцыя навучэнцаў на пасьляваенную русіфікацыю асьветных установаў Беларусі. 8 лютага 1947 году СБП быў разгромлены бальшавіцкімі карнымі органамі. Большасьць атрымала 10 гадоў пазбаўленьня волі...

КНІГІ — ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г.Менска, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	58.000	8.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	6.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	8.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	5.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	6.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	8.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	5.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	6.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	6.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	6.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	6.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	8.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	6.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	6.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	8000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	5.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Даламожнік для студэнтаў.	45.000	10.000
18	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №1(96)	30.000	6.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	10.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	6.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	6.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	8.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	5.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	3.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	8.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	3.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	6.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	3.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	3.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	6.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	10.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	8.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	12.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	6.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	3.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	5.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	6.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	3.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	5.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	5.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнічак.	10.000	3.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	3.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	3.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	5.000
45	И.Хозеров. Белорусское и смоленское зодчество 10-13 вв.	30.000	6.000

НАВІНКА!

Ганс Якаб Крыстофэль фон Грымэльсгаўзэн. Авантурнік Сымпліцысімус / Пераклад зь ням., камэнтары Васіля Сёмухі. —Менск: Мастацкая літаратура, 1997.

Адзін з найвыбітнейшых твораў баракальнай літаратуры Эўропы ў перакладзе Васіля Сёмухі, які пры перадачы рэаліяў XVII стагодзьдзя выкарыстаў багацьці старабеларускай мовы.

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі — том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон, пазначце яго.

Даведкі праз тэл.: 249-08-88 да 10 гадзінаў раніцы; 231-04-08 у працоўны час.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Андраюк С. Пісьменьнікі. Кнігі: Літ.-крытыч. артыкулы: Для ст. шк. узросту. — Менск: Маст. літ., 1997. — 319 с. Наклад 3600 ас. ISBN 985-02-0360-9

Асіноўскі С. Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі: Іл. Храналяг. давед. — Менск: Полымя, 1997. — 428 с.: іл. Наклад 2000 ас. ISBN 985-07-0111-0

Беларускі навукова-дасьледчы інстытут дакумэнтазнаўства і архіўнай справы: Бібліягр. паказ. / БелНДІДАС, Бібліятэка Беларус. ун-та культуры; Склад.: Т.Самайлюк, В.Скалабан, Т.Дзем'яновіч, Л.Доўнар. — Менск: БелНДІДАС, 1997. — 98 с. ISBN 985-6099-35-8

Беляхэнка Б. Крык у ціхай затоцы: Аповесьці-дэтэктывы. — Менск: Маст. літ., 1997. — 352 с. Наклад 8000 ас. ISBN 340-01283-2

Брыль Я. Дзе скарб ваш: Лірычная проза. — Менск: Маст. літ., 1997. —334 с. Наклад 3500 ас. ISBN 985-02-0328-5

Вайцяховіч З. Краіна замкаў альбо Беларусь на старажытным малюнку. — Менск: Цэнтар — "Выдавецкая ініцыятыва", Камтат, 1997. — 60 с. ISBN 985-6176-08-5

Валодзіна Т. Талака ў сыстэме духоўнай культуры беларусаў / Акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру. — Менск: Беларуская навука, 1997. — 135. Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0033-X

Грымэльсгаўзэн Г.Я.К. фон Авантурнік Ейміпіцысімус: Раман / Пер. з ням. і камент. В.Семухі, Прад. Г.Сініла. — Менск: Маст. літ., 1997. — 415 с.: іл — Скарбы сусьветнай літаратуры. Наклад 3000 ас. ISBN 985-02-0332-6

Драздова З. Творчасьць А.Мрыя і Л.Калюгі: Стылявыя асаблівасьці. — Менск: Беларуская навука, 1997. — 143 с. Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0040-?

Ілюстраваная храналёгія гісторыя Беларусі: Ад 1919 г. і да нашых дзён / Г.Пашкоў (гал. рэд.) і інш., Скл. І.Хаўратовіч, Маст. Э.Жакевіч. — Менск: БелЭн, 1997. –192 с.: іл. Наклад 5000 ас. ISBN 985-11-0086-2

Капыловіч І. Крумкач: Раман. — Менск: Маст. літ., 1997. –351 с. Наклад 1000 ISBN 985-02-0004-9

Карамазаў В. Выбраныя творы. У 2 т. Т. 1. Бежанцы: Раман; Краем Белага шляху. Дзень Барыса і Глеба: Аповесьці / Прадм. П.Васючэнкі. — Менск: Маст. літ., 1997. — 509 с. (1) л. парт. Наклад 1700 ас. ISBN 985-02-0105-3 (Т.1).

Кісьліцына Г. Алесь Разанаў: Праблема мастацкай сьвядомасьці. / Навук. рэд. Л.Гарэлік. — Менск, Беларуская навука, 1997. — 143 с. Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0039-9

Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі: 2-е выд., дап. — Менск: ВП "Экаперспектыва", 1997. — 486 с. Наклад 5000 ас. ISBN 985-6102-11-1

Мдзівані Т., Сергіенка Р. Кампазітары Беларусі. — Менск: Беларусь, 1997. — 400 с.: іл. Наклад 5000 ас. ISBN 5-338-00691-X

Навуменка І. Выбраныя творы. У 2 т. Т. 2: Раман. Аповесьці. — Менск: Маст. літ., 1997. — 495 с. Наклад 1500 ас. ISBN 985-02-0232-7 (т.2).

Песьні Беласточчыны / Уклад. М.Гайдук. — Менск: Беларуская навука, 1997. — 367 с. — (Беларус. нар. творчасьць). Наклад 1000 ас. ISBN 985-08)0052-6

Сьпеўнік беларускіх скаўтаў. Вялейская харугва імя Якуба Ясінскага Аб'яднаньня беларускіх скаўтаў, 1997.

Снапкоўскі У. Зьнешнепалітычная дзейнасьць Беларусі 1944 — 1953 г. / Пад рэд. Ю.Броўкі. — Менск: Беларуская навука, 1997. — 207 с. Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0028-3

АЛЯКСАНДАР ЛУКАШУК

ФІЛІСТОВІЧ. ВЯРТАНЬНЕ НАЦЫЯНАЛІСТА

9 верасьня 1951 году пад Маладзечнам прызямліўся парашутыст... Цэлы год, хаваючыся ад органаў МГБ па вёсках і лясах, Філістовіч наладжваў беларускае нацыянальнае падпольле, стварыў сваю вайсковую групу, выдаваў у лесе газэту «Жыве Беларусь».

5 верасьня 1952 году органы МГБ правялі апэрацыю супраць групы Філістовіча. Вайсковы трыбунал прысудзіў Філістовіча да сьмяротнага пакараньня...

КАСЭТЫ — ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва ёсьць касэты (кошт 32.000 + 7.000 БРБ)"

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Залатая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндам. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Голуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галоцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

НОВЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" стварае Архіў беларускай рок-музыкі, які бачыць сваёй галоўнай мэтай збор матэрыялаў і дасьледаваньне сучаснай незалежнай музычнай традыцыі ў Беларусі.

Архіў зьбірае: старыя, рарытэтныя, аўдыёвідэаматэрыялы, друкаваную прадукцыю (газэты, часопісы, афішы, плякаты і да т.п.).

Зацікаўленым асобам просьба зьвяртацца на адрас:

Беларусь, 220085, Менск, а/с 5. "Архіў беларускай рок-музыкі", або праз тэлефон: (017) 231-04-08 (Сяргей Сахараў).

НАВІНКА!

Kriwi. Hei-loli. — Miensk: Ковчег, 1997

Са зьяўленьнем колькі гадоў таму гурта "Палац" беларуская музычная культура папоўнілася яшчэ адной плыняй — folk-modern. Тады, на пачатку дзевяностых, "Палац" стаўся сапраўднай зьявай, якая ўскалыхнула заскарузлую беларускую мас-культуру. Зьвяртаньне да фальклё ру было ня толькі неабходнай, але і ўдзячнай справай: аказалася, што бабульчыны сьпевы могуць гучаць модна.

"Палац" з году ў год атрымлівае прыз Рок-каранацыі ў разьдзеле "Традыцыі і сучаснасьць" і да сёньняшняга дня перарос у аднайменную студыю. Менавіта з гэтай студыі выйшаў новы праект "Крыві". Удзельнічаюць у ім вядомыя з "Палацу" Юрась Выдронак, Зьміцер Вайцюшкевіч і Вераніка Круглова, якая тут — лідэр-вакал. Апошняя ўдзельніца, як можна меркаваць, і была адной з галоўных прычынаў утварэньня праекту — у "Палацы" Круглова выконвала замалую для сябе ролю падпеўкі.

З жаночым голасам значна пашырыўся рэпэртуарны дыяпазон, і "Крыві" загучаў зусім адметна. У выніку "Крыві" не стае масавасьці для дасягненьня Палацавай папулярнасьці. Але самі музыкі сьвядома ідуць на гукавыя экспэрымэнты, спалучаючы старажытныя традыцыі "гарлавых сьпеваў і сучаснага sound з элемэнтамі імправізацыі і авангарду". Гэтым і можна патлумачыць стылёвыя няроўнасьці МС-альбому "Крыві" — спэктар кампазыцыяў пашыраецца ад амаль танцавальнай "Hei-loli" да калыханкі "Коцік". Адной з самых нечаканых стала кампазыцыя "Куралес", дзе ўдала спалучыліся электронныя матывы і этнічныя сьпевы.

Экспэрымэнт пад назвай "Крыві" стаўся пасьпяховым у варыянце аўдыёкасэтаў, ці будзе ён такім жа ў фармаце CD, выданьне якога хутка чакаецца, пакажа час.

Сяргей Сахараў

РОК—ПА—ВАКАЦЫЯХ

1 верасьня ў Парку Чалюскінцаў адбудзецца штогадовы беларускі рок-фэст "Рок-па-вакацыях". На танцпляцоўцы парку выступяць "Крама", "Новае Неба", "Уліс", "Тарнада", "Жыгімонт Ваза", "N.R.M.". Уваход вольны.

АЗБУКА ЧЭСЛАВА МІЛАША

Czesław Miłosz. Abecadło Miłosza. — Kraków: Wydawnictwo Literackie, 1997. 276 S. ISBN 83-08-02732-6

Чэслаў Мілаш, польскі пісьменьнік, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі, уцякач за савецкім часам у ЗША, выдаў чарговую кнігу эсэістыкі.

"Азбука Мілаша" нагадвае энцыкляпэдыю, у якой сабраныя галоўныя паняткі сьвету паводле Мілаша. Сам ён з тых палякаў, што гадаваліся на Віленшчыне і маюць ня столькі польскі, колькі літоўскі або ліцьвінскі сьветапогляд, у якім, як у Вялікім Княстве Літоўскім, дамінуе Беларусь, таямніца беларушчыны. Успаміны аўтара, зьвязаныя з галоўнымі пэрсанажамі ягонага ўласнага жыцьця, з найважнейшымі геаграфічнымі пунктамі і абстрактнымі катэгорыямі. Падзеі раскручваюцца вакол Вільні, забягаючы то ў Друю, то ў Лепель, то ў Пінск, то ў глухую французскую або амэрыканскую правінцыю. А героямі выступаюць то нейкія даўно забытыя сябры юнацтва, то Альбэр Камю, які ўхваліў да друку першую кнігу прозы Мілаша, то раптам аўтар зьмешваецца з героямі Дастаеўскага і Бальзака.

Мілаш як бы падводзіць рысу свайго папярэдняга жыцьця і адбірае тое, што хацеў бы ўзяць з сабой у вечнасьць. Або тое, з чым хоча падзяліцца ўласнай вечнасьцю сам. Альбо тое, чаму ў вечнасьці хацеў бы пакінуць сваю трактоўку.

Вось артыкул "Аўтэнтычнасьць". "Мой вялікі страх, — піша Мілаш, — што я выдаю сябе за кагосьці, кім я ня ёсьць".

"Абрамовіч. Гэтыя прозьвішчы: Абрамовіч, Ахматовіч, Ахрамовіч, Альхімовіч, Архімовіч напэўна таксама, былі татарскім унёскам у віленскую мазаіку".

"Аўтамабіль. Напэўна, аўтамабіль быў вынайдзены на тое, каб пакпіць з пэсымістаў, якія прадказвалі, што колькасьць коней неўзабаве павялічыцца настолькі, што гарады задушацца ад смуроду конскіх экскрэмэнтаў".

Першае каханьне, першая кніга, першая п'янка. "Я належу да нацыі, зьнявечанай вякамі п'янства".

Амэрыка... Амэрыканская віза... Амэрыканская паэзія.

"У падручніку стылістыкі верш Эдгара Алана По "Званы" падаецца як прыклад аноматапеі. Шмат пазьней я даведаўся, што амэрыканскія паэты лічаць такое гукаперайманьне жахлівым і што ангельская мова ня зносіць гэткіх рытмічных барыкадаў. Але По быў вялікім паэтам для французаў і для расейцаў, для якіх паэзія збольшага — гэта "магія гукаў". Я гатовы шмат чаго дараваць яму за адзін толькі верш, сапраўды чарадзейскі —"Улялюм", хоць лягчэй яго перакласьці на расейскую зь яе ямбічным акцэнтам, чым на польскую".

"Азбука Мілаша" пры ўсёй яе шматплянавасьці, шырыні часавага і прасторавага ахопу — гэта ўсё ж кніга маладосьці паэта. І таму гэта віленская кніга, што найперш цікава для беларускага чытача. Вільня — сталіца Вялікага Княства Літоўскага, пасьля цэнтар "Северо-Западного края", як называлі Беларусь у XIX ст., нарэшце сталіца Заходняе Беларусі ў часе паміж I і II сусьветнымі войнамі. Горад першых нашых кнігі, школы, газэты, партыі...

У "Азбуцы Мілаша" артыкул "Горад" або "Miasto" прысьвечаны, натуральна, Вільні.

"Вільня ў сваёй гісторыі схілялася ад адной культуры да другой... Калі Гедымін перанес сюды сталіцу з Трокаў, горад, праз тое, што Вялікае Княства было заселенае пераважна ўсходнеславянскімі і праваслаўнымі жыхарамі, цягнуўся да Ўсходу — старабеларуская мова была мовай урадавых дакумэнтаў і на ёй напісаныя літоўскія Статуты. Але рэлігія пасьля хрышэньня была рымакаталіцкая і цэрквы будаваліся найперш гатычныя, а пасьля барочныя. І гэта азначала польскі ўплыў. Палянізацыя Вільні і ваколіцаў цягнулася праз усё васямнаццатае стагодзьдзе, і ў дзевятнаццатым сутыкнулася з русіфікацыяй. Насельніцтва падвіленскіх вёсак зь літоўскай мовы паступова перайшло на польскую, і далей перайшло б на расейскую, калі б Літва заставалася савецкай рэспублікай".

Найбольш прыцягвае ўвагу Чэслава Мілаша пашыраны ў міжваеннай Вільні масонскі рух. Сам Мілаш належаў да масонскае ложы, ідэалёгія якой базавалася на разуменьні адметнасьці земляў Вялікага Княства Літоўскага як ад Расеі, так і ад Польшчы.

"Людвік Абрамовіч быў выразьнікам ідэалёгіі, у якой злучаліся дэмакратызм, шматнацыянальнасьць і "краёвасьць". Перад першай сусьветнай вайной да ложы "Літва" належалі, апрача палякаў, літоўцы і беларусы. Пасьля вайны адбыўся падзел уздоўж нацыянальнае лініі, але "краёўцы" ўсё ж перамагалі эндэкаў і асуджалі дыскрымінацыю іншых моваў. "Przegląd Wileński", які рэдагаваў Людвік Абрамовіч, быў адным з часопісаў польскамоўнай Вільні, але выказваўся супраць далучэньня Вільні да Польшчы і за ўваскрашэньне Вялікага Княства зь Вільняй як сталіцай, а таксама крытыкаваў Юзафа Пілсудзкага за тое, што той выракся ідэі фэдэрацыі".

"Беларускія" прыклады іншы раз выкарыстоўваюцца ў кнізе Мілаша і тады, калі аўтару трэба праілюстраваць з уласнае біяграфіі катэгорыю прыстасавальніцтва.

Гэтак у артыкуле пра Акадэмічны клюб валацугаў, які, паводле Мілаша, у перадваеннай Вільні нагадваў пазьнейшых амэрыканскіх хіпі, аўтар згадвае сярод сяброў клюбу нейкага беларуса Яна Пацука (мянушка Выдра), які меў прыемнае аблічча, але ўсё намагаўся зьмяніць сабе прозьвішча на Пачыньскі.

У іншым месцы Мілаш распавядае гісторыю нейкага Лешака Б., які з прыходам у Вільню саветаў, каб выратавацца ад ссылкі, пачаў выкладаць марксізм-ленінізм на курсах для рабочых, хоць пры гэтым ня меў пра марксізм ніякага ўяўленьня.

"Далей прыходзяць немцы. Лешак выдае сябе за беларуса і набывае маёнтак, па якім ходзіць зь бізуном і пагражае сялянам: "Я вам зараз пакажу камунізм!". Застрэлілі яго праз вакно, калі сядзеў за вячэрай. Хто застрэліў? Нібыта сяляне. Але ў тых ваколіцах дзейнічала моцная савецкая партызанка і можна падазраваць супрацоўніцтва Лешака Б. зь беларускай адміністрацыяй, супраць якой тая партызанка вяла вайну".

Гутарка ідзе як бы пра адваротны бок мэдаля патрыятызму Вялікага Княства, які Мілаш называе "краёвасьцю". А менавіта пра канфармізм. Магчыма, гэта тая адзіная і ўсеахопная рыса беларусаў, якая некалі будзе вартая ўсенароднага пакаяньня. Бо ў "Азбуцы Мілаша" я знайшоў толькі тры эпізоды, а ўсіх прыкладаў гэтага прыстасаванства не пералічыш.

Зрэшты, ня толькі прыстасаванцамі малюе нас Чэслаў Мілаш. Напэўна, рана ці позна ягоная "Азбука" будзе перакладзеная на беларускую мову сьледам за ўжо перакладзенымі, наколькі ведаю, "Роднай Эўропай" і "Шуканьнем Айчыны".

Магчыма, эсэістыка Мілаша нават цікавейшая для беларускага чытача, чым для палякаў. Бо палякам яна распавядае пра гісторыю, спэцыфіку і таямніцы нашага краю, а для нас становіцца яшчэ адным адкрыцьцём сябе.

Крыт.

ПАРАЎНАЕМ...

Бычкова М. Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя. — Москва, 1996. ISBN 5-201-00638-8

Тэма параўнаньня ВКЛ з Масковіяй не сказаць, каб вельмі даўняя, але сто гадоў мае. Першае, што згадваецца — кніга І.Маліноўскага "Рада Вялікага княства Літоўскага ў сувязі з баярскай думай старажытнай Расеі", якая выйшла ў 1904 годзе. Пісалі пра гэта й раней, пішуць і дасюль. Вядомы маскоўскі генэолаг Маргарыта Бычкова ў сваёй кнізе імкнецца падвесьці некаторыя вынікі дасьледаваньняў гэтай тэмы.

Перш зьвернем увагу на генэалягічныя аспэкты працы. Пытаньні пачынаюць зьяўляцца адразу. Чаму ў князя Патрыкія Нарымунтавіча бацька завецца Нарымонт? Ці розныя асобы Іван Салега і Іван Сапежыч? Няўжо сапраўды славуты Вітаўт — дзядзька ня менш славутага Ягайлы? (Яны стрыечныя браты.) І, нарэшце: "Даўмонт — гэта Гедымінавіч"! Нават чыста з "тэхнічнага" боку гэта немагчымая сытуацыя, бо паводле ўзросту Даўмонт падыходзіць Гедыміну за бацьку, а зусім не наадварот. Каб зразумець, як атрымалася такая памылка, зірнем на іншыя пастуляты аўткі. Здаецца, вось яе крыніца і падмурак: на думку М.Бычковай, усе літоўскія князі ў ВКЛ — гэта Гедымінавічы (люстраны адбітак становішча ў Масковіі, дзе ўсе расейскія князі — Рурыкавічы). Імкненьне да такой "сымэтрыі" і дало вынікам тое, што вельмі разгалінаваныя княскія роды ВКЛ — Сьвірскія, Гедройці, Гальшанскія, якія не былі Гедымінавічамі, — зусім ня згадваюцца ў кнізе. Так выпала з поля зроку адна з важных асаблівасьцяў сацыяльнага й палітычнага ладу ВКЛ.

Ранейшыя аўтары калі параўноўвалі ВКЛ і Масковію, вельмі цікавіліся пытаньнем: якую з гэтых дзьвюх дзяржаваў можна лічыць пераемніцай Кіеўскай Русі. Тлумачылася гэта, натуральна, гістарычнай прывабнасьцю той Русі. Маргарыта Бычкова не паставіла перад сабой такога пытаньня. Здаецца, у кнізе ўвогуле няма тэрміну "Кіеўская Русь". Перад намі — адна са спробаў сучаснай расейскай гістарыяграфіі вынішчыць усялякую "кіеўскую" афарбоўку з гісторыі Русі і наглуха прывязаць яе да гісторыі Масквы. Замест "Кіеўскай Русі" аўтар скарыстоўвае тэрмін "старажытная Руская дзяржава". Зразумела, што і Масковія XVI ст. для яе "Руская дзяржава", так што ўсё гэта аказалася адным дзяржаўным утварэньнем з адной лініяй разьвіцьця.

Тут робіцца зразумелаю й назва кнігі М.Бычковай. Чаму ў загалоўку прысутнічае "Руская дзяржава"? Лягічна было б кнігу назваць "Вялікае княства Маскоўскае і Вялікае княства Літоўскае", ці, паводле іншага прынцыпу, "Руская дзяржава і Літоўска-Руская дзяржава" (стыль вялікага гісторыка М.Любаўскага), або "Расейская дзяржава і Літоўска-Беларуская дзяржава", як сказалі б некаторыя беларускія гісторыкі. Лінія М.Бычковай цьвёрдая — пазбавіцца ад вызначэньня дзяржаваў паводле гораду (Кіеў, Масква), каб усё было проста "рускім" —у сэнсе "расейскім". Нечаканыя вынікі такой тэндэнцыі — замена ў кнізе тытулу "вялікі князь маскоўскі" на "вялікі князь рускі" (!), і кур'ёзныя пасажы кшталту: "У Рускай дзяржаве падобныя ідэі сустракаюцца як у Пскоўскай суднай грамаце, так і ў аповесьці пра Дракулу". Як бачым, што Пскоўская рэспубліка, што Вялікае княства Маскоўскае, — для аўтара адно Расейская дзяржава.

І яшчэ больш нечаканая для нас, але цалкам лягічная для поглядаў М.Бычковай выснова: Беларусь і Ўкраіна ў межах ВКЛ — гэта "былыя рускія землі, якія ўваходзяць у склад Вялікага княства". Але хоць існаваньне беларускай ды ўкраінскай моваў аўтар прызнае? М.Бычкова вырашыла пазьбегнуць адказу на гэтае пытаньне і дала адно намёк, у ВКЛ XV-XVI ст. размаўлялі — на "старажытнарускай". Вядома, праца М.Бычковай не лінгвістычная, але гісторыя ўсё ж патрабуе дакладнасьці.

Аўтар паказала асноўныя адрозьненьні ў сацыяльна-эканамічным і палітычным ладзе двух Вялікіх княстваў. З-за таго, што кніга мае невялікія памеры, разгляд гэтых асаблівасьцяў зь непазьбежнасьцю атрымаўся даволі ляканічным. На гэта паўплывала і тое, што дэталёвы разгляд бакоў праблемы яшчэ ня быў зроблены навукоўцамі. Але ж... Аўтарка прыгадала вядомую манаграфію І.Маліноўскага, дзе быў зроблены параўнальны аналіз вышэйшых органаў адміністрацыйнай улады ВКЛ і Масковіі. Аднак, высновы Маліноўскага ніяк не пракамэнтаваныя, нават не адзначана, ці адвяграе іх М.Бычкова, ці згаджаецца.

Назіраньні аўтара кнігі над эканамічным, грамадзкім і палітычным ладам дзьвюх краінаў уяўляюцца шмат у чым слушнымі. М.Бычкова адзначае, што землеўладальнікі ВКЛ раней за расейскіх перайшлі да інтэнсіўнага, а не экстэнсіўнага выкарыстаньня маёнткаў. У ВКЛ актыўна ішоў працэс утварэньня буйных зямельных уладаньняў; у Расеі, наадварот, буйныя княскія вотчыны драбіліся. У ВКЛ пастаянна расла палітычная значнасьць шляхты, а ў Расеі значэньне мясцовых сабораў зьніжалася. У ВКЛ адбывалася пашырэньне функцыяў мясцовых органаў улады, закладваліся і ўмацоўваліся падмуркі прававой дзяржавы, ды інш.

М.Бычкова зрабіла аналіз ідэалягічнага афармленьня ўлады ў абедзьвюх дзяржавах. Як вядома, вялікую, калі не вядучую ролю ў гэтым адыгрывала ідэя знатнага паходжаньня кіруючай дынастыі. У старажытнай Русі для абгрунтаваньня ўлады дынастыі Рурыкавічаў служыла легенда пра прыход варагаў Рурыка з братамі з-за мора. Пасьля ў Масковіі ўзьніклі дапаўненьні, што той Рурык быў з роду імпэратара Аўгуста і г.д. У ВКЛ склаўся аповед пра прыезд з Рымскай імпэрыі ў Літву Палемона з 500 сем'ямі рымскай шляхты. М.Бычкова мяркуе, што гэтыя дынастычныя легенды зьявіліся незалежна адна ад адной. Такая выснова відавочна спрэчная. Як ня так даўно паказалі літоўскія дасьледчыкі, легенда пра Палемона — гэта мастацкае перайманьне ўсё таго ж сказаньня пра Рурыка. М.Бычкова не заўважае й істотнага адрозьненьня абедзьвюх легендаў. У старажытнай Русі і Масковіі заўсёды былі моцныя тэндэнцыі да адзінаўладзьдзя. Не выпадкова таму мітычныя браты Рурыка Сінявус і Трувар аказаліся зусім непатрэбнымі ў ідэалягічных пабудовах. Расейскія кніжнікі абышліся зь імі як аўтары сучасных бульварных раманаў зь лішнімі пэрсанажамі — па-просту ўмярцьвілі. Іншая справа ў ВКЛ. Шматлікія і ўплывовыя магнацкія роды гэтай краіны імкнуліся знайсьці сваіх продкаў побач з родалачынальнікамі вялікіх князёў літоўскіх. У выніку мы маем ня проста двух братоў у атачэньні галоўнага героя генэалягічнай легенды, а цэлых 500 сем'яў.

Цяжка ўсё ж пісаць невялікія абагульняльныя кнігі — трэба за падмурак браць піраміду працаў папярэднікаў... Аналізаваная кніга далёкая ад такіх падыходаў. Шмат якія назіраньні ды высновы ў ёй слушныя, але іх галоўны недахоп у тым, што яны відавочныя. Кніга не падсумавала вынікі ранейшай гістарыяграфіі ды не адкрыла шляхі да фармуляваньня новых праблемаў. Чытаецца кніга з такой самай лёгкасьцю, зь якой і забываецца.

Валеры Пазьнякоў

СТО БЕЛАРУСКІХ КНІГ XX СТ.

Чарговыя зьмены ў рэйтынгу "Нашае Нівы"

Чытач "НН" Ван Дзік Матусевіч зь Менску піша: "Ня ведаю, ці стаў бы я сьвядомым беларусам, калі б бабка не чытала мне перад сном беларускія кнігі. Успамінаюцца дзьве: "Беларускія народныя казкі. Каток — залаты лабок" і "Ніхто не забыты, нішто не забыта. Успаміны дзяцей Вялікай Айчыннай Вайны". Шкада, але апошняя згубілася. А вось тыя самыя казкі я цяпер чытаю сваім дзецям перад сном разам з "Касяй у школцы".

Уладзімер Жаўняк з Мар'інай Горкі: "Параіўшыся ўсёй сям'ёй, мы вырашылі ўнесьці і сваю прапанову ў гэтае складанае пытаньне".

Наш аўтар Алесь Аркуш называе, паміж іншым, і кнігі аўтараў XIX ст., і кіруецца мабыць тым, што як кнігі, прынамсі, па-беларуску яны зьявіліся толькі ў XX ст.: Я.Баршчэўскі. Шляхціц Завальня; С.Пільштынова. Авантуры майго жыцьця. Першым сярод аўтараў нашага рэйтынгу Аркуш згадвае паэтаў Яўгенію Янішчыц (кніга "Пара любові і жалю"), Раісу Баравікову ("Каханьне") і Уладзімера Някляева ("Наскрозь"), а таксама самога сябе (аповесьць "Vis Major", наколькі ведаю, асобнай кнігай яшчэ не выходзіла).

Сяргей Шупа склаў сьпіс і пры гэтым зазначыў, што гэта — "не намінацыі на выбар адназначна бясспрэчных і аб'ектыўна лепшых кніг стагодзьдзя, а хутчэй мой суб'ектыўны вобраз Беларусі ў кнігах".

У Шупавым сьпісе адлюстраваныя найперш зацікаўленьні аўтара як мовазнаўцы, таму тут так шмат слоўнікаў і моўных даведнікаў, часам зусім спэцыяльных. Увогуле С.Шупа назваў каля трыццаці кніг, якія раней ня згадваліся. Ёсьць сярод іх і кнігі ўнівэрсальнага культурнага значэньня, такія як "Пуцявіны роднага слова" С.Александровіча і эксклюзыўныя навуковыя (напр., "Беларускія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом" А.Антановіча), і тыя, што яшчэ не зьявіліся ў выглядзе кніг ("Дзёньнік спадара Дэкарта" І.Бабкова), і тыя, што прадстаўляюць іншамоўную беларусістыку ("Byelorussian Statehood" З. і В. Кіпеляў альбо "Рождение Белорусской советской республики" В.Круталевіча), і зборнік гэбісцкіх пасквіляў В.Мацкевіча "У тым сьвеце", і кніга, якая, здаецца, існуе толькі ў адным асобніку — В.Ластоўскі. Зямля крыві.

"Дзеля "фарматных" абмежаваньняў, — заўважае С.Шупа, — у сьпіс ня трапілі Рыгор Барадулін, Янка Брыль, Генадзь Кісялёў, Арсень Ліс — яны бясспрэчна ўпісваюцца ў "вобраз", аднак мне цяжка выбраць паасобныя кнігі, якія б найвыразьней азначылі іхную творчасьць".

Каб "пазьбегнуць самарэклямы" С.Шупа пакінуў перакладныя кнігі "па-за бортам" сьпісу. Хоць, на ягоную думку, Васіль Сёмуха, напрыклад, як творца і літаратар несправядліва выпіхваецца за межы "беларускай літаратуры".

Яшчэ адзін аўтар "НН" Андранік Антанян піша, што "Сто найменаваньняў беларускіх кніг так і не набраў, хоць і вельмі намагаўся... Хто пераклаў на беларускую мову апавяданьні Уільяма Сарояна прыгадаць не магу, зрэшты гэта ня так і істотна. Сэнтымэнт да гэтай кніжкі маю толькі таму, што апавяданьні У.Сарояна — гэта адзіная кніжка на армянскай мове, якая ёсьць у маёй хаце. І беларускі пераклад — першая (і здаецца адзіная) кніжка на беларускай мове, якую прыдбаў мне бацька".

А.Антанян называе шмат кніг (таксама каля трыццаці), якія раней у допісах нашых карэспандэнтаў ня згадваліся, хоць большасьць зь іх — дастаткова вядомыя кнігі Я.Брыля ("Сірочы хлеб"), Я.Купалы ("Над ракой Арэсай"), Р.Семашкевіча ("Бацька ў калаўроце"), Ядвігіна Ш. ("Золата") або Ф.Янкоўскага ("І за гарою пакланюся", "Само слова гаворыць"). Таксама Антанян згадвае шмат кніг сваіх літаратурных раўналеткаў. Дзякуючы яму, у сьпісе зьявілася зусім новая кніга выдавецтва "НН" —"Гарт. Саюз Беларускіх Патрыётаў".

Застаецца падвесьці чарговы вынік. Агульны сьпіс кніжнага рэйтынгу "НН" сёньня складаюць 579 назваў. Зь іх 10 і болей галасоў атрымалі наступныя (дзеля эканоміі месца імёны аўтараў не называюцца, у дужках — колькасьць пададзеных галасоў):

Абдзіраловіч. Адвечным шляхам (10)
Адамовіч, Брыль, Калесьнік. Я з вогненнай вёскі (11)
Аляхновіч. У кіпцюрах ГПУ (16)
Арлоў. Таямніцы полацкай гісторыі (12)
Арсеньнева. Пад сінім небам (16)
Багдановіч. Вянок (24)
Беларусь. Энцыкляпэдычны даведнік (12)
Быкаў. Знак бяды (19)
Быкаў. Сотнікаў (14)
Віцьбіч. Плыве з-пад сьвятое гары Нёман (15)
Гарун. Матчын дар (11)
Гарэцкі. Гісторыя беларускай літаратуры (13)
Гарэцкі. Дзьве душы (11)
Гарэцкі. Рунь (15)
Геніюш. Ад родных ніў (10)
Геніюш. Споведзь (22)
Дайнека. Сьлед ваўкалака (10)
Ермаловіч. Па сьлядах аднаго міта (15)
Ермаловіч. Старажытная Беларусь (20)
Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі (15)
Караткевіч. Дзікае паляваньне караля Стаха (20)
Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі (12)
Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (16)
Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні (12)
Караткевіч. Чорны замак Альшанскі (16)
Кіпель. Беларусы ў ЗША (10)
Колас. На ростанях (12)
Колас. Новая Зямля (21)
Купала. Жалейка (16)
Купала. Спадчына (17)
Ластоўскі. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі (11)
Ластоўскі. Кароткая гісторыя Беларусі (16)
Ластоўскі. Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік (13)
Маўр. Палескія рабінзоны (13)
Мележ. Людзі на балоце (16)
Разанаў. Вастрыё стралы (10)
Сагановіч. Невядомая вайна (18)
Смоліч. Геаграфія Беларусі (18)
Сяўашка. Армія Краёва на Беларусі (10)
Тарасаў. Памяць пра легенды (15)
Тарашкевіч. Беларуская граматыка для школаў (22)
Ткачоў. Замкі Беларусі (11)
Туронак. Беларусь пад нямецкай акупацыяй (16)
Цётка. Хрэст на свабоду (10)
Чаропка. Імя ў летапісе (12)
Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі. Т. 1, 2 (13)

Усе наступныя зьмены ў сьпісе залежаць толькі ад Вас, нашых чытачоў. Нагадаю, што Вам ужо неабавязкова называць усе сто кніг. Вы можаце выказаць Вашую згоду або нязгоду з тым сьпісам, які надрукаваны сёньня і прапанаваць свае дадатковыя пазыцыі. Чакаем Вашых лістоў.

Крыт.

ПОШТА

Добры дзень, мая ўлюбёная "НН"!

Маю ўвагу прыцягнуў артыкул Надзі Старавойтавай "Каб не зрабіцца латафагамі" (№25-26 ад 28.07.97). Цяжка не пагадзіцца з аўтаркай: наша мова згвалчаная, зьнявечаная спробамі штучна наблізіць яе да расейскае. І бясспрэчна, што трэба яе адраджаць. Вось толькі якімі шляхамі?

Прыгожыя, сакавітыя словы сустракаюцца на старонках летапісаў. Але ці заўсёды варта цягнуць іх у сучасную мову? Мова – жывы арганізм, які разьвіваецца і зьмяняецца паводле сваіх уласных законаў, і рэанімаваць мову XVI ст. гэтак жа недарэчна, як і намагацца для паўсядзённага ўжытку ўзнавіць тагачасны побыт.

Іншая справа, калі гэтыя законы былі зьмененыя гвалтоўна. Гэты працэс пачаўся ў 30-я гады нашага стагодзьдзя і працягваецца дагэтуль. Таму менавіта 30-я гады трэба ўзяць за пункт адліку і паглядзець, што з нашае мовы зьнікла, што трапіла туды чужога, непажаданага. Прыкладам, параўнаць слоўнікі, выдадзеныя Інбелкультам, зь Беларускарускім слоўнікам Кандрата Крапівы і з больш позьнімі савецкімі выданьнямі. Шмат што адразу стане на свае месцы. А словы, якіх не хапае (бо грамадзтва ж таксама разьвіваецца, узьнікаюць новыя паняцьці і зьявы), трэба стварыць нанова.

Але ў працэсе ачышчэньня мовы трэба таксама ведаць меру. Бо некаторыя "крутыя" нацыяналісты кінуліся ў адваротную крайнасьць, імкнучыся штучна аддаліць беларускую мову ад расейскае. Вядома, можна сказаць "брунатны" замест "карычневы" і "брутальны" замест "жорсткі", а нават "вадаплаў" замест "карабель" і "лётнішча" замест "аэрапот". Але ці абавязкова? Хіба што ў якасьці палітычнага акту (каб "маскалі" не зразумелі). Але я, напрыклад, не магу патлумачыць, чым палянізмы, украінізмы ды іншыя запазычаньні лепшыя для мовы, чым русізмы. Усё адно чужое, ня нашае. І ці варта выкрэсьліваць слова зь лексыкону толькі таму, што ў беларускай мове яно мае такі ж корань, як і ў расейскай?

І яшчэ адзін важны аспэкт у вяртаньні мове яе сапраўднага аблічча. Існуе пашыраная думка, што беларуская мова, маўляў, розьніцца ад расейскае толькі лексыконам. Вазьмі слоўнік, вывучы пэўную колькасьць словаў, і ты ўжо зможаш гаварыць па-беларуску. І гэтую грубую памылку робяць нават шчырыя адраджэнцы. А як жа граматыка?!! А яна мае характэрныя адрозьненьні і ў марфалёгіі, і ў сынтаксысе. Я ня буду спыняцца на іх падрабязна, бо кожны можа ўзяць граматыку Б.Тарашкевіча і паглядзець, як правільна скланяюцца беларускія словы, як павінны ўжывацца прыметнікі, прыслоўі, якое мае быць кіраваньне дзеясловаў, як адбываецца словаўтварэньне. А яшчэ лепей пачытаць кніжку Станіслава Станкевіча "Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР". У тым і бяда, што не бяруць і не чытаюць.

Ці ня часта даводзіцца вам чуць жахлівыя словы-мутанты, накшталт "перажываемы момант" (трэба "перажываны"), "пачаўшаяся канфэрэнцыя" (трэба "канфэрэнцыя, якая пачалася"). А чаго варты зварот "Грамадзяне адпачываючыя!" ("Граждане отдыхающие!").

Бог зь імі, калі так гавораць чыноўнікі. Але крыўдна і балюча сутыкацца зь няведаньнем мовы ў незалежных выданьнях. У мяне ў руках кніга Дж.Эйчысан "Гаваркія істоты" (пераклад з ангельскай). Разгортваю наўздагад, трапляю на старонкі 168-169. Сустракаю тут: "плыві па цячэньні" (па-беларуску "течение" – "плынь"); "хаця" (трэба "хоць"); "інтрыгуючы выпадак" ("выпадак, які інтрыгуе"); "Пэгі настроена... на мову" (трэба "настроеная"), "яны так шчыльна пераплецены" (трэба "пераплеценыя", скарочаныя прыметнікі ўласьцівыя расейскай мове, а не беларускай); "значна менш яснасьці [у пытаньні]" ("ясным" бывае дзень, а пытаньне – "зразумелым"). І гэта ўсё толькі на дзьвюх старонках у кнізе, спэцыяльна прызначанай для лінгвістаў!! Далей у тэксьце часта сустракаюцца словы "іменна" (менавіта) і "гаворачы" (той, хто гаворыць)...

На жаль, часьцяком ігнаруюць граматыку нават тыя, каго цяжка западозрыць у няшчырым стаўленьні да беларускай мовы. Возьмем гэты ж самы нумар "НН" (№25-26) і прачытаем назву артыкула: "Думка вымаўленая ёсьць хлусьня". Па-першае, неправільна

Маленькі слоўнік тубыльцаў

Ганна Матусэвіч

Амаль усе запісы зробленыя ад маіх бацькоў, Суднікаў, што жывуць у вёсцы Камароўшчына, на Койданаўшчыне. Найбольш жа запісана ад маёй мамы, якая вырасла ў Сьверынаве, на Стаўпеччыне, што зусім блізка ад Мікалаеўшчыны — радзімы Якуба Коласа. Я пазьбягала фіксаваць агульнавядомыя словы, якія асталяваліся ў літаратуры. Тое, што запісана, ёсьць жывая мова вёсачкі, якая на маіх вачах сыходзіць, зьнікае...

Як тлумачэньні да сэнсу словаў, я прыводзіла гутарковыя прыклады, што ўжываюцца ў нас і цяпер. Ёсьць словы, запісаныя паводле ўспамінаў майго маленства ад бабкі Клемянтыны (дадзець, прыстаць, прастагаліна). Некалькі словаў патрапілі зь Мёршчыны — радзімы майго мужа. Я іх пазначыла "мёр.". Словы з звонкім "г" я вымушаная была пісаць лацініцай.

Была б надта радая, каб нешта з нашага слоўнічка патрапіла і ў літаратурную мову. Мне асабіста падабаюцца словы: магулінка (слоўнік Некрашэвіча і Байкова падае: мага — сила, возможность), залатвіць, жадунак, фамільяны... Не кажу ўжо пра трапныя фразэалягізмы, прыказкі. Слова "тубылец" я ня чула ў гутарцы вяскоўцаў, але яно ходзіць сярод койданаўскіх адраджэнцаў. Слоўнік Некрашэвіча і Байкова перакладае яго як "местный житель, абориген, автохтон". Мне здаецца, яно больш удалае, чым "тутэйшы".

СЛОВЫ

Адкасаць — адвярнуць (Адкасецe брыль Міколку!).
Апоўзьлік — малое дзіця.
Апратаць — ачысьціць ад гразі, бруду (Апратай боты свае, Віталік!).
Базарыць — сварыцца, ушчуваць (Я ж яго так базарыла!).
Базэрства — разбэшчанасьць, непатрэбная раскоша.
Бушаўнік — разбуральнік, непаседа (Ах ты, бушаўнік малы!).
Бэрляць, -ца — мяшаць бяз толку ежу ў місцы.
Выдыгаць (Vydygać) — прысядаць, прыслужваць (Я ж бачу, як ты перад ім выдыгаеш!).
Вымерхацца — стаміцца, растраціць сілы (Як вымерхаесься, то будзеш есьці!).
Галяляшчыць — гуляць, гультаіць.
Гапляшыць — біць, удараць (малатком, каменем).
Гізаваць (Gizavać) — бегаць, задраўшы хвост (карова ў сьпёку).
Гінда — абразьліва пра жанчыну.
Глушмень — глухі чалавек.
Дадзець — надакучыць (Дадзела мне ўжо ягады гэтыя зьбіраць!).
Джупляваць — "брать в сжовые рукавицы" (Зараз я цябе выджуплюю!)
Джэгацца (Dżegacca) — зыбацца (на тонкай жэрдцы).
Дзедаваць — раскашаваць за сталом (Хто тут дзедаваў?).
Дрэмзы — ашмоткі.
Завашчыць — 1. нітку воскам 2. быць суворым да некага (Каб ты свайго Віталіка добра завашчыла!).
Завінуцца — увіхнуцца (Завінецеся, дзеткі, і падмяціцё ўвесь двор).
Задаўніцца — зацягнуцца (Задаўніцца кашаль — што тады будзе?).
Залатнік — пупок.
Заплавіць — заліць (Заплавіў расолам увесь стол!)
Згрыбчыць — зьнесьці цішком.
Здрабантаваць — скамечыць, спляжыць (Усю пасьцель здрабантавалі!).
Злосьнік — той, хто злуецца.
Ідэіст — той, хто трымаецца ідэі.
Ірзоліць — гарэзаваць.
Казодра — дзяўчынка-задзіра.
Калаватая — цьвярдая, як кол (бялізна з марозу).
Кіжлай — тугадум, неспактыкаваны чалавек.
Кіндзюк — страўнік.
Коркі — абцасы.
Крапіўнікі — курыныя байструкі (мёр.).
Кулёк — пінжак (мёр.).
Курчуком — скурчыўшыся.
Ламезіна — адламаны дубец.
Лахудра — кудлаты нямыцька.
Лёстка — перакладзіна на драбіне.
Лопацень — балбатун.
Лупіна, лусьпіны — абчысткі (ад бульбы).
Лядашта — надта хворы чалавек.
Магулінка (Magulinka) — сілачка, ёта, прычынка, магчымасьць, ступенька (І на малую магулінку не пераважыць, альбо За малую магулінку прычапіўся, ці Паспрабуй не дагадзіць хоць на малую магулінку).
Маджэр — галава.
Майдан — пляц, маёмасьць.
Масэлба — (прыблізна) вучоны дурань.
Мармуль — маўчун.
Надзюбацца — напайцца гарэлкі.
Настаць — дамагацца (Як наста-ла, то й зрабілі).
Недабоек — пакалечаны, падрапаны чалавек.
Недабрыцца — нездаровіцца.
Непадабенства — непрыстойнасьць, няпэўнасьць, немагчымасьць (Гэта ж непадабенства нейкае, ды ня морква! Паглядзі, якая нэндзная!).
Нядэшлы — слабы, хворы (чалавек).
Няспрытна — нязручна (Мне няспрытна з гэтага боку.)
Пілючы — цягавіты, працавіты, старанны.
Плягота (Plagota) — пошасьць.
Прастагаліна — адкрытая паляна ў лесе.
Прыколка — жаночая шпілька для валасоў.
Прыстаць — стаміцца.
Прытыра, -ны — дурань, дурнаваты.
Пугаць — жлукціць, піць вялікімі глыткамі.
Раздура — раздуранае, расьпешчанае (дзіця).
Раструханец, -ка — задрыпа, абадранец.
Рэўцень — той, хто рэве.
Салэп — смаркач (абразьліва).
Сараматнік — бессаромнік, нягоднік.
Скарач — кужэльны ручнік.
Склыка — звадка, грызьня.
Сласонік — слодыч.
Спрытна́ — папарадку (Есьце спрытна́, ня бэрлейцеся!).
Сподка — рукавіца (мёр.).
Стрэнчыць — дагаджаць, наравіць (Ніяк яму ня выстранчу).
Ступа — таўстуха.
Сьлепанда — недабачлівы чалавек.
Сьлявенда — цяльпук.
Талачэча — мітусьня, штурханіна.
Трусіць — церушыць, рассыпаць (сена).
Тэнча — вясёлка.
Убіраць — уцякаць (убіраць ад сабак)
Удробаць — зачасьціць (Удробаў гэты пінжак і з плячэй не здымае!).
Узьдзябурыць (вопратку) — насунуць, нацягнуць.
Урвінец — спрытны хлопец, адлёт.
Фамільяны — цёзкі па прозьвішчу (мёр.).
Фанта — ануча.
Фрэнзьлі — зьвязаныя ў вузельчык махры на сурвэце.
Цухліць — цадзіць (скрозь зубы).
Чаркаваць — выпіць.
Члункі — злучэньні цела (косткавыя).
Чучарыць — чыкрыжыць, дробна стачыць, зьдзяўбці (мышы, куры пачучарылі яблык).
Шарос — шэрань.
Шварка — паўпаліто (мёр.).
Шкробы — зношаны абутак.
Шэрхнуць — 1. мерзнуць, 2. адседзець (нагу) — 2 ушэрх на марозе, сшэрхла нага.

ФРАЗЫ

Чаго Вы скарыцеся за пусты мяшок?
Раз на вяку давялося чарвяку...
Каб цябе качка ўбрыкнула!
Каб на табе шэрсьць курэла!
Пашанцавала, як жыду з гары!
Не глядзіць ні вока, ні бока!
Мацаецца, як сьляпы ў торбе!
Спрытны, як вол да карэты!
Распусьціліся, як дзядоўскія пугі!
Худы, хоць куды.
Ні да танца, ні да ружанца.
... як тая нявестка, што сем гадоў жыла — ня ведала, што сучка без хваста.
Жыта, як гай шуміць!
Такі-то наедак, як сабаку муха!
Надзеты, што шуло й не павернецца.
Прыглядаесься, як Сорка да грошаў.
Халодны, што крыга.
Наша Сора то шые, то пора.
Хоць плач-галасі, а рады не дасі.
Сагнуўся, як сьвіны татка.
Налюдзкуесься, як сука за быдлам у дождж!
У вас тут, як на ўрвінскай вуліцы!
Есьць, як у Мінчын мех!
Ёсель кіпе відэльцам еў.
Прыглядаесься, як Фаб'ян да мухамору.
Змок, што вуда.
Носіься, як кошка зь селядцом.
Атросься ды панёсься (пра мужчын).
Пішчыш, як сьвіньня ў плоце.
Вырабілася, як смык (схуднела).
Валачэ, як дурань ступу.
Пераверне ўсё дубам-рубам!
Лапочаш, як пусты млын.
Стаіш, як бы на вясельле прыйшла запрашаць.
Можна есьці, каму не на сьмерць.
І сабакі не брахалі, а ў мяне (рэч) укралі.

ДРАЖНІЛКІ, ЖАРТЫ, ЛІЧЫЛКІ, ПАЦЕШКІ, ПАВУЧАНЬНІ, ПРЫМАЎКІ, ЗАГАДКІ

Ішла баба зь цестам, стукнулася мяккім месцам. Чым ты думаеш?
Скінуўся бацька з гары, і чорт яго бяры! Рукі ня ў с-цы, трэба дзяржацца.
Разбойнік пабег у хвойнік.
Гром грыміць, зямля трасецца! Поп на курыцы нясецца, а папіха на казе самагоначку вязе.
Андрэй не дурэй! Не дзяры капоты! Ты ня шыў, ты ня праў — не твае работы!
Тылі-тылі скрыпачка! Бяжыць баба з прыпечка. А дзед бабу за касу, пячы, баба, кілбасу!
Адзін лапаць, другі бот сустракаюць Новы год!
Негарэлец уваліўся ў кубелец!
Баю-баю-баю! Наб'ю коціка, напаю, каб ён на ночы не хадзіў, малых дзетак не будзіў.
Пётра-Паўла, скажы праўду, што заўтра будзе: дождж, ці пагода? Калі дождж, сядзі ў хаце, калі пагода, ляці ў поле (божая кароўка на далоні).
Два Юр'і — абодва дурні. Адзін халодны, другі галодны.
Дзеля аднаго абеду сем міль еду.
Еш, пакуль рот сьвеж.
Па малаку й ног не павалаку.
Як ня еў, дык ня мог, а як пад'еў, дык ні рук, ні ног.
Як ня еў, дык нешта меў, а як пад'еў дык саўсім аслабеў.
Сасновыя дровы пішчаць, яловыя трашачаць, бярозавыя до-о-обра гараць!
З раніцы росна, удзень млосна, а вечарам камары кусаюцца.
Ішла жнейка да нівы. Хлеб узяла, а серп забыла.
Сьпярша трэба гняздо зьвіць, а тады птушку лавіць (пра жаніцьбу).
Шлюб маёвы — гроб гатовы! (нельга паводле прыкметы жаніцца ў траўні).
Бяз стуку, бяз гуку схапілі, як суку (безь вясельля).
Няма лепшай рэчы, як дома на печы.
Ці то сьвіньні елі, ці шляхта абед мела?
Захочаш пасварыцца — пазыч грошы.
Ёсьць — разыдуцца, няма — абыдуцца.
Смак у яйка адзін: ці яно белае, ці фарбаванае (пра жанчыну).
Без запасу чалавек гіне да часу.
Што летам пагою, тое зімой рукою.
Дурань думкамі багацее.
Што баліць — няма чаго хваліць.
Пана лаюць — пан сыцее.
Пакуль жаніцца — загаіцца, а як уміраць, дык і ня знаць.
На сухой багне рыба вады прагне.
Вось няўдача — ідзе ды плача.
Пашкадаваў воўк кабылу — пакінуў хвост ды грыву.
Пакуль поўны есохне — худы здохне.
У чым у пасьцелі, у тым і ў касьцеле.
На гнілы тавар сьляпы купец.
Нехта сьняньць, ці бязрукі дзяржаць.
Што над намі ўверх нагамі? (муха)
Коціцца катушачка: ні зьвер, ні птушачка, ні камень, ні вада — не ўгадаеш нікагда. (сонца)
Ідзе чалавек, да лясу, нясе дзірку й сьвярдзёлак да часу. Сьвярдзёлак пакідае, а дзірку з сабой забірае. (хадзіць у лес на вялікай патрэбе)

ПРЫКАЗКІ

Вучыся танчыць, а работа гора наўчыць.
У каго матка, у таго галоўка гладка.
Добраму чалавечку добра і ў запечку, а як якой благаце —дрэнна й на куце.
Дружы, як з другам, а разьлічвайся, як з жыдам.
Ня дай Бог з мужыка ды пан!
Свой з сваім сячыся, рубайся, а чужы не мяшайся.
Зь людзьмі трэба быць не салодкім і ня горкім, бо салодкага прасмокчуць, а горкага праплююць.
Што край — то абычай.
Сваяк на боку, а сусед на воку.
Свая сярмяжка ня цяжка.
Век жыць — ня мех шыць.
Усюды добра, дзе нас няма, а як мы пасуцем, то ўсё папсуем.
Бойся каня ззаду, каровы съпераду, а дурня з усіх бакоў.
Ня радуйся, як знайшоў, і не шкадуй, як згубіў.
Ня дай і ня лай. (пра жабракоў)
У мужчыны ў хаце чатыры куты, а ў жанчыны пяць.
Без каманды войска гіне.
Не радзіся красівай, а радзіся шчасьлівай.



Здымак Дзьвіса Нутэтаса

Э П І К О Н

ДЗЯНІС ЛІСЕЙЧЫКАЎ

Мэтамарфоза

Раб заплакаў...

Кайданы ня вытрымалі, хруснулі, лінула кроў. Ейныя чырвоныя пісягі прыгожа й страката расплываліся на сьвежым сьнезе. З мэлядычным звонам, куляючыся ў паветры і гуляючы іржавым пералівам фарбаў, ляцелі злучвы ланцуга. "Шорх! Шорх" — акуратна й сплянавана падалі яны ў поўны радасьці й п'яны ад крыві сьнег. На белым фоне рудыя колцы кайданаў складаліся ў геамэтрычны, дакладна прадуманы ўзор нераможанае сьмерці.

Вольныя, брудныя ад мэталу й іржы рукі радасна напружыліся. Моц, прага да жыцьця адчувалася ў кожнай клетцы. Шчасьлівыя вочы спагадліва паглядзелі на разламаны ланцуг, на які хвіліну таму глядзелі зь нянавісьцю й злосьцю. Асьцярожна, быццам баючыся абпаліць скуру, правая рука падняла мэталёвую кружлінку, з вострым пахам іржы, далоні з прытоенаю пяшчотаю трымалі некалі агідную рэч. Няшкодны мэтал пакідаў на далонях мяккую карычневую паску. Быццам нешта ўзгадаўшы, рука апусьцілася. Колца бездапаможна кульнулася й грацыёзна торкнулася ў сьнег...

Чалавек сьмяяўся...

РУСЛАН РАВЯКА

Пра сабак

Сабаку я застрэліў каля ўзьлесься. Паклаў адным стрэлам, у галаву. Добра мець добрую вінтоўку. Лепш, чым стрэльбу нейкую. Зброю прывалок яшчэ бацька, як вярнуўся зь "лясных братоў". Але ня доўга пабыўся ў хаце — з гадзіны тры, адмысловыя віжы наскочылі, рукі завярнулі, ды ў машыну — на горад. Адтуль татка ўжо не вярнуўся.

Матка пагаравала з гадкоў пяць і таксама адышла, шукаючы лепшай долі, у іншы сьвет. Брат мой па бацьку розумам пайшоў, паехаў у горад, на пошукі старога, дый адным махам павучыцца тамака застаўся. Пасьля прыехаў у гэткім самым адзеньні, як у віжоў адмысловых, што татку некалі зьвязьлі. Пра пошукі таткі распавядаў. Колькі ж мучыўся, колькі ж папер перагледзеў, колькі люду распытаў (бо праца ў яго такая — людзей распытваць), але пра старога так нічога і ня вынайшаў. Мяне пасьля таго, як самагону хлынуў, намаўляў. Маўляў, кідайма хату, вёску і едзьма да гораду. Да сябе на працу абяцаў забраць. Ды куды ж я паеду. Тутака гаспадарка — хата ды плот з гародчыкам, калгас. У дровах машынка гарэлачная схаваная, з бацькаваю вінтоўкаю. Адмовіўся.

Брат мяне "дурнем" нарок, і зьехаў. Можа й так. З маленства мяне гэтак празвалі, я ня вельмі й крыўдаваў. У школку не хадзіў, падручнікаў не чытаў, чырвоных шалікаў не насіў. Як нарадзіўся непісьменным, гэтак і памру — якім Бог паслаў такім і застаўся.

Праз год ізноўку прыехаў брат, разам зь сябруком. Абсдва ў адзеньне адмысловых віжоў апранутыя, што некалі татку схапілі, і ў якім ужо летась прыяжджаў. Толькі зорачак на плечукох не пароўну.

Гарэлку прывезьлі, я ім сваю паставіў, на бульбе выраблену, што ўзімку з калгаснага поля ўкраў, а на прыкуску тую ж бульбачку. Папілі яны, паелі, і пачаў браток мяне зноўку ўгаворваць у горад цягнуцца. Я ім адказаў, маўляў, на халеры мне той горад; тутака калгас, за добрую працу абяцаў мех буракоў навесну даць, як застануцца ў буртох.

Тым часам сябрук брата ў прыбіральню пацягнуўся. Адзіная яна ў ваколіцы была — бацька чалавек разумны быў, шляхетны, некалі паставіў, а як зь лесу прыйшоў, дык рамантаваць пачаў, пасьля хату думаў пачаць, ды не атрымалася — зьвезьлі, як ведама, няведама куды.

Пасьля раптам прыбег той сябрук, ды прывалок з прыбіральні кніжку бяз вокладкі. На стол каля талерак і відэльцаў шпурнуў — сьвіньня, сам ня гідзіцца, дык іншых спаскудзіў.

Яны гэтак амаль адразу ў горад і паехалі. Брат нават і не разьвітаўся. Мабыць кніжка тая ўразіла, бо з сабою забралі. Я яе з бацькавага куфра дастаў — стары некалі закапаў, а я поркаўся ў гародчыку і знайшоў. Нашто ж дабру гінуць —вокладку зьдзер і ў прыбіральню на цьвік прыстасаваў. Гэтак ўжо колькі іх выкарыстаў. Бацька разумны чалавек быў, а да такога не дадумаў.

А ноччу тою, як брат другі раз зьехаў, мой сабака размаўляць пачаў. Во дзе дзіва! Падыйшоў да ложку і кажа: "Дурнем нарадзіўся, дурнем і здохнеш. Брат твой цябе ратаваў, на працу да адмысловых віжоў пайшоў, а цябе хто прасіў бацькавы кнігі чапаць. Хай бы сабе гнілі ў зямельцы".

Ранкам я застрэліў сабаку, каля ўзьлеску. Адно калі людзі дурнем клічуць, а іншае — сабака. Дзе гэта бачана, каб жывёла істоту вышэйшую аблайвала рознымі словамі ня вельмі добрымі.

Калі вяртаўся да сваёй хаты, убачыў віжоў адмысловых, што па двары маім швэндаліся, ды ў хату злодзеямі ўлезьлі. Усё нешта шукалі. Патронаў у мяне хапала... Але ж мабыць зарана бацька вінтоўку сваю ў дровы схаваў.

ЗЬМІТРО СІДАРОВІЧ

Калядная эротыка

У галаве шматкі ўспамінаў. Капаюся ў кучы дэталяў. Згадаць кожную падрабязнасьць цяжка... Але трэба.

Кароткая шрубка ўкруцілася ў гайку. Дэталь. Гэта ўжо было? Гэта было ў ноч на Новы год, і шампанскае п'янаваціла, і дзявочае тулава было па-вар'яцку блізкім, гарачым, спакусьлівым. Ногі ўкруціліся ў чаравікі. Гэта мае. Ногі ўкруціліся ў панчохі. Гэта яе. Талія ўкруцілася ў тонкую сукенку, з-пад якой выкручваліся ногі. Вочы выкручваліся з вачніц. Гэта мае вочы. Са шклянкі выкручвалася шампанскае і ўкручвалася ў горла, каб потым укруціцца ў мазгі. Гэта нашы мазгі.

Усё было далікатна. Тады я дастаў скручаныя шрубку і гайку і паклаў перад ёй на стол. Яна ўсё сьцяміла і пачырванела. "Цяпер?" — ціха спытала яна. Я кінуўся тлумачыць: "Разумееш, гэта М16, страшэнна важная штука..."

Яна ўздыхнула і рашуча паднялася. Я падхапіўся сьледам. "Не, ты сядзі, прашу цябе," — папрасіла яна. Я сказаў: "Добра, я сяду". Я сеў. Сеўшы, я сказаў: "Ну вось бачыш, я сеў". Яна кіўнула. Я з гатовасьцю падхапіўся. "Ня трэба, ня трэба..." — спыніла яна мяне прыгожым рухам далоні. — Я сама... Як ты не разумееш... Гэта так важна..."

Я перавёў дых і адкінуўся на сьпінку крэсла. Яна мужна пад маім позіркам прайшла ў вітальню.

Яна больш не прыйшла зь вітальні. Яна і цяпер сядзіць там.

"Давайте восклицать!"

"Ах!" — усклікнуў я. "Вой!" — сказала яна. "Ах!" — усклікнуў я.

Яна казала сваё "вой" усё цішэй і цішэй. Мне стала яе шкада. "Слухай, ты там... Ты чаго?.." — спытаў я ціха. Яна ледзь чутна сапела. Потым уздыхнула і перавалілася набок. Спружыны зарыпелі — канапа была старая. Я пайшоў бліжэй. "Ты чаго?" —паўтарыў я сваё пытаньне. Яна зь нянавісьцю паглядзела на мяне.

Я пацісну плячыма і апусьціўся ў фатэль. Побач стаяў тэлевізар. Я ўключыў яго. Восьмы канал браўся са сьнегам. Я пераключыў на Астанкіна. Там сядзела Міткова. "Прывітаньне, Міткова!" — сказаў я. Міткова не пачула. "Ах!" — прызыўна ўсклікнуў я. Міткова ўпарта не зьвяртала на мяне ніякай увагі.

Тады я зноў зірнуў на канапу. Там нікога не было. Я ўздыхнуў.

З кухні пачуўся гук. Я кінуўся туды. Так і ёсьць — яна чэрпала лыжкай маё ўлюбёнае сочыва! "Пастаў слоік на месца, — пагрозьліва прарычэў я. — Лічу да трох..." "Два ўжо было!" —нахабна адказала яна з поўным ротам.

Вось жа ведае, што я ёй нічога не зраблю.

А ўсё таму, што мы вырасьлі на адных і тых жа песьнях Акуджавы.

ІГАР СІДАРУК

Піца коткам не наедак

У яго заставалася яшчэ адна нырка. Яе Тод бярог, ня мог. "Цік-так, цік-так", — мерна цікала яна, бы швэйцарскі адладжаны гадзіньнік. І яму гэта падабалася.

***

Тодар, зглынаючы галодныя сутаргі, капаўся ў сьмецьцевым баку, даставаў і еў адтуль, што было ежаю калі заўгодна, толькі ня сёньня. Апошнія пяць даляраў ён аддаў яшчэ на тым тыдні той, якая прыходзіць. Яна ледзь не адзіная з усіх гэтых, хто да яго бязножжа ставіўся індыфэрэнтна. (Урэшце, калі жанчына чуе шоргат гэтых самых зямліста-зялёных папера к, яна шмат да чаго можа ставіцца індыфэрэнтна. Усё залежыць ад таўшчыні вашае магалейкі, ці ня так?)

Сёньня Тоду пашанцавала: пад бананаваю скажуркаю ляжаў досыць важкі недаедак піцы. Яшчэ раней на паркавай тэрасе ён натрапіў на плястыкавы балён зь цёплымі рэшткамі колы. Гэта ўжо цягнула на сапраўднае банкетаваньне.

Прыціснуўшы падбародзьдзем піцу, Тод зубамі ўзяўся за белы корак балёну, а вольнаю рукою (гм, калі яна ў вас адзіная, то якім словам назваць адсутную?..) пачаў павольна адкручваць бутэльку. Здаецца, усё атрымалася трапна. Тод сплюнуў корак і, злаўчыўшыся, ладна кусануў бяззубым ротам халоднага цеста з адубелым расплаўленым сырам. Затым падняў падбародзьдзе, рэшткі працыбуленага праснаку суха грукнулі якраз па дошцы ягонага самаскляпанага возіка. Перакуліў над сабою балён, пачаў лыкаць, а болей праліваць на ашчацінелы брудны твар колу. Заставалася знайсьці адпаведны рытм гэтага зьверавата-прыстойнага наталеньня галадухі.

Недзе па-шаманску замяўчэла ашалелая валацужная котка.

***

Да ўсяго Тод любіў гэты бак, магчыма, нават не зважаючы на тое. Менавіта зь яго калісьці... па шмацьці рэклямных праспэктаў... спачатку нічога не разумеючы... "Купім. Разьлік у СКВ". ... У тэлефоне адказвалі абсалютна няўцямна й блытана. Аднак далі адрас. І Тод пайшоў. Ад чысьціні, бляску, стэрыльнасьці ледзь не званітавала. Там ён таксама... Ня тое, каб так вось, адразу... Але трэба было нешта жэрці. Жракаць! Пхаць ва ўласную ненаедную пашчу ўсялякае, бляха, дзярмо!!!

За палец, за ягоны жывенечкі, цяплюхенькі палец Тодару далі аж (ух, трымайце капелюхі, панове! мацней прыцісьніце іх да вушэй!..) цэлы дваццатнік. Па курсу Нацбанку гэта было натуральнае рабаваньне. На гэтыя грошы Тод жыў крыху даўжэй за два тыдні. І нават неяк вячэраў (потым Тод хваліўся, што мантажыў там цэлы месяц) у местачковай ці не сямнаццаціразраднай — калі б такі разрад прысуджаўся — рэстарацыі ды еў — о-го-го! — ікру з амараў. "Ну?!. Хто з вас яшчэ можа пахваліцца, што еў калі самую! ікру з саміх! амараў?!"

***

Крутыя часіны, аднак, чакалі непадалёк: адразу па выхадзе з рэстарацыі. Асабліва Тод люта незалюбіў саплівых жабракоў-валацужак: ім грошы давалі ні за што, толькі за сінь-глыбінь бессаромных вачэй. Тод так ня мог. Тод нават чытаў газэты.

***

Правай рукі хапіла амаль на паўгода. Гэта было ўжо лепей. Праўда, не сказаць, каб ён разьвітваўся зь ёй зь вялікай ахвотай. Разоў пяць ці шэсьць закідваў: "А можа, такі левую?", аднак ім упарта патрабавалася правая. Да таго ж, левая была з дэфэктам: на ёй не хапала аднаго пальца.

Затым чарга дайшла да нагі. Паступова Тод, што называецца, перайшоў ад содавай да сапраўднага ірляндзкага віскі. Левае вока, верхняя сківіца, ніжняя сківіца, ладны шмат скуры зь седаўкі, адна, а затам і другая скабы, мясістыя тканкі носа. Пасьля ваганьняў (не сказаць, каб пакутных, аднак і не карнавальна-бязважкіх) нарэшце яшчэ адна нага. Нарэшце, нырка...

Прадайце як-небудзь пры нагодзе сваю абсалютна здаровую нырку і вы ўведаеце, што адчуваў Тод.

Аднак вашыя адчуваньні будуць вельмі прыблізнымі. Таму што блізьняшку той, якую хітрэнны Тодар бярог, як мог, у яго проста скралі. Элемэнтарна. Крыху глыбейшая доза наркозу — ці чаго там садыстычна-прымірэнча колюць гэтыя эскулапы?.. — і... Сьвядомы глыток сьвежага паветра ўвайшоў у яго ў рэдкім падлеску за горадам.

У вольнай (ха-ха!..) руцэ — два зацісну тых пяцібаксавіка. Нармалёва. Здаецца... Тод асьцярожна абмацаў — вядома, дзе мог дастаць, а паколькі ягонага цела да таго часу значна паменела, то цяжкасьці вялікай гэта ня склала — сваё цела. Яшчэ ніколі гэты рэдкі падлесак ня чуў такога нялюдзкага, сакрушальнага рову. І ўжо нідзе й ніколі Тод ня мог адшукаць нават сьлядоў той стэрыльна-скальпэльнае канторы. Толькі маленькія пазнамкі ад шасьці роўных швоў зь левага боку ўнізе сьпіны не-не ды нагадвалі Тоду аб ёй.

***

У той жа вечар ён жэр дурнаваты, п'яны самагон да зьверападобнага стану. Другія пяць баксаў даставаліся, як вядома, той, якая прыходзіць.

***

Каты, адзічэлыя памыйныя каты напалі на яго нечакана. Піцы, заставалася, можа, на кус-другі. Яе падмялі, падабралі, падлізалі да апошняе крошкі. Аднак прэснае цеста пахла зусім ня так, як чалавек. Як гэтае хадзячае, крыху прасушанае на сонцы мяса, якое так і прасілася ў смуродныя кацячыя ненажэрнасьці.

Тод спрабаваў крычаць, адбівацца, страшна адмахвацца нічога цяпер ня вартым пластыкам. Катоў паболела, яны нечым нават нагадвалі вялізных, апаўсьцінелых глістоў, якія да ўсіх сваіх выгінастаў ды ўзьвіваў маюць дадаць яшчэ шылападобныя іклы ды сьмяртліва-разьдзерныя кіпці. Гэткія мілыя, ласкавыя, кашэчыя кіпцікі..

Пластыкавы балён адляцеў далёка. Тод перакуліўся дагары на сваім вазочку. Нейкі дурны кот зьлізваў з дошкі апошнія кроплі колы. Вусатыя ягоныя хаўрусьнікі вуркаталі, чмякалі, ірвалі па-жывому, зглытвалі, давячыся й адрыгваючы тое, што яшчэ нядаўна было Тодам. Яны дабіраліся да запаветнага свайго ласунку: цёплай, пульсуючай ныркі. "Цік-так, цік-так, цік-так", — нават раскрытая, усё яшчэ мерна цікала яна, бы швэйцарскі адладжаны гадзіньнік.

Здымак Бруса Вэбэра

ЗА ШТО?..

Прысвячаецца Т.С.

Гонар — заўжды напышлівы ды фанабэрысты.
Годнасьць — заўжды самотная ды незалежная.
Шляхетнасьць — заўжды высакамерныя ды самахвальная.
Слава — заўжды прымхлівая ды нясьціплая.
Прынцыповасьць — заўжды бескампрамісная ды абстрактная.
Справядлівасьць — заўжды дагматычная ды сварлівая.
Дабро — заўжды невыгоднае ды бескарысьліваe.
Вера — заўжды сьляпая ды эгаістычная.
Чалавечнасьць — заўжды лысая ды абшарпаная.
Шчырасьць — заўжды наіўная ды ўтапічная.
Мужнасьць — заўжды ўпартая ды хваравітая.
Геройства — заўжды самотнае ды драматычнае.
Воля — заўжды голая ды беспрытульная.
Розум — заўжды іранічны ды пэсымістычны.
Праўда — заўжды бесстароньняя ды бяздужая.
Любоў — заўжды важкая ды трагічная.
Дык за што мяне кахаць?..

ПРАВАДЫР ПАЛКІХ СЭРЦАЎ

Прысвячаецца стральцу УНСО "Рэю"

Табе, народжанаму ў сям'і сумленных людзей, нашчадкаў старажытнага ўкраінскага шляхецкага роду, у сям'і інтэлігентаў-патрыётаў сваёй Зямлі і сваёй Нацыі,
Табе, што пасьля слова "Мама" вывучыў "Ойча наш",
Табе, які не прызнаваў ніякіх аўтарытэтаў — ні ад улады, ні ад грошай — і

ТЮРМА АНДРЭЙ ШАПТЫЦКІ

дзеля трыюмфу Справядлівасьці ўвесь час і ва ўсякай прыгодзе змагаўся з усялякімі рэжымамі ды адміністрацыямі,
Табе, што заўсёды паніў Жыцьцё Брата вышэй за сваё ўласнае, а Волю — вышэй за Жыцьцё Брата, а Гонар — вышэй за Волю,
Табе, што ніколі ня йшоў на гешэфты з уласным Сумленьнем,
Табе, што ня раз даводзіў перавагу Ідэі над Рэчывам, а Духа — над Целам,
Табе, які ніколі не ўзьнімаў руку на жанчыну,
Табе, які кожны раз рашуча адгукаўся на покліч свайго Лёсу ў імя перамогі агульначалавечых Прынцыпаў,
Табе, які заўжды адчувае ўласную правіну за нязьдзейсьненае і адказнасьць за зробленае,
Табе, якога ніколі не пакідаў доўг перад паплечнікамі, перад тымі, каго ты заразіў сваім ладам існаваньня,
калі Ты ў чарговы раз выйдзеш зь вязьніцы, да немагчымасьці цяжка будзе адшукаць тое Слова, якое Ты мусіш сказаць тым, хто сустраканьме Цябе на волі.
Ты ня здолееш выціснуць зь сябе прыветнае ўсьмешкі, затое Цябе будуць раздражняць іх прыветныя ўсьмешкі, бо Ты ня будзеш падзяляць зь імі радасьці вызваленьня.

Гэтыя людзі лічаць шчасьцем, прыймаюць за вялікую радасьць вызваленьне цела, і Ты будзеш пакутаваць ад немагчымасьці ўцямна растлумачыць ім тое, што зразумеў сам, седзячы ў астрозе. Пасьля першых іх словаў ты адчуеш, як у Табе абуджаецца і мкліва расьце абурэньне, выкліканае легкадумнасьцю іх мовы, ганарлівасьцю тону. А якімі жахлівымі здадуцца Табе гэтыя гарады, шчыльна засьмечаныя офісамі, шапікамі, маркетамі і незразумелаю рэклямай! Цябе непрыемна зьдзівіць адсутнасьць моладзі ў царквах, шматлікасьць жандараў на вуліцах, ненажэрнасьць чыноўнікаў. Толькі ўласная годнасьць і пачуцьцё пашаны да свайго імя не дазволяць Табе плюнуць у твар так званым правадырам, партыйным функцыянэрам, якія бесклапотна вітаюць Цябе з вызваленьнем, прадчуваючы магчымасьць скарыстаць з Тваёй славы. Калі Ты сядзеў у турме, гэтыя самыя людзі рабілі выгляд, што не заўважаюць, як Твая маці ашчаджае на ежы і адзеньні, ахвяруючы гонарам шляхцянкі дзеля нармальнага выхаваньня ўнукаў, дзяцей Тваёга малодшага брата. Люмпэн-важакі і квазіправадыры, якія дагэтуль б'юцца ў грудзі, хвалячыся здольнасьцю дапамагчы Нацыі стаць паважанаю, а народу — багатым, і пальцам не зварухнулі, каб дапамагчы сем'ям тых, што палеглі за іх спакой, прынесьлі ім славу герояў, каб паклапаціцца пра сваіх зьняволеных падданых або хаця б іх родных.

Аднак Ты Мужчына, Украінец, Афіцэр, Хрысьціянін.

Толькі на хвілю агорнуць Тваё Сэрца сум і смутак, і ніхто не пасьмее заўважыць іх, а зьбянтэжанасьць перад будучыняй так і ня здужае ўварвацца ў Тваю душу, бо раптам Ты сустрэнеш вясёлкава-шчодрыя, сонечна-шчырыя вочы сваіх вучняў і пасьлядоўнікаў, пачуеш свае песьні ў іх выкананьні, даведаесься пра тое, як паважна ставіліся яны да Тваёй сям'і ў час Тваёга зьняволеньня, зразумееш усю праведнасьць і справядлівасьць іх веры ў Вышняга.

І хоць Твая каханая не дачакаецца Цябе такою, якою ты пакінуў яе, хоць яе звабяць прыпады сьвету, ты ўсё ж не патонеш у хвалях жалю, бо іншыя, такія ж харошыя і юныя, але больш стойкія і чыстыя прыйдуць да Цябе, каб пачуць Тваё Сэрца, спазнаць Тваю Душу, паверыць Тваёму Сэрцу. А пачуўшы, спазнаўшы, паверыўшы, падхопляць Твой дэвіз: "Бог! Украіна! Нацыя!", і ён стане дэвізам і іхнага жыцьця.

Што ж, няхай непахісная вера ў Бога і бязьмежная вернасьць Маці-Украіне сьветла палаюць у іхных сэрцах, асьвятляючы шлях маладога племені няскораных да неба, дарогу ў несьмяротнасьць.

А Ты, які запаліў гэтыя сэрцы, абавязаш Сябе, жывым ці мёртвым, але быць іх нязьменным важаком. Бяз жалю пакінеш Ты пакаленьне, да якога належыш, дзеля пакаленьня, якое будзе належаць Табе, і навек станеш правадыром таго арлінага племені, племені маладых і шляхетных, племені палкіх сэрцаў.

14.02.1997, Магілёўская турма

Працяг на старонцы 18.

Цягнік праз пустэльню

Таццяна Сьнітко

Цягнік меўся адыйсьці а чацьвертай раніцы. Напярэдзе заставалася ноч. Усяго некалькі гадзінаў цемры і чужога вакзалу. (Ці бываюць яны ўвогуле "свае", асабліва ўначы?)

Цягнік пераблытаў. Напрамкі, хуткасьці, вакзалы і гарады. Межы, час, што за год ягонага блуканьня ў цемры настаяў экстракт падзеяў. І чужы вакзал — мы хутка гэта адчулі —уявіўся звыклым. Нібы цэлы год ты адсюль і не сыходзіш.

Вось "электарат", пасажыры электрычкі. Апошняй на сёньня. "Электарат" строіцца ў чаргу па свае хлеб, каўбасу і напой "Ісіндзі". Потым ён уладкуецца і намерыцца заснуць, каб пераседзець і прачнуцца на загад зьверху. З рэпрадуктара.

Як на тое, тут жа знойдзецца суайчыньнік, які будзе гучна вяшчаць з кута, як з айчыннае тэлевізіі:

— Я змагаўся! За зямлю! Я быў збраяносцам у Вітаўта Вялікага, і імя мне — Напалеон! Мне сямсот гадоў... — на гэтым вяшчальніка бярэ ў аблогу міліцыя. Ён аказваецца інтэлігентнага выгляду, з вусамі і дзіўным бляскам ува вчу. А двух амонаўцаў зваць, здаецца, Саша ды Валодзя. Калі мае сябры заблукаюць на вакзале, Саша з Валодзем ветліва ўкажуць шлях назад, у залю чаканьня. Потым мы разбудзім "электарат" сваім рогатам, і яны прыйдуць паглядзець, але "знайсьці і абясшкодзіць" ня будзе патрэбы, і яны зваляць на пэрон паліць і ахоўваць рэйкі і ўсё астатняе вакзальнае начыньне разам з намі.

Народ будзе пасьмейвацца скрозь пазяханьні з нашых студэнцкіх успамінаў, што наблізяць знаёмства з калегам па альма матэр. Гэты кампутаршчык, спартовец і інтэлектуал-разначынец у адной асобе паспавядаецца:

— Ведаеш, бачыў днямі файную перадачу пра расейскія дыялекты. Ведаеш, — дадасьць ён яшчэ больш чульліва, — беларуская мова — гэта дыялект. І ўкраінская...

Захавальнікі рэйкаў павядуць вухам, але нічога ня скажуць. Дым ад маёй цыгарэты паляціць інтэлектуалу ў твар, і ён стане падобным да сваіх, магчыма, продкаў, што спускаліся з муроў ахутанага дымам места, каб адчыніць браму войску тагачаснага "старэйшага брата".

Ён быў родам зь места Магілёва...

Мы сыходзім на зямлю Магілёва разам з сонцам, і я цягну сяброў у інтэлектуалаву хату. Ён думае — на каву, але найперш нам патрэбны прас і гэтак далей, бо рэчы ў маім клунку спрасоньня, з-за ягонай балбатні, залітыя напоем "Ісіндзі". Рэчы могуць вось-вось спатрэбіцца таму, хто, безумоўна, ня стаў бы ісьці сюды, а даўно адказаў бы за ўсе "дыялекты"...

+++

Адзін зь вязьняў установы з назвай-абрэвіятурай, таксама ня спаў гэтую ноч. У апошнюю ноч ён слухаў трохі іншыя размовы. Яшчэ ўдзень да ведама аховы было даведзена, што замест сну чакаюцца провады. Ім не перашкодзіць ніхто і нішто. Ні новы тэрмін, ні адноўлены раптам стары. Ні ШЫЗО, дзе вязень правёў каля паловы траўня, ні чарговая правакацыя. Хай будзе зямлятрус ці нават канец сьвету — "братва" зьбіраецца чыфірыць. Чыфір, моцны, даўкі, без намёку на цукар, быў на зоне самым прэстыжным напоем, нават пераўзыходзячы каву, што часам траплялася ў "дачках" з волі. Яго ўжываньне нагадвала рытуал паленьня люлькі міру індзейцамі: па колу хадзіла адна шклянка, і напой ня тое што каўталі — уцягвалі ў сябе разам з паветрам.

Вязень, якога праводзілі, за амаль паўгады пасьля менскага этапу для зонаўскіх быў "Бандэрам". Не ўсялякі тут вымаўляў гэтае слова зь нянавісьцю, гэтым адзіным высакародным з адмоўных пачуцьцяў. Да ліпеня 97-га многія (хоць часам не прызнаваліся сабе ў гэтым) вымаўлялі яго з павагаю. Станоўчай альбо адмоўнай, але з павагаю.

"Бандэра", ён жа Граф, ён жа Андрэй Шаптыцкі, яшчэ пад час леташняга суда ўсьміхаўся ўсім, хто плакаў у залі, суцяшаючы маці і незнаёмых бабуляў. Вакол залі калідоры былі набітыя амонам з сабакамі ды арламі — двухгаловымі! — на кабурах пісталетаў. Не хапала адно двух-трох танкаў перад будынкам. Бабулі ў залі трымалі ў руках абразкі Божай маці.

Судзьдзя і пракурор з-за словаў "Бандэры" не вытрымлівалі і некалькі разоў самі сьмяяліся з камэдыі, дзе й выконвалі "галоўныя ролі другога пляну". Памятаю, як я міжволі пляснула ў ладкі. Атрымалася гучнавата, і мне кінулі: "Вы што, у тэатры?.."

Пытаньне было рытарычнае, і "Бандэра" потым скажа:

— Здаецца, толькі я ды ты разумелі гэты спэктакаль.

Здаецца... Калі раніцай 5 верасьня яшчэ кволіўся нейкі 0,01% надзеі на іншы прысуд, я ведала, што, пачуўшы яго, Шаптыцкі засьмяецца. Ён быў адзіным зь сямі ўкраінцаў, што нават у апошнім слове не пажадаў перайсьці на мову "старэйшага брата".

Потым, на Валадарцы, "Бандэра" скажа, што быў бы рады, калі б "гэтых шасьцёх" адправілі дадому ці выпусьцілі зусім. Ён нясе за іх адказнасьць і ня хоча, каб пра ўкраінскіх нацыяналістаў думалі ня тое, што трэба. "Я быў упэўнены толькі ў сабе самым", — напіша ён і ў лісьце. Тым часам "непрымірымы" Шаптыцкі за сябе і Сяргея Патапава адмовіцца працаваць на рэжым. Гэта азначае ня толькі "ніводнага "так" рэжыму", але найперш — адмову ад турэмных прывілеяў. Шмат каго гэта разлуе (сама бачыла). Двух вязьняў, апошніх зь сямі, адправяць этапам у места Магілёў у апошнія лютыя маразы лютага і раскідаюць па розных установах...

+++

Аўтобуса не было. Стрэлкі гадзіньніка адбіваліся на нашых тварах. Сябры спыняюць толькі аўто, дзе ёсьць колькі месца для адной мяне. Пытаньняў няма. Вышукваем забыты ўжо шлях. Кіроўца кажа пра таемнасьць Гасподніх шляхоў і яшчэ большую таемнасьць айчынных законаў.

Першы раз да гэтага ганку я таксама ехала на аўто. Таксоўшчык адхапіў немалую купюру грошай. Не маіх. Выпадковы спадарожнік, пачуўшы назву ўстановы, забраў рэчы з маіх рук і закінуў у таксі. Я не зьдзівілася, калі ён аказаўся былым зэкам. Крымінальным. Рабаўніком і злодзеем. Слухаць слова "дзякуй" ён не захацеў і паехаў назад, дацягнуўшы мае сумкі да дзьвярэй на другім паверсе...

+++

"Каму верыць?!" Гэтае пытаньне паўстала перад "Бандэрам" адразу пасьля зонаўскага карантыну — у сакавіку. Раніцай ты кажаш словы ў кампаніі гэткіх жа зьняволеных. У абед табе іх пераказваюць зняволеныя "мянты".

Сачылі за тым, хто, па мерках саўдэпаўскай зоны, ніяк не хацеў "перавыхоўвацца". "Бандэра", здадзены адным "нібыта сваім" яшчэ 26 красавіка мінулага году, узначаліў чорны сьпіс самай "чырвонай" зоны Беларусі. Пра нішныя "ўстановы" турэмная "пошта" прыносіла іншыя звесткі. Тут, у былым ЛТП, ня трэба было чакаць паветра, як у камэры менскага СІЗО, тут давалі белы хлеб празь дзень, у кашу кідалі сёе-тое зь мяса. Тут усё бліскучэла чысьцінёй. Звонку.

26 красавіка гэтага году, калі ў калёнію запрасілі сваякоў зняволеных ("Дзень адчыненых дзьвярэй"), тыя дзякавалі начальству. Нейкая бабка чытала вершы нават. Як на піянэрскай лінейцы...

— А вы што маўчыце? — спыталіся ўрэшце ў жанчыны, якая трымалася годна й спакойна.

— За што дзякаваць? — адказала тая. — Турма ёсьць турма! Чысьціню навялі самі ж зэкі.

Жанчына выкладала дзецям у маленькім гарадку над ракой Збруч іх родную мову. Украінскую. Ёй сказалі: ваш сын не падаецца выхаваньню.

— Рэжыму ўжо начхаць на любы рух апазыцыі. Нават мянтоў больш можна не выводзіць на праспэкт, — пракамэнтаваў Андрэй тэленавіны таго дня — пра "Чарнобыльскі шлях 97".

— Ты ж, сынок, не ў сябе дома, —

Працяг на старонцы 18.

Андрэй Шаптыцкі

Працяг са старонкі 17.

БУЯЙ, БУЯЙ, ЧАРАМШЫНА

Палеская народная песьня

Буяй, буяй, чарамшына,
Вольна й сьмела разрастай,
Маладая дзеўчынонька,
Пра каханьне забывай.
Маладая дзяўчынонька,
Пра каханьне забывай,
Бо сяджу я ў крымінале
За сьвяты свой родны край.
Адсядзеў я адзін годзік,
Адсядзеў я два гады,
Прыйшлі брацьця-партызаны
Вызваляць мяне зь бяды.
Адну браму развалілі,
А другую расьцяглі,
Узялі мяне пад пахі
На сьвет Божы вывялі.
Сьвяты краю, родны краю,
Чысты думкай і душой,
За цябе я, родны краю,
Мукі цяжкі прайшоў.
Цьвіці, цьвіці, калінонька,
Да дубочка прылінай,
Маладая дзеўчынонька,
Пра каханьне спамінай.

***

Зь сямі сшыткаў твораў, напісаных Андрэем Шаптыцкім у турме, яму ўдалося зьберагчы й перадаць на волю толькі адзін. Астатнія былі сканфіскаваныя пад час аднаго з шмонаў. Вершы Андрэя надрукаваныя ў арыгінале ў газэце "Берестейський край". Мы падаем – скарочана – прозу Андрэя Шаптыцкага, ці, хутчэй, вершы ў прозе, а таксама народную песьню, што прысьвячаецца й яму самому.

Андрэй Шаптыцкі, падпольная мянушка "Граф", сябар УНА-УНСО, арыштаваны 26.04.1996, вызвалены 26.07.1997, паходзіць са старажытнага галіцкага роду. Сярод яго продкаў слынны мітрапаліт грэка-каталіцкай царквы граф Шаптыцкі.

Андрэй Дынько

Цягнік праз пустэльню

Працяг са старонкі 17.

памяркоўна сказала маці. — Тут законы свае. Няхай людзі жывуць, як яны хочуць.

— А яны жывуць?

Ужо на другі дзень па гэты бок калючага дроту ён са зьдзіўленьнем спытаецца: "Пасьля мітынгу хапалі людзей на Нямізе — проста так?!" А я адкажу: "Як звычайна"...

І таксама зьдзіўлюся.

+++

І чаго зьдзіўляцца? Там і тут былі розныя кантрасты, як па-рознаму былі сканцэнтраваныя настаяныя на часе падзеі апошняй ночы перад цягніком. Зона з "чырвонымі" парадкамі, дзе зэкі нават ня чулі пра "абшчак", і вакзал з "электаратам" і "дыялектамі" — розныя бакі люстэрка.

Кожную гадзіну "Бандэра" мусіў "адмячацца" у "рэжымцы" і паведамляць, дзе быў гэтую гадзіну і што рабіў. Быццам таго не казалі стукачы, што беглі навыперадкі і "строіліся ў чаргу"... Схільны, на думку нейкага начальства, да "прапаганды падрыву рэжыму і парадкаў", у сьпісе з чатырох ці пяці "небясьпечных" — рабаўнікоў, хуліганаў, вымагальнікаў — ён быў адзначаны зорачкай. З рабаўнікамі аб'ядналіся, каб выжыць ва ўдушлівай стукацка-мянтоўскай атмасфэры. "Бандэра" даведаўся, што "ягоныя" артыкулы ("масавыя беспарадкі", ды яшчэ "супраціў міліцыі", доказы якога трэснулі па швах на судзе) лічацца "высакароднымі". Большасьць "сядзельцаў" зоны былі з тыповага-беднага, няшчаснага электарату: той яйкі скраў, той мех зерня, той — паўкілі каўбасы. У краіне цяжкая эканамічная сытуацыя. "Высакародныя" ненавідзелі, акрамя самых "зьверскіх" "мянтоў", забойцаў і гвалтаўнікоў... Адзін асуджаны на волі гандляваў — ныркамі, пячонкамі, іншымі органамі скрадзеных і забітых дзяцей. Такіх пасьля вызваленьня часта знаходзілі забітымі. Аднаго такога ўвесну выпускалі з установы ў хлебнай машыне, закінуўшы скрынкамі. Тайком. Кажуць, гэта таго гвалтаўніка не ўратавала.

За "падрыў рэжыму", нешта кшталту стварэньня "абшчака" (гэта фонд, куды "скідваюцца", хто чым можа, "сем'і" зэкаў) некалькім далі ШЫЗО. "Бандэра" не хацеў пра гэта ўзгадваць, але я за год пасьпела распытаць іншых "шызошнікаў". Яны казалі: гэта пайка празь дзень. Казалі: вопратка з калючае матэрыі. І зьдзекі, маральныя і фізычныя. Рукі на сьцяну, сагнуцца, стаяць...

Яшчэ палітвязьня з Украіны выхоўвалі пазбаўленьнем перадачаў. З-за шматлікіх "шмонаў" братва мусіла сьцерагчы ягоныя рэчы. Ён не хаваў там нейкую зброю альбо напільнікі зь вяровачнымі лесьвіцамі. Хаваць даводзілася толькі вершы, апавяданьні, занатоўкі ў сямі сшытках, якія ўсё ж сканфіскавалі. Якім чынам, чаму, нашто быў вернуты і захаваны самы першы, з Валадаркі яшчэ, сшытак? Пытаньне загадкавае. Але ў сшытку застаўся сумесны твор — ягоны пераклад на родную ўкраінскую майго верша з роднай беларускай.

"Бандэру" падкідалі таблеткі, якія ў аптэцы не даюць без рэцэпту. Нарката — значыць сьвеціць новы тэрмін. "Шмону" не чакаеш? А вось табе "шмон"! Нехта з братвы за некалькі хвілінаў, зазірнуўшы ў рэчы па зубную пасту, пасьпеў утапіць "калёсы" ў прыбіральні...

— Я ведаю і ведаў заўжды, што я не ў сябе дома. Прабачце, што ў беларусах расчараваўся. Я не пра вас, і не пра ўсіх, і нават не пра пераможаную апазыцыю...

(Быў такі верш у яго: "Навошта вершы? Ды й пра што пісаць? Пра ворагу прайграныя змаганьні?.. І зноўку Валадарская турма абдымкі для кагосьці расчыняе...")

— Ад правакацыяў мяне ратавалі грузіны, украінцы, расейцы, а "здавалі" — выключна беларусы. Прабачце, але так было! Гэта — праўда! Ну, якія высновы зрабілі б вы на маім месцы?!

Ён перастаў размаўляць і выключыў зь "сям'і" свайго земляка з Заходняе Ўкраіны, які — свой! — на зьдзекі і прыніжэньні адказаў так:

— Хай хоць г...м называюць, абы перасядзець ціха ды з пайкай.

"Свой" зганьбіў не сябе аднаго — мільёны ахвяраў чырвонага тэрору, памяць аб тых, хто змагаўся за Волю, усю іхную Ўкраіну. Зганьбіў не перад "мянтамі" — перад самім Богам.

+++

"Я сам паабяцаў Патапаву напісаць заяву на УДО (умоўна-датэрміновае вызваленьне). І вось ён пайшоў... Перачытай стары добры школьны верш — "Верасовы мёд". Я шчасьлівы, што буду сядзець "да званка". Ды хоць да другога прышэсьця..." Я чытала ліст і згадвала ельцынскія выбары. Ваш Карчынскі разам з нашым славянасабораўцам ды рассейскімі шавінстамі — ляп свае подпісы ў антыельцынскую дамову тою вясной! Разам. Потым славянасаборавец едзе дамоў, у Менск і ўжо тут — ляп некалькі брудных плямаў на старонкі "Знамени юности"! Пра скандальную УНА-УНСО і, вядома, пра вас, сямёх заарыштаваных у нас "бандытаў". Як табе там гэта — цікава? "Хопіць пісаць у лістах розную ахінею..." Ага. Табе сказалі: дрэнна перавыхоўваесься. Наступны ліст ня дойдзе да цябе зусім...

— Я вас пазнаў! Ваш, — чалавек, разглядаючы, шукае і не знаходзіць слова, — Шаптыцкі ўжо ў дзяжурцы.

"Нашаму Шаптыцкаму", са словаў чалавека, "дужа пашэнціла": ён сядзеў, аказваецца, у лепшай зоне Беларусі!

+++

Андрэю ня верылася. Здаецца, ён нават забыўся разьвітацца. Ці разьвітаўся раней? Ці прыкмеціў ён іх, хвіліну вольных, гэткая — не разьвітацца?

Трэба пагутарыць з вольнымі звычайнымі людзьмі. У рыбака ня ловіцца рыба. Мінакі тлумачаць дарогу — мы зь сябрамі распытваць перад ім не пасьпяваем. Кандуктарка на маршруце аўтобуса ад "турэмнага" скрыжаваньня віншуе — шчыра, але, бачна, ужо звыкла.

— Ну, прывіт, Дніпро...

Адчуваньне, нібыта мы — нейкі атрад, што нікому ня дасьць больш назваць нашыя родныя, кроўныя мовы — "дыялектамі..."

Зэкі, якія засталіся без свайго "Бандэры", глядзяць другі магілёўскі тэлеканал — ён хоча даслаць ім песьню. Гэта каштуе амаль як наш праезд у Менск. Скінемся? Адмаўляецца. Замест песьні ён пашле ім зь Менску "дачку" ў пасылцы.

— ... Прывіт, Дніпро!

Наша агульная, беларусаў і ўкраінцаў, рака. Што ж ты ўцякаеш ад нас да мора так імкліва? Уцякаеш — і застаесься. Наша агульная Воля — Дняпро...

— Станеш прэм'ер-міністрам, — варожыць Шаптыцкаму на вакзале незнаёмая вясковая дзяўчына. Яна не паступіла, здаецца, у інстытут...

+++

Калі ўкраінскі нацыяналіст вітаўся з Воляй, "органы" якраз хапалі расейскіх журналістаў, нашых суайчыньнікаў, маіх калегаў. "Маўчы, калі ня хочаш сваркі", — гэта пры сустрэчы на шэсьці 27 ліпеня. Твая Воля — наша незалежнасьць. Пасьля выступу на мітынгу дзяўчаты бяруць аўтографы...

Мая Радзіма — інтэрнацыянальная зона.

А ў вас там, ва Ўкраіне, у турмах бываюць вакантныя месцы?

+++

Цягнік сыходзіў праз чатыры раніцы. І таксама а чацьвертай... За дзень да яго ледзь ня здарылася нешта брыдкае. Кроў, бітае шкло, зноў краты?

У РАУСе, дзе ён мусіў зноў "адмячацца", нехта з супрацоўнікаў сказаў: "Той самы Шаптыцкі?" Гэты чалавек некалі прынес украінцам пачак цыгарэт. А ў пасольстве сустрэлі так:

— Вы что, не видите — сегодня нет приёма? — і толькі пачуўшы прозьвішчы: — Ой, мы дужа рады!

— Так рады, што забыліся на родную расейскую мову і ўзгадалі маю ўкраінскую?!

Уяўляю тую нямую сцэну!

— Ты бачыла турэцкую амбасаду? Сьцяг і герб!.. Консульскі аддзел нашай побач — як піўбар! Нашто былі тыя ахвяры, тысячы расстраляных, мільёны палітвязьняў? Нашто была мая адсідка? Каб яны гутарылі па-расейску, паводзілі сябе па-хамску? У цябе няма нашага сьцяга, каб ім прэзэнтаваць, калі Ўкраіна ня мае грошай на сьцягі?

За гэты сьцяг расстралялі пры Сталіне двух ягоных продкаў. За яго ваяваў генэрал-прадзед, сядзеў у лягерах прадзедаў брат — мітрапаліт...

— Я бяру назад усе нядобрыя словы пра беларусаў. Нельга прабачыць гэтым, сваім! А ў вас хоць чэсна — народ за чырвоны сьцяг, і ўсё! Чаго чакаць ад беларусаў, калі такія людзі, як у амбасадзе, прадстаўляюць Украіну?!

+++

Чуткі, што ва Ўкраіне апазыцыя мяркуе ўзнагародзіць Графа ордэнам, пацьвердзіліся. Ордэн маюць там адно чатыры ці пяць палітыкаў і журналістаў. Усе яны адсядзелі за палітыку і журналістыку розныя тэрміны. Але Андрэй Шаптыцкі ад узнагароды адмовіўся.

Ордэн меў назву — "Голас гукаючага ў пустэльні"...

Між тым, у так званым цывілізаваным сьвеце даўно і шмат кажуць і пішуць пра ўплывы сэксуальнае арыентацыі на лёс і зьмест культуры. Галоўныя тэмы літаратуры ўсіх часоў і народаў — каханьне і сьмерць — быццам бы вычарпалі сябе на матэрыяле звыклых дачыненьняў і найбольш пасьпяхова рэалізуюцца ў раманах пра тыя самыя разборкі геяў, альбо пра табуяванае грамадзтвам каханьне паміж Рамэо і Рамэо, альбо пра страту сябра, які захварэў на AIDS.

Падставаў для такое гутаркі хапае і ў нашым традыцыяналісцкім бытнаваньні. І калі ты займаесься культуралёгіяй, то разпораз міжволі спатыкаеш гэтую тэму. То нехта шаптане на вуха, што калега N. — "галубой". То нейкі фан шле ў кожны нумар газэты абвесткі, у якіх просіць адгукнуцца хлопца да 20-ці. То зьяўляецца аўтарка, якая напавер аказваецца мужчынам, а тэксты яе — пра літаратуру — непазьбежна выходзяць на праблему плоці.

Словам, назьбіраецца дастаткова імпульсаў, каб агледзець на вышэйазначаны прадмет нашу родную беларускую традыцыю і культуру.

Праўда, самы паверхневы папярэдні агляд ператвараецца ў рашучае адштурхоўваньне ад тэмы. У беларускай вёсцы вам хутчэй прыгадаюць прыклады заафіліі, чым аднаполага каханьня. Літаратура таксама адштурхоўваецца. Падставаў для адвольных дапушчэньняў, вядома, хапае — і ў дачыненьні да пэрсанажаў, і ў дачыненьні да аўтараў. Але як можна што-кольвек дапускаць, калі самае падозранье ў гомасэксуалізьме лічыцца ў нас або пікантнасьцю або абразай. (Жартам успрымаецца сустрэтае пад трыццатым годам нашага стагодзьдзя прозьвішча Гея — сакратара ЦК КПБ, які пісаў даносы ў Маскву на Саюз Вызваленьня Беларусі і давёў Янку Купалу да спробы самагубства.)

Так ці інакш, першыя рэальныя сьведчаньні зьяўляюцца толькі ў апошнія гады. Фотамастачка Алена Адамчык робіць сэрыю здымкаў гомасэксуалістаў, у Купалаўскім тэатры на гэтую тэму ставяць п'есу "Касьцюмер", а першая літаратурная згадка — навэла Адама Глёбуса "Гомік" у ягонай кнізе "Дамавікамэрон".

Глёбус распавядае няхітрую гісторыю пра тое, як гомасэксуаліст заляцаецца ў менскім парку Чалюскінцаў да юнака. Той кліча свайго брата фізкультурніка, каб правучыць "галубога". Яны ідуць у Батанічны

— Ці маюць геі сяброў? Ці могуць яны паміж сабою сябраваць? — Жанчына, якая задала мне гэтае пытаньне, жыве ў Нью Ёрку, яна ўладальніца аднае з найдаражэйшых рэстарацыяў у горадзе, геяў ведае ўсё сваё жыцьцё, таму я прыняў яе пытаньне за шчырае і шокавае, бо яно выкрывала існаваньне вузкай, але бяздоннай прорвы паміж намі.

Тады я ўласна і зразумеў, якой таямнічай культурай ёсьць сьвет геяў — не гомасэксуалізм, бо той — папросту звычайная эратычная схільнасьць, а менавіта сучасная амэрыканская гейская культура, што значыць, адметная манера сьмеху, грашовых разьлікаў, парадкаваньня важных справаў, надаваньня значэньняў усяму ад тэкстаў песень да бліскучых як люстра вайсковых ботаў. Тут не дапаможа ніводнае з вызначэньняў субкультуры, бо геяў выхоўваюць гетэрыкі — гетэрыкамі; здаецца, што нейкі прымус кажа ім шукаць іншых мужчынаў, хоць яны уступаюць у гета з уласнае волі, і як толькі робяць выбар,

ЭДМУНД УАЙТ (нар. 1940) – амэрыканскі празаік, эсэіст, крытык і публіцыст, галоўны прадстаўнік гейскай літаратуры, прызнаны як адзін з найлепшых стылістаў сучаснай амэрыканскай літаратуры. Дзьве першыя кнігі Fergetting Elena (1973) і Nocturnes for the King of Naples (1978). У 1985 зьяўляецца раман Caracole. Аўтабіграфічныя кнігі A Boy's Own Story (1982) і The Beatiful Room Is Empty (1988) складаюць першыя часткі трылёгіі, заключная кніга якой The Farewell Symphony – выйшла сёлета. Акрамя гэтага, Эдмунд Уайт – аўтар зборніка апавяданьняў Skinned Alive (1995) і ўжо славутай, прызнанай за шэдэўр свайго жанру, аўтабіяграфіі Жана Жэнэ.

Раман з Раманам

Калі забіваюць вядомага артыста і нерасьсьледаваньне справы тлумачаць разборкамі гомасэксуалістаў, застаецца толькі разьвесьці рукамі. Аднаполага каханьня ў нас няма і не павінна быць паводле вызначэньня. Але ўрэшце выходзіць так, што гомасэксуалізм перамагае, бо існуе надалей і набывае пры гэтым рысы барацьбы за свабоду і правы чалавека, пэўную гераізацыю, становіцца модным. Тэма, якой нібыта не існуе ў культуры, падкрадаецца "з задняга ходу", і наносіць адчувальныя страты: маралі (чалавека забілі — ну й ладна), сцэне (згубленыя таленты), культуры (немагчымасьць асэнсаваньня таго, чаго няма і не павінна быць).

Асабіста мне тут найбольш цікавае разьвіцьцё сюжэту. Бо гейская меншасьць, як і любая іншая, ня можа здаволіцца статусам меншасьці. Ужо сёньня толькі ў ЗША працуюць чатыры дзясяткі гейскіх кнігарняў, а новая гейская апавесьць прадаецца амаль удвая большым накладам, чым новая апавесьць гетэрасэксуала.

Здымак Алены Адамчык

Але што далей? У тэарэтычных распрацоўках Уайта я не знайшоў нейкага пэўнага бачаньня пэрспэктывы. Ягонае бачаньне патанае недзе ў смузе нявызначанасьці лёсу сям'і. Традыцыйная сям'я як грамадзкі інстытут не настолькі мабільная ў пошуку новых формаў і ўласнага філязофскага забесьпячэньня. Практанты сямейных дачыненьняў больш занятыя праблемамі тактыкі, але не стратэгіі. І тут тэарэтыкі аднаполага каханьня атрымліваюць пэўную інтэлектуальную фору. Сапраўды, кажуць яны, шматгадовае сужэнства двух людзей можа надакучыць, і грамадзтва спрабуе вызваліцца ад састарэлых паняткаў вернасьці і рэўнасьці. А потым, кажуць яны, у кожным чалавеку закладзеная цікавасьць да ўласнага полу, і грамадзтва пачынае лагадней пазіраць на бісэксуалізм. І тут, кажуць яны, у гульню ўступаем мы, якія зрабілі свой выбар на карысьць свайго полу. Здаецца, яшчэ крыху, і яны назавуць сябе людзьмі будучыні...

Дарэчы, што да традыцыйнай сям'і, то геі гатовыя адказваць гетэрыкам той самай нялюбасьцю, якой гетэрыкі здаўна надзяляюць геяў. Словам, што лепей? Прынамсі ў Амэрыцы гейская праблематыка ўжо выйшла на той узровень, каб такое пытаньне не здавалася недарэчным.

Але тое ў Амэрыцы. У Беларусі, дзе толькі пачынаюцца часы нацыянальнага станаўленьня і куды далятаюць пакуль толькі павевы з вольнага сьвету, пра ўсё гэта не гавораць. Але няма сумневу, што сьледам за першымі сэкс-шопамі і эратычнымі газэткамі, гейская культура разам са сваімі выданьнямі, барамі і культамі зьявіцца і ў нас. Гэтаксама, як гэта адбылося, напрыклад, у Вільні, калі Літва прайшла пік свайго нацыянальнага адраджэньня.

Пакуль жа мы гаворым пра немаральнасьць і пра негатоваснь грамадзтва даваць сабе рады і ў такіх складаных сытуацыях (чалавека забілі — дык то ж "галубога"!).

Яшчэ, што тычыцца характарыстыкі беларускага стаўленьня да гомасэксуалізму, мне згадваецца такі выпадак. Ён адбыўся летась увосені, калі беларускія памежнікі затрымалі выдаўца "Нашай Нівы" Паўла Жука з тыражом спэцвыпуску газэты.

— Што, — з дакорам спытаў памежнік, — ня любіце Лукашэнку?

— А чаму я павінен яго любіць? — адказаў Жук. — Я жанчын люблю...

Сяргей Паўлоўскі

Эдмунд Уайт

ПЛОЦЕВАЯ КУЛЬТУРА

гэты выбар зьмяняе іхнае жыцьцё, а нават іхныя целы, і ўжо напэўна іхныя гардэробы. Шмат геяў жывуць сярод гетэрыкаў як мароны, ці як гішпанскія жыды, якія ў часы інквізыцыі ўдавалі, што навярнуліся на хрысьціянства, але надалей у сутарэньнях адпраўлялі свае старыя абрады ў самоце і найвялікшай таямніцы. Геі не нагадваюць ані каляровых, ані жыдоў, бо самі часта і каляровыя, і жыды, а іх пачуцьцёвыя сымпатыі не датычаць ані колеру скуры, ані рэлігіі, хоць яны і прывялі да ўзьнікненьня культуры, якая нагадвае культуру этнічных меншасьцяў. Няшмат жыдоў маюць сярод сваякоў хрысьціян, тады як большасьць геяў маюць гетэрасэксуальных братоў і сёстраў, прынамсі бацькоў. Шмат амэрыканскіх жыдоў былі выхаваныя ў пачуцьці прыналежнасьці да Абранага Народа, у перакананьні, што ён адначасова лепшы і горшы за хрысьціян, тады як кожны гей адкрывае сваю гейскую натуру з пачуцьцём болю і палёгкі, са шкадаваньнем, што стаўся выключаны з племені, і з радасьцю, што знайшоў разгадку таямніцы.

Геі не складаюць нацыянальнасьці. Яны не як chicanos, не як амэрыканцы італьянскага ці ірляндзкага паходжаньня, але яны — адна з найбольш актыўных палітычных сілаў вялікіх гарадоў, такіх як Нью Ёрк, Філадэльфія, Вашынгтон (дзе геі і каляровыя выбралі на бурмістра Марыёна Бэры), Х'юстан, Лос Анджэлес і Сан Францыска. Геі не складаюць адметнай этнічнай групы, але яны меншасьць, не складаюць polis, але яны палітычная група, не складаюць нацыянальнасьці, але маюць уласныя строі, звычаі і дыялект, яны не сацыяльная кляса, але эканамічная сіла.

Уявім сабе рэлігію, якую хтосьці прымае

Здымак Бруса Вэбэра

насуперак волі бацькоў — і насуперак сабе. Уявім сабе расу, прадстаўніком якой нехта становіцца гадоў у шаснаццаць ці ў шэсьцьдзесят, не зьмяняючы пры гэтым ані колеру скуры, ані валасоў (хіба што ад загару ці ў цырульніка). Уявім сабе стэрыльны народ без нашчадкаў, але з доўгай, не да канца пазнанаю лініяй продкаў, бязь ясна акрэсьленага самавызначэньня, затое з саліднай гісторыяй.

Ніводзін гомасэксуаліст не прымае свайго гомасэксуалізму за рэч відавочную. Ён мусіць яго дасьледаваць, абмацаць, праслухаць. З гэтай прычыны ўсе гомасэксуалісты — "гейскія філёзафы" ўжо з-за таго, што самі мусяць сябе прыдумляць. У пэўны момант з чалавекам адбываецца гештоўная зьмена, ён дасягае іншага стану, уваходзіць на нязнаную тэрыторыю, якую можа спазнаць намаганьнямі ўласнае волі. Напэўна ўсе мы часам перажываем уражаньне, што нашае жыцьцё штучнае, нібы расплаўленае шкло, якому шкляр прафэсійным рухам надае кшталт; аднак нікому акрэсьленьне homo faber (у значэньні як "фабрыкатара", вытворцы, так і "конфабулятара") не пасуе лепш, чым гомасэксуалісту.

Часам я спрабую ўявіць сабе, як гетэрыкі — а я тут ня маю на ўвазе фундамэнталістаў, невукаў, каменных нявіньнікаў ці сьвятошаў, — але адукаваных гетэрасэксуалістаў зь вялікіх гарадоў — глядзяць на геяў. Калі бачаць геяў, каго яны бачаць? Вусы, мускулістае цела ў чорных джынсах і безрукаўках, татуіроўкі (лінія аплятае двухгаловую цыгліцу), што кідаюцца ў вочы. І што яны думаць? (Яны, гэта значыць у нашым выпадку, hypocrite lecteur, ты, чытач.) Ці бачыш ты нешта, што на першы погляд зьдзіўляе і нават выклікае зайздрасьць у заўсёды маладым, натрэніраваным целе гэтага саракагадовага клёна з нахабным позіркам і мяккім голасам? Калі ты жанчына, ці гэтая бязьмерная заклапочанасьць уласным выглядам у дарослага мужчыны для цябе... калі ўжо ня нешта абразьлівае, то прынамсі безгустоўнае? А калі ты мужчына, ці прыводзіць цябе ў ярасьць факт, што той біцюх вызваліўся з вупражы, што ён занадта свабодны, занадта вольны, што так лёгка зрабіў сабе з мужчынскае плоці пасьмешышча?

Ці можа геі падаюцца табе клапатлівымі сатырамі, дэманамі сэксу, каля якіх небясьпечна ўпусьціць мылка, альбо хілымі франтамі, далікатнымі ляснымі німфамі, замкнутымі ў масіўных галінах дрэваў альбо ў гэткіх самых канечнасьцях цела? А можа ты гетэрык-сыбарыт, які вітае геяў

Працяг на стар. 20

БІ

АПАТЭОЗ ГУМАНІЗМУ

Іх называюць каротка, па-жаргоннаму, як нейкую ня надта патрэбную, але бліскучую рэч — bi. Паводле Фройда, усе людзі бісэксуальныя і выпадзеньне з нормы — гэта скрайні гетэрасэксуалізм. На маю думку, сам сабою такі погляд гуманістычны. Трэба быць закаханым не абстрактна ў мужчыну ці жанчыну, а найперш у чалавека.

Разам са спадам агрэсіі ў поп-культуры пачалося нарастаньне бісэксуальных тэндэнцыяў у музыцы, кіно, модзе. Магчыма, гэта зьвязана з гуманізацыяй усёй нашай эпохі. Дастаткова зьвярнуцца да MTV, пагартаць часопісы модаў, альбо паглядзець якое вартае ўвагі кіно. Зорка кіно ці эстрады мусіць падабацца ўсім, і тым, у каго пад бялізнаю XY-храмасомы і тым, хто носіць строй, традыцыйна адпаведны XX. Як Гамбровіч любіў маладосьць наогул, не зважаючы на праблему выбару партнэра для гульняў з плоцяй, гэтак і ўвесь сьвет вечна юных бісэксуалаў — сьвет для сяброў. Па сканчэньні сусьветных войнаў, з канцом бэрлінскага муру прыйшоў канец і вайне полаў.

СЭКСУАЛЬНАЕ ЗАМІРЭНЬНЕ?

Калі вы яшчэ не гатовыя сёньня пераўтварыцца ў субтыльнага бясплоцевага падлетка, то можна, дзякуючы парфумэрам, паспрабаваць больш спакойную варыяцыю: водары unisex, прызначаныя і для мужчынаў, і для жанчын. Супэрсучасна: CK One ад Кельвіна Кляйна, Gieffeffe ад Джанфранка Фэрэ, альбо Paco ад Пака Рабана.

Менавіта Кельвін Кляйн, абраўшы сабе за мадэль Кацю Моз, крохкую астэнічную дзяўчынку, намацаў пульс мрояў бісэксуальнага юнацтва: дзяўчына — хлопец — пекны андрагін. Сапраўды, у пятнаццаць гадоў (генэрацыя X) адкуль ты можаш ведаць, якая твая плоць, пакуль ня ўпэўнены ў тым, хто ты такі наогул... Кляйн першы расчыніў дзьверы ў акіян бісэксуальнасьці, пырскнуўшы на мазгі публікі CK One.

Gyvechy пазалетась выдала на рынак Xeryus (як гучыць!). Адпаведна прызначэньню і паху, рэкляма была агрэсіўна мужчынскаю: "жалезны" торс празь лілёва-папяловае шкло на постэры і цяжкі канат са стальнымі кольцамі. Але летась крок у крок з модаю выпушчаны ўжо і Gyvenchy Rouge, амбівалентны паводле паху і стылю. Добра вядомыя жаночыя парфумы за апошнія гады атрымалі і сваіх "брацікаў": Cerruti pour homme рэклямуе Пітэр Каёт ("Горкая поўня") у тумане, а новы мужчынскі Dune рэклямуе фэмінізаваны дзяцюк у белым фрэнчы... Лёгіка: ня страціць сталых кліентак і прыдбаць кліентаў, якія хацелі б быць бліжэйшымі да "слабога" полу. Такім чынам, гэта ўжо пераходная фаза. Жан Поль Галцье, славуты кутур'е, кумір лесьбіянак і ўсіх бісэксуалаў, пайшоў далей, прапануючы "актыўныя" пахі для актыўных асобаў рознавэктарнае арыентацыі.

Сёньня Галцье ўжо жывая легенда: мадэльер, дызайнэр, культурны герой. Яшчэ ў 80-я ён распрацаваў мадэлі верхняе вопраткі, якая нагадвала ніжнюю бялізну, асабліва красамоўнымі былі карсэты для хлопцаў. Зрэшты, у тыя гады тэндэнцыя ахапіла нават Японію — Ісэй Міякі і Рэй Кавакуба прапанавалі стыль "пад хлопчыка". А ў Эўропе пачатку 80-х становіцца прыкметаю шыку адпавядаць у адзеньні Бой Джорджу зь ягоным "Калчэр клаб".

Быць пасярэдзіне — значыць любіць жыцьцё. Кахаць чалавека —значыць дазваляць яму мяне выпрабоўваць. Каханьне і аддае, і адбірае. Каб жыць поўным сэнсу жыцьцём, мы павінны больш ведаць пра каханьне, пра тое, як унесьці яго ў жыцьцё. Напрыклад з парфумаю, ці з новай кашуляю...

НЯ БЛЫТАЦЬ!

Гомасэксуалісты агрэсіўна ставяцца да адкрытасьці бісэксуалаў. Застаючыся другой, паводле Фройда, скрайнасьцю, яны разглядаюць бісэксуалістаў, як здраднікаў. На думку гомасэксуалістаў (у першую чаргу, лесьбіянак), bi стыдаюцца прызнаць, што яны цалкам homo, і маладушна пакідаюць сабе шлях да адступленьня.

Па вялікім рахунку, розьніца палягае на тым, што гомасэксуалісты не прызнаюць кампрамісаў. Рэўнасьць для бісэксуалаў — рэч адносная, архаічнае пачуцьцё эгаістаўласьніка. Для bi ідэал не мужчына ці жанчына, а ЯНО. Гэты ідэал складаецца не з афішаваньня полавых прыкметаў, а ў іх мікшаваньні ў салодка-коўткі трунак: 90x60x90! Для іх комплекс адрынутых ізгояў — нонсэнс. У гэтым і ёсьць сапраўдная ідэя каханьня — ставіць высока кожнага, незалежна ад таго, хто ён. Каханьне да кожнай істоты не істотнае. Сэнс у каханьні да чалавека, не абмежаванае ніякімі ўмовамі. Можна не прызнаваць выбару іншага чалавека і можаце вучыць гэтаму дзяцей. Але трэба прызнаць асобу, на якую патрапіў выбар. Адмаўляючы погляды групы людзей, ніхто ня мае права ігнараваць гэтых людзей!

Праўда, каханьне можа паставіць іншыя пасткі. Напрыклад, крывадушнасьць эгаізму... Ужо ў сямідзясятыя стодзівы року, якія ніяк не пакутавалі ад комплексаў у маладосьці, а сёньня пачцівыя грамадзяне, добрыя бацькі ідэальных сямействаў, і не спрабавалі хаваць сваіх гомасэксуальных кантактаў. Някепская кампанія: Ігі Поп, Дэвід Боўі, Мік Джагер... Пры тым яны засталіся пасярэдзіне, для ўсіх. Але ў сямідзясятыя яны стваралі "равучую" хвалю, іх нонканфармізм меў і свае рынкавыя межы. Натуральна, прызнаньні ў сваім полавым лібэралізьме яны прагалосілі значна пазьней, калі ўжо мелі алібі: маўляў, я не гомасэксуаліст, мяне папросту усе кахаюць. Часта мы глядзім на каханьне эгаістычна, як на нешта такое, чаго ХОЧАМ... Праз гэта і не перакрочылі сямідзясятнікі.

НЕ НАВІНА

Зэўс кахаўся зь Ледаю, але яму прыглянуўся і Ганімэд, які кепска скончыў праз рэўнасьць Геры... Гісторыя культуры Бі старая, як і праблемы юнацтва. Можна разгарнуць альбомы, прысьвечаныя эпосе Рэнэсансу, дзе хлопчыка не адрозьніш ад дзяўчыны, дзе нават "Джаконда" — шэдэўр бісэксуальных памкненьняў Леанарда, на якой пакаленьні з суворых эпохаў зламілі сабе галаву. Альбо можна заглыбіцца ў томік францускай мастацкай літаратуры XVIII ст., зь якое гэтак сочыцца шчырая бісэксуальнасьць, як і з парыкоў, панталёнаў і кантаноў часоў рокако.

Але безумоўна, усе высілкі папярэдніх часоў не дараўнаеш да belle epoque, мяжы мінулага і нашага стагодзьдзяў. Эпатаж у салёнах Парыжу стварала Жорж Санд, якая насіла мужчынскія строі, паліла цыгары і кахала бяз розьніцы плоці. Не дараўналася зь ёю ў таленце першая жонка Гагена, але як яна хацела б быць такою ж (а каб была іншаю, ці быў бы Гаген на Таіці?)... Вечна юны Артур Рэмбо быў геніем бісэксуальнае паэзіі, перад усім паэзіі ўсеабдымнага каханьня. Дзеля гэтага каханьня, дзеля Рэмбо, "князь паэтаў", Вэрлен пакінуў горача каханую жану, няшчасную (за Вэрленам) Матыльду, якая пасьля ягонае сьмерці пакіне выбітны дакумэнт эпохі — "Успаміны пані экс Поль Вэрлен". Марлен Дзітрых,

ПЛОЦЕВАЯ КУЛЬТУРА



Працяг са старонкі 19.

вокрыкамі радасьці ў перакананьні, што апынуўся ў сьвятыні ўсіх свабодаў, дзе царус сэксуальная разбэшчанасьць самага рознага кшталту? Такія сыбарыты часта пазіраюць на геяў як на паплечнікаў, вызваліцеляў і ахвяраў у краіне, алергічна адчувальнай на адмысловыя прыемнасьці.

А можа геі цябе папросту раздражняюць? Ці яны для цябе бліскучая драбностка на пэрыфэрыі ўспрыманьня? Памылковыя, непаслухмяныя атамы, якія немагчыма ўтаўчы ў якую-небудзь звычайную грамадзкую часьцінку?

А як геі бачаць гетэрыкаў? У цудоўным рамане Эндру Галерана Nights in Aruba аўтар задумваецца, "што было б, калі б я быў галавой сям'і, як бы зараз жа зьніклі ўсе мае праблемы, калі б былі замененыя іншымі. Я ня мусіў бы засмучацца велічынёй майго пэніса, абмежаваньнямі, зьвязанымі з узростам, цяжкасьцямі ў пошуках каханьня; я засмучаўся б з прычыны стану гіпатэкі, пераймаўся б вучобай дзяцей, астмай маёй найменшай дачкі, расчараваньнямі ў Shearson Loeb Rhoades". Такія разважаньні характэрныя для геяў якраз таму, што канцэнтруюцца на мужчыне-як-галаве-сям'і, бо так як XIX-вечнай курве патрэбная была выхаваная ў кляштары дзяўчына, якою тая часта сябе ўяўляла, гэтаксама сёньняшні гей мусіць абражаць і шанаваць тую выдуманую мужчынскую пачвару, paterfamilias, мусіць высьмейваць яго і зайзросьціць яму, хоць тое вымерлае стварэньне жыве сёньня толькі ў гейскіх фантазіях. Тымчасам рэальны галава сямейства бавіць час удзелам у сэансах крыкатэрапіі або ў занятках tai-chi, закрэсьліваючы рубрыкі аддзелу прыватных аб'яваў у "Village Voice" і выкручваецца ад візытаў да сваіх дзяцей, двух збунтаваных падлеткаў, якія жывуць у фэміністычнай камуне зь ягонай былой жонкай, лесьбійкай, якая займаецца ганчарствам, жанчынай зь вялікай вынаходлівасьцю і ўражлівасьцю, хоць і мала энэргічнай.

Найбольш відавочнае адрозьненьне ў тым, што гетэрасэксуалізм сам сабою ўзгадняе абедзьве плоці, тады як гомасэксуалізм мусіць няспынна ствараць новыя палярызацыі. Без палярызацыі не народзіцца сэксуальнае жаданьне, прынамсі ў такой форме, якую сфармавала наша культура. Нічога дзіўнага, што некаторыя геі шукаюць найбольшых супрацьлегласьцяў (кагосьці іншай расы, мовы, іншага паходжаньня, ўзросту); нічога дзіўнага, што нават такі дэкляраваны гетэрык як Флябэр паддаўся ўрэшце нейкаму хлопцу, які прапанаваў свае паслугі ў Эгіпце — ягоная экзатычная постаць прынесла Флябэру адчуваньне розьніцы, безь якой не нарадзілася б жаданьне. Іншыя геі шукаюць блізьнятаў — каб каханак мог прадставіць ім самога сябе, граюць па чарзе то бацьку, то настаўніка, то сына, то хроснага альбо бога.

Праз тое, што кожны гей кахае мужчын, ён вучыцца найперш, як супакоіць дзікі дух мужчынскага ego. Незалежна ад таго, які —інэртны, цнатлівы або нясьмелы можа быць у спальні новы каханак, за сталом ён пераменіцца ў аўтакрата. Жаночыя часопісы публікуюць шматлікія артыкулы на тэму геяў і гетэрасэксуальных жанчын; я б сказаў, што іх лучыць, акрамя прыхільнасьці да некалькіх супольных сэксуальных тэхнікаў, багаж інтуітыўных ведаў, датычных гэтае крэпасьці, гэтага тырана, гэтага эгатыста, які даводзіць да шаленства, гэта значыць, прадстаўніка мужчынскае плоці. Калі сустракаюцца два геі, асабліва, калі ўжо гасьне першы рамантычны парыў сэрца, які наказвае ім клапаціцца пра партнэра, пачынаецца барацьба за перавагу ў размове, нараджаецца канфлікт, які ёсьць толькі сымптомам больш сур'ёзных разыходжаньняў, датычных кожнае тэмы, пачынаючы ад пытаньня дзе жыць і як бавіцца.

Як бачым, гейская пара нагадвае такім чынам гетэрыйскі дуэт з самаўпэўненай, вызваленай жанчынай. Але хоць большасьць маладых, гетэрычных жанчын, прынамсі тыя, якіх я ведаю, чуйна ахоўваюць свае доўгахвалевыя інтарэсы (кар'еру, стыль жыцьця, эмацыйныя патрэбы), аднак яны гатовыя саступіць мужчыну ў тых дробных, прыватных пытаньнях, неабходнях для стварэньня суполавае гармоніі.

Адным з дабратворных аспэктаў гетэрыйскага жыцьця ёсьць тое, што жанчыны думаюць пра мужчын як пра "асобаў", як пра паўнакроўных, складаных істотаў, якія перадусім сумоўныя, па-другое, сямейныя, па-трэцяе, кахаюць альбо каханыя, а ўрэшце цялесныя. Хачу тут далікатна заўважыць, што жанчыны кепскія судзьдзі мужчынскіх вабнотаў; яны лёгка паддаюцца на такія павярхоўныя рысы як лаяльнасьць, надзейнасьць, чары, пачуцьцё гумару. Жанчыны не ацэньваюць, прынамсі не ацэньвалі мужчын праз прымат нагіх торсаў культурыстаў. Але мужчыны, гетэрыкі ці геі, пачынаюць з выгляду, з таго найбольш відавочнага знаку якасьці, вартасьці, цаны. Скажам так, жанчыны бачаць у мужчынах герояў доўгага сямейнага раману, у якім яны зьяўляюцца з поўным багажом фрэналёгіі, генэалёгіі, пэўнай рысаю раздражняльнай і некалькімі рысамі сымпатычнымі; мужчыны ж успрымаюць сваіх партнэраў (мужчын або жанчын) як аўтамабілі, маркі, якія зараз жа кідаюцца ў вочы, робяцца аб'ектам ацэнкі, зайздрасьці. Жанчына хацела б, каб зайздросьцілі добрасьцям яе мужа, яго характару, мужчына хацеў бы, каб зайздрасьць узбуджала прыгажосьць, выключнасьць і статус ягонай жонкі — сіла яе перавагі.

Падае колькасьць нараджэньняў, павялічваецца колькасьць разводаў, а папулярная культура (кіно, тэлевізія, тэксты песень, рэкляма, мода, журналістыка) так глыбока і безвыходна сэкулярызаваная, што так званае рэлігійнае адраджэньне ня мае большага значэньня, чым мода на кабукі ў Японіі, якая жыве на транзыстарах — часовы крок назад, лёгкае націсканьне на тормаз. У такім сьвеце зьмены адбываюцца так хутка, што дзеці, пачаўшы школьную навуку, няшмат чаму могуць навучыцца ад сваіх бацькоў, бо мусяць вучыць новыя формы паводзінаў ад сваіх раўналеткаў і засвойваць новую інфармацыю ад спэцыяльных інструктараў. У выніку падае бацькоўскі аўтарытэт, а межы паміж пакаленьнямі становяцца ўсё больш пагражальнымі. Ды бацькі не шкадуюць пра страту кантролю над дзецьмі, бо ўсю сваю энэргію выдаткоўваюць на культываваньне ўнутранага "я" ў гэтым масавым пераходзе нашага грамадзтва ад этыкі самаахвяры да этыкі ўлагоджваньня сябе, у працэсе так званай арыстакратызацыі сярэдняй клясы, які запоўніў вольныя ад войнаў фрагмэнты нашага стагодзьдзя на індустрыйным Захадзе.

У сучасным сьвеце XIX-вечны экспэрымэнт са шлюбам па каханьні (ніколі ў сапраўднасьці немагчымы) панес поўную паразу. Не зусім ясна, у чым сутнасная прычына гэтага пройгрышу; нам перашкаджае ўсепаглынальны, хоць насамрэч неістотны навык псыхааналізаваньня кожнае крызы (адсюль тыя несканчальныя спэкуляцыі таннай прэсы на тэму Безадказнага Мужчыны і Нежаноцкай Жанчыны, або парадаксальныя, невыканальныя парады чытачам, каб "ішлі на ўсё — мелі сем'і, кар'еру, сужэнства, раманы і хвіліну самоты"). Нам здаецца, што параза інстытуцыі сужэнства — гэта параза адзінак, якім яно не ўдалося — тут вінаватыя заганы характару, нясталасьць, брак прывязанасьці і вытрымкі. Грамадзянскае сужэнства мелася быць агмянём сяброўства, каханьня і сэксу ў інстытуцыі, якая адначасова была інстытуцыяй сямейнай і гаспадарчай. І толькі пільны кантроль мог устрымаць выбух такой цяжкай, дрэнна замяшанай сумесі. Калі геданізм шасьцідзясятых гадоў залагодзіў гэтае напружаньне, людзі пачалі прызнавацца, што сяброўства ўтаймоўвае плоцевыя апэтыты (калі партнэры становяцца сваякамі, адгукаецца табу кровазьмяшэньня) і што раман паводле сваёй натуры — гэта насамрэч штосьці мімалётнае, што ўвесь час аднаўляецца з прычыны бясконцае прапановы новых партнэраў. Ані сэксуальнае, ані рамантычнае захапленьне, такое капрызьлівае, такое страснае, такое нясталае, ня можа служыць базай трывалага саюзу.

Вось жа менавіта такое каханьне ведаюць шмат гейскіх параў. Калі ўсё разьвіваецца добра, два геі спатыкаюцца праз сэкс, становяцца каханкамі, перажываюць буру рэўнасьці і ўвяданьне жарсьці, разьвіваюць агульны інтарэс (якоесьці гобі, агульны бізнэс, дом, кола прыяцеляў) і прызямляюцца ў доўгатэрміновым, сапраўды асэксуальным саюзе, які не настолькі бесьцікаўны, як сяброўства, ані такі сэйсьмічны як жарсьць, ані такі поўны супярэчнасьцяў, як братэрства. Зразумела, што такія пары могуць учыніць пекла новапрыбыламу, які ня зможа заўважыць, што Боб і Фрэд дзеляць ня толькі агульны пакой. Яны могуць мець асобныя спальні і рэгулярных ложкавых партнэраў па-за саюзам, а нават каханкаў, але Боб прыглядаецца да захапленьняў Фрэда ўражлівым, чулым да найдрабнейшых нюансаў вокам, і ў пэўны момант уключыцца ў гульню, каб выгнаць патэнцыйнага канкурэнта.

Мне здаецца, што для большасьці гетэрыкаў такога кшталту саюзы выглядаюць нават больш скандальнымі, чым слынныя сэксуальныя выбрыкі геяў. Бо ж яны ня маюць назвы, міталёгіі, ніякага прыватнага ці публічнага пацьверджаньня, яны амаль нябачныя, нават для іх удзельнікаў. Калі спытаць у Боба, чаго яму трэба, ён мог бы сказаць, што патрабуе "сапраўднага"

якая шчыра адносіла сябе да сярэдняга полу, была закаханая ў Эдыт Піяф, сяброўкі пасыпяхова мелі ў фаварытах і мужчынаў, і жанчын.

Але ніводная з папярэдніх эпохаў не адкрывала ў бісэксуалізьме радовішча бізнэс-ідэяў. Мэркюры, Джэксан, Мадона, ён, яно і яна разгарнулі перад сьветам цэлы атляс верагоднасьцяў, як ніхто да іх, справаказавалі цэлую хвалю ўласна сэксуальных сымпатыяў сваёй музыкай, сваім іміджам, сваім інтымным жыцьцём навонкі. Ці наадварот, юны сьвет захацеў іх пабачыць такімі, больш адкрытымі, больш чалавечнымі?..

РУШЫЦЬ ДАЛЕЙ

Мы можам не надаваць сур'ёзнае ўвагі падлеткам, якія маршыруюць у United colors of Benetton, каб выйсьці зь яго бяз расы і полу. Маўляў, і дваццаць гадоў назад была праблема са стрыжкамі і джынсамі. Але мы ня можам абмінуць таго, што ўжо ў 1995-м менавіта Галцье было даручана ўручаць узнагароды MTV. Сёньня ўжо нікога ня зьдзівіць самы экстравагантны (у сэксуальным пляне) выбрык зоркі любое велічыні. Паводле сацыяльных апытаў, у амэрыканскіх універсытэтах колькасьць бісэксуалаў за апошнія восем гадоў выраслa на 160 працэнтаў. Мода робіць сваю справу... З глябальным пацяпленьнем палітычнага клімату ў Эўропе пацяплелі і норавы. Сталонэ ня ў модзе, а Шварцэнэгер грае... цяжарнага біяхіміка. Менавіта гэтае "цёплае" пакаленьне, больш чуйнае да моды, пахаў, смакаў, заступіць да стырна наступнага тысячагодзьдзя. Покліч цела глушыць поклічы ідэяў, забойства аднаго мадэльера становіцца большай драмаю, чым тысячы гвалтоўных ахвяраў па ўсім сьвеце. Канкрэтны гуманізм? Ці яснае ўсьведамленьне герархіі культуры?

Сёньняшняе пакаленьне палітыкаў змушанае будзе заўтра працягваць з моладзьдзю тую гульню, якую зь ёю вядзе бамонд поп-культуры. Удаваць прыхільнасьць да bi, нагадзіцеся, гэта не сыграць на саксафоне, альбо віхлянуць каленкамі пад рок-н-ролл. Гуляць у каханьне?



Канец стагодзьдзя лучыць нас усіх тэхналягічна, як ніколі ў гісторыі. Наадварот, асабістыя сувязі аказаліся аслабленымі. Эпоха, у якую экспэрымэнты з клянаваньнем набылі прамысловы маштаб, а штучнае апладненьне й выношваньне перасталі быць навіною, можа неўзабаве зьмяніць падставы нашае цывілізацыі. Кантактаю можа застацца каханьне, не абмежаванае ўмовамі, якое можа стаць ідэалам пакаленьня. Большая частка людзтва схільная кахацца, але не гатовая даняраць адно аднаму. Адзіны шлях пераадолень гэта — стаць самаму безабаронным, адкрыць сябе для каханьне, як у пятнаццаць гадоў...

Сяргей Харэўскі

Сымуляцыі й правакацыі

Я зусім не зьбіраюся выступаць за замілаванае вуркатаньне барадатых мужчын, устаўляць свае тры гронікі ў дыскусію наконт магчымасьці-немагчымасьці каханьня паміж мужчынамі і сяброўства паміж мужчынам й жанчынаю ды разважаць на тэму, які вялікі ўклад у сусьветнае мастацтва, філязофію, літаратуру ўнесьлі сэксуальныя леўшуны. Мне лягчэй сказаць пра тэндэнцыю сымуляваць гомаэратызм.

Каб не хадзіць у школу або каб проста на іх зьвярнулі ўвагу запараныя жыцьцём бацькі, дзеці займаюцца сымуляцыяй хваробаў. Напачатку яны проста грэюць тэрмомэтры на радыятарах, пасьля вычытваюць у мэдычных даведніках сымптомы запаленьня апэндыцыту ды гепатыту і разыгрываюць, як на нотах, драмы.

У кнізе "Мой апошні ўздых" кіясык кінэматографу Люіс Буньюэль рэфрэнам паўтараў, што ў наш час скандал, у тым сэнсе, у якім яго разумелі сюррэалісты і гішпанскія анархісты 20-30-х гадоў, на вялікі жаль, стаў немагчымым. Сапраўды, у Эўропе бадзёрыя ахвіцэры й ціхамірныя манахі з ксяндзамі навучыліся не зьвяртаць увагі на эскапады абразаў з боку сяброў анархісцкіх ды камуністычных гурткоў — пралетараў ды прадстаўнікоў багемы з экстрэмісцкім ладам мысьленьня. Цэнзура ў літаратуры адыйшла ў нябыт. Прызнаньні ў практыкаваньні мастурбацыі ўжо болей нікога асабліва не шакавалі.

Канец 60-х гадоў нашага стагодзьдзя. Па ўсім сьвеце ідыятычна шчасьлівыя гіпі кураць бяскрыўдную траўку, гадуюць хаеры й бароды, носяць расклёпаныя джынсы, на іхных шыях боўтаюцца ідыёцкія званочкі й вышытыя на "індзейскі" кшталт кеіўнікі. Ідылія. Толькі вось у змрочных сутарэньнях гораду Нью-Ёрк зьявіліся коратка астрыжаныя байцы з групы Velvet Underground. Яны апраналіся ва ўсё чорнае, ніколі на публіцы не здымалі чорных акуляраў, гралі змрочную й агрэсіўную музыку й ненавідзелі зьдзяцінелых дарэшты "дзетак-кветак". Натхніў іх вялікі прадстаўнік невялічкага народу з саманазваю карпатаросы, заснавальнік поп-арту Энды Уорхол (Вэрхал).

Праз пару гадоў ніна дала плён. Зьявілася групка New York Dolls. Яе ўдзельнікі адкрыта фарсілі ў трансвэстыцкіх строях, з нахабна папамажанымі вуснамі й падмалёванымі вачыма, гралі жорсткі двухакордны рок. У зьвязку з тым, што ў 1973 годзе іх мэнэджэрам стаў Малькольм МакЛаран, будучы правадыр Панк-Рэвалюцыі 1976-77 гадоў, які ў тыя гады цяжка хварэў на маркезізм, ён паспрабаваў зьляпіць з Нью-Ёркскіх Лялек "пракамуністычную" групу. На канцэртах сцэна была шчодра ўпрыгожаная чырвонымі сьцягамі, партрэтамі Маркса-Леніна-Мао, сярпамі ды малаткамі. Выглядала на шоў трансвэстытаў у калгасным доме культуры. І Лялькі былі першымі з прадстаўнікоў нью-ёркага андэграўнду, на каго зьвярнулі ўвагу калосы шоў-бізнэсу.

Тое, што зьдзек з традыцыйнай хрысьціянскай гомафобіі можа прыносіць немалыя грошы, вельмі хутка зразумелі Дэвід Боўі і Kiss. Першы пачаў працягваць на сябе спадніцы з сукенкамі й накладаць макіяж, варты акторaў пэкінскай опэры, другія, накупіўшы ў прывакзальным сэкшопе штучных фаласаў, ладзілі падчас канцэртаў "гей-шоў". Дзеяч контр-культуры Ігі Поп, чые паводзіны на сцэне былі, мякка кажучы, з выклікам (публічная дэманстрацыя геніталіяў, рэзаньне жылаў аскенкамі бутэлечнага шкла, лаянка на адрас публікі й г.д.), на адным з першых сваіх канцэртаў, выступаючы перад "байкерамі", выйшаў на сцэну і зароў: "Ну што, байкеры! Усё цыцкі вузламі вяжаце!" Публіка без асаблівых разважаньняў закідала Ігі піўнымі бутэлькамі. Толькі вось сярод прадстаўнікоў сэксуальных меншасьцяў ні Лялькі зь Нью-Ёрку, ні Ігі Поп асаблівай папулярнасьцю не карысталіся. На іх канцэрты хадзілі якраз тыя, што вяжуць вузламі цыцкі.

Каб справакаваць канфлікт зь нічога, каб абразіць канкурэнта, ці проста аддаліць непрыемнага знаёмца на дыстанцыю выцягнутай рукі, стала неабавязковым ставіць пад пытаньне сэксуальную арыентацыю свайго апанэнта. Можна абвесьціць сябе гомасэксуалістам. Натуральна, што пры гэтым неабавязкова быць у захапленьні ад грубых партовых грузчыкаў і каб твая плоць налівалася крывёю пры сузіраньні загарэлых падлеткаў на марскім пляжы. Варта толькі прадэкляраваць, узьняць сваю "гомасэксуальнасьць" чырвоным сьцягам, і сяк-так мэтаў ты ўжо дасягнеш, нават калі род тваіх заняткаў зусім не патрабуе, каб зграя журналістаў хінулася да цябе з надзеяю атрымаць інтэрвію з парай-тройкаю кароткіх надрабязнасьцяў пра перавагі попак японскіх хлопчыкаў.

Госьці мужчынскага полу, нападпітку ці цьвярозыя, будуць пазьбягаць начаваць у тваёй кватэры, нават тады, калі грамадзкі транспарт не працуе, грошай на таксоўку няма, а да дому дзесяць з гакам кіламэтраў. Прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва якраз нядаўнарот будуць спакойна рэагаваць на прапановы пераначаваць у вас дома. Пры наяўнасьці жаданьня, ад іх можна будзе спакойна атрымаць тое, што вабіць мужчынаў да жанчын. Жанчыны цікаўныя з натуры, "гомаэратычнасьцю" іх лёгка зайтрыгаваць. І любую такую інтрыжку з жанчынаю можна будзе неарваць за адзін раз. Дастаткова з сласнотаю й захапленьнем у голасе сказаць сваёй сяброўцы "Глядзі, які хлопчык!" і, кінуўшы ашаломленую дзяўчыну, пабегчы у вагон мэтро. Нумар тваіго тэлефону яна забудзе назаўсёды. Вялікая колькасьць спаленых за дзень цыгарэтаў і празьмернае ўжываньне алькаголю твае калегі будуць сьпісваць на "сындром самазьнішчэньня", да цябе ня будуць чапляцца з пытаньнем: "Калі ты ажэнішся?" Так, пра цябе будуць пляткарыць ды распускаць паскудныя погаласкі, але самога пакінуць у спакоі.

Пра што і марылася.

Андранік Антанян



Здымак Алены Адамчык

каханка. Мог бы таксама сказаць, што Фрэд толькі "мой найлепшы кампан, зь якім я дзялю пакой, некалі мы былі каханкамі". Вось і ўсё, калі казаць пра непасрэдны аналіз, але на працягу ўсіх гэтых гадоў Боб разважна праводзіў свой саюз з Фрэдам паміж Сцылай пераболыпанае вернасьці (якая па вялікім рахунку настолькі нудная, што невыносная паміж двума пазбаўленымі ўяўленьня геямі) і Харыбдай празьмернай цярпімасьці.

Ці геі могуць сябраваць паміж сабою? — спыталася ў мяне тая жанчына.

У гэтым пытаньні можа хавацца дапушчэньне, што геі — гэта выключна сэксуальныя істоты і што мужчына, які ўвесь час шукае здабычу, ніколі ня будзе здольны на чыстае пачуцьцё. Альбо таксама гэтае пытаньне выкрывае безвыходнасьць, якая спадарожыць дыскусіям на тэму грамадзтва, складзенага з прадстаўнікоў адной плоці. З-за таго, што гетэрасэксуальная жанчына сябруе зь іншымі жанчынамі, а кахаецца з мужчынамі, мая суразмоўніца задумалася, як людзі адной плоці могуць выступаць у дзьвюх гэтых ролях адначасова.

Першае дапушчэньне — што геі гэта выключна сэксуальныя істоты — гэта адвечная забабона, і як усе забабоны ў большасьці непраўдзівая, хоць у пэўным сэнсе трапная. Калі гомасэксуалісты, чулыя да палітыкі, імнуцца ўжываць слова гей а не гомасэксуаліст, то таму, што хацелі б, каб сьвет прызнаў цягу да прадстаўнікоў той самай плоці за эмацыйную перадумову ў такой самай ступені, як прызнае яе за сэксуальную арыентацыю.

Існуюць, напрыклад, геі, якія больш прагнуць адчуваць блізкасьць цела жанчыны, чым цела мужчыны; геі, якія лепш пачуваюцца ў сэксуальных саюзах з жанчынамі, але эмацыйны бок асобы якіх шукае кантактаў зь іншымі мужчынамі. Геі маюць зь іншымі мужчынамі вечна незаладжную, эмацыйную праблему — якой спадарожаць боязь, надзея, неспакой. Іх жа пачуцьці да жанчын прасьцейшыя, больш стабільныя, менш небясьпечныя. Пачуцьцё, страснае пачуцьцё, ніколі ня простае; яно па роўну складзенае з тугі, страху і апэтыту. З гэтай таксама прычыны сяброўства аднаго гея, які адчувае моцную цягу да другога, гэтаксама драматычнае, як любая гетэрасэксуальная страсьць. Тады як асэксуальныя, менш зацікаўныя гейскія саюзы — спакойныя, лагодныя як сяброўства, напрыклад, паміж двума гетэрыкамі.

Геі падзяляюць іншых геяў на два лягеры — на тых, якія ёсьць патэнцыйнымі партнэрамі (каханкамі), і на тых, якія такімі ня ёсьць (прыяцелі). І, на першы погляд, жыцьцё геяў відавочна больш шматзначнае: прадстаўнікі абодвух лягераў, каханкі і прыяцелі, няспынна мяняюцца месцамі альбо сядзяць дзесьці ў вузкай шчыліне паміж гэтымі катэгорыямі. Менавіта гэтыя неспазнаныя пачуцьці заўсёды цікавілі мяне як раманіста —нявыказанае каханьне паміж двума геямі, якія, скажам, робяць выгляд, што яны проста прыяцелі, кампаны, якія папросту чакаюць моманту, калі прыйдзе Ўласьцівы Мужчына (на шчасьце, ніколі да гэтага не даходзіць).

У пэўным сэнсе засьцераганьне шырокіх масаў ад гейскіх маніяў на пункце сэксу слушнае. На працягу шмат стагодзьдзяў геям безаглядна адмаўлялі ў праве на сэкс, нават на яго пошук, у выніку права на сэксуальную свабоду застаецца чыстым штандарам, які лапоча над гетам у гвалтоўных парывах ветру. Законы, якія забараняюць сэкс, заўсёды былі найвялікшай праблемай для гомасэксуалістаў; дзякуючы ім, магчыма, зьявілася вызначэньне самос катэгорыі гомасэксуалізму. З гэтай самай прычыны гейская супольнасьць, нягледзячы на тое, што стварыла культуру, ня больш эратызаваную, чым іншыя культуры, ня можа запярэчыць, што яе пачаткі палягаюць у сэксуальнай празе і яе падаўленьні.

А што мы можам сказаць на тэму "празьмернае" разбэшчанасьці геяў? Відавочна, гей паводзіць сябе так, як паводзілі б усе мужчыны, вольныя ад націскаў жаночага густу, жаночых патрэбаў, забаронаў і чаканьняў. У жыцьці гея няма нічога, чаго ня можна было б вывесьці зь меншаснага характару гэтай супольнасьці альбо яе выключна мужчынскай папуляцыі. Усе мужчыны прагнуць хуткіх, нескладаных сэксуальных прыгодаў (гэтаксама як працяглай рамантычнай страсьці); усе мужчыны такой пажадаю абдораныя.

Усеагульнасьць нагодаў для сэксуальных сустрэчаў у сучасным гейскім геце павялічыла парадаксальнае значэньне сяброўства. У грамадзтве, якое не абапіраецца на адмову ці каналізацыю сэксуальных патрэбаў, застаецца болей энэргіі на сяброўства. У жыцьці геяў саюзы менш ускладнёныя (адсюль слынная гейская іронія, лёгкасьць). У шматлікіх праявах геі надалей застаюцца вязьнямі большасьці грамадзтва, але ўжо таму карыстаюцца большай свабодай у сваіх вязьніцах: бо гейскія саюзы не падпарадкаваныя дысцыпліне рэлігіі, права, эканомікі ці палітычных цырымоніяў, але толькі таму, што дыктуе ім сумленьне і імпульс сэрца. Гэтыя саюзы ня сымбалі, але рэальнасьць, ня права, але самадастатковае бытнаваньне, яны не выніковыя, але экстатычныя.

Пераклад са скарачэньнямі WW.

НОВЫЯ ВОЛЬНЫЯ ВЕРШЫ

Славамір Адамовіч

***

Сярод аўтакефаліі бароў
стаіць мой стод пад бліскавічным
небам,
на камені блішчыць сьвятая кроў,
сьцякаючы паміж віном і хлебам.

***

Я не герой, я проста адзінокі,
зацяты ў рукаблудстве пісарчук,
душы сваёй перапаўняю докі
сталёвымі кантэйнэрамі мук;
і слабы я, каб быць героем часу,
і думаю брутальна пра жанчын,
і не люблю зусім людзкую масу,
тым больш не пераварваю мужчын;
брутальны я і з плямбаю героя
ня мне хадзіць, задзёршы ўгору нос,
збыткоўная ўва мне гнязьдзіцца мроя,
усё часьцей начамі сьніцца зброя,
і хочацца пакінуць межы рою,
альбо, як муха, зьнікнуць за карою,
альбо пайсьці, як Толік, у разнос,
альбо зрабіць зь нявыплаканых сьлёз
Учынак, што й дыктуе мне мой лёс.

***

Чагосьці не хапае пэрманэнтна:
то H_2O, то хлеба, то віна,
то "зайчыка", то марачкі, то цэнта,
але ўжо ў гэтым не мая віна.
Чагосьці не хапае, ды найболей
гармоніі бракуе тут і там,
каханьня і сям'і, і першых роляў,
бязбацькавічам — родных тат і мам.
Чагосьці не хапае надзвычайна:
то розуму, то жарсьці, то сяброў,
гатовых біцца з ворагам адчайна,
нягледзячы на страты, боль і кроў.
Чагосьці не хапае без надрыву,
чагосьці не хапае толькі ў снах,
і не хапае шчырага парыву,
і сьмеласьці, калі навокал страх.
Чагосьці не хапае, ды найболей
гармоніі бракуе там і тут,
і праз пару, на жаль, самоты й болю,
і не сьціхае дождж людзкіх пакут.

***

З блакітнымі, блакітнымі вачыма,
зь фігураю кітайскай статуэткі,
з далонямі, як белыя сурвэткі,
з гарачым сэрцам у грудзях, магчыма,
стаіць вось тут рэальная дзяўчына,
стаіць і ў твар мне моўчкі пазірае.
З блакітнымі вачыма ў гэтым краі,
зь фігураю кітайскай статуэткі,
з далонямі, як белыя сурвэткі,
з гарачым сэрцам жыць тымчасам
цяжка,
Яшчэ цяжэй нам жыць у гэтым краі,
дзе я і ты, крывіч і крывічанка,
і Бацькаўшчына нашая пад ботам
бязроднага бастарда-акупанта.

***

Рэдка вас назіраючы,
думаю часта пра вас,
чорная зь белым чаіцца
у інтэр'еры анфас.
Вы прачыркнулі над пушчаю
сноў маіх белым крылом.
Кім і адкуль вы запушчаны
ў Край гэты, змучаны злом?
Хто вы: ці птушка, ці іншае,
дзе ваш прытулак зямны?
Дзе яно, месца суцішнае,
дзе не бывае зімы?
Хто б ні былі вы, мне чуецца
ваша прысутнасьць паўсюль
і на прыстрэленых вуліцах
аберагае ад куль.

***

Каханьне бяз рэтушы, голае, галоднае,
за кратамі ў камэры альбо на прадоле*,
каханьне пад прыцэлам, сырое, падкалоднае,
цяжкае, нібыта царкоўная жырандоля,
каханьне маё прышлае, імгненнае, тутэйшае,
я нацкую на плоць тваю лягавых маёй жарсьці,
я расьпішу цябе прыгожымі і дзёрзкімі вершамі,
ня дам табе спакою да самай нашай старасьці;
пакуль я буду лёгкімі сіпець на цэнтрале,
абкураны і добраю, і дрэннай табакай,
хадзі сабе сьмела ў памаранчавай зале,
зусім ня так, як ходзіць камандзір перад атакай,
але як толькі выйду я, як толькі я звольнюся
з турмы, дзе забіваюць павольна і ўпэўнена,
мы паплывем з табой у белым ад полюса да полюса,
мы станем любіцца і слухаць Ленана,
мы будзем як дрэвы, што мной пасаджаны
за тысячы дзён да вершаў і славы,
мы будзём добрымі індыйскімі раджамі,
будзем языкамі пякельнай лавы,
мы будзем вылівацца з кратэраў гневу,
з каналаў нянавісьці да акупанта,
мы зьнішчым яго нашым гімнічным сьпевам,
а рэшткі змыем з дапамогай гідранта;
і толькі потым, пасьля мы зоймемся каханьнем,
мы будзем выраблять — о Божа! — такія штукі,
што адшукаюць нас, магчыма, позьнім раньнем
і целы яшчэ цёплыя возьмуць на рукі.

*прадол — турэмны калідор.

Па сваёй эміграцыі Мілан Кундэра на нейкі час страціў чэскага чытача. Прынамсі, многае з напісанага і ненадрукаванага дома ўпершыню стала выходзіць па-французку. Цяпер у выдавецтве "Атлантыс" адна за адной зьявіліся чатыры кнігі кундэраўскай прозы па-чэску. Сярод іх — раман "Вальс на разьвітаньне", паводле зацемак аўтара, напісаны на радзіме недзе ў 1971 ці 72-м годзе і выдадзены ў Парыжы ў 1976-м.

Хоць месца дзеі і не названае, у ім пазнавальны славуты курорт Карлавы Вары. Сюды разьвітацца са сваім сябрам — доктарам Шкрэтам прыяжджае Якуб. За яго плячыма — пакутная дарога вязьня рэжыму, іншадумца, напярадзе — эміграцыя. Тут жа лекуецца ўжо сталы эмігрант, чалавек з амэрыканскім пашпартам — Бэртлеф.

Глыбокая тэма разьвітаньне з радзімай, з рэжымам, з ілюзіямі схаваная за зьнешне банальны сюжэт. Мэдсястра тутэйшага санаторыя Ружэна зацяжарыла і робіць усё магчымае, каб бацькам яе дзіцяці стаў славуты музыкант, які раз ці два быў тут з канцэртам.

Гэтая нагода сабрала трох мужчынаў, кожны зь якіх нейкім чынам мае дачыненьне да Ружэны і яе музыканта.

Міланд Кундэра

Дзесяць прычынаў,

урывак з раману

Бэртлеф прывітаў абодвух гасьцей, і Якуб агледзеўся ў пакоі. Потым падыйшоў да абраза, на якім быў намаляваны вусаты сьвяты: "Чуў, што малюсце", — сказаў ён Бэртлефу.

"Так, — адказаў Бэртлеф, — гэта сьвяты Лазар, мой патрон".

"Чаму ж вы яму намалявалі німб сінім?" — зьдзівіўся Якуб.

"Я рады, што пытаецеся. Людзі звычайна паглядзяць на абраз і ўвогуле ня вдаюць, што бачаць. Намаляваў німб сінім, таму што ў сапраўднасьці німб і ёсьць сіні".

Якуб зноў прыгледзеўся, і Бэртлеф працягваў: "Людзі, якія маюць у сабе невымерную любоў да Бога, узнагароджаныя сьвятой радасьцю, якая разьліваецца ў іх усярэдзіне і выпраменьваецца вонкі. Сьвятло гэтае боскае радасьці ціхае і мірнае, і мае колер нябеснага блакіту".

"Пачакайце, — перарваў яго Якуб. — Вы думаеце, што німб ёсьць больш, чым мастацкі сымбаль?"

"Вядома, — прамовіў Бэртлеф, — але не ўяўляйце, што ён над галавой сьвятых праменіць увесь час і што яны ходзяць па сьвеце як перасоўныя ліхтары. Вядома, не. Толькі ў пэўныя хвілі вялікай унутранай радасьці выплывае зь іх гэтае сіняе сьвятло. У першых вякох па сьмерці Ісуса, калі было шмат сьвятых і тых, хто яго зблізку ведаў, ніхто пра колер німбу не сумняваўся і на ўсіх абразах і фрэсках той пары знойдзеце яго сінім. Толькі ад пятага стагодзьдзя мастакі пачалі паступова маляваць яго ў іншых колерах, ці аранжавых, ці залатых. У готыцы ён ужо выключна залаты. Гэта было больш дэкаратыўна і лепш выяўляла наземную сілу і славу царквы. Але ад рэальнага німбу гэта было гэтаксама далёка, як тагачасная царква ад першароднага хрысьціянства".

"Я гэтага ня ведаў", — сказаў Якуб, і Бэртлеф пайшоў да шафкі з напоямі. Параіўся з абодвума гасьцямі, зь якой бутэлькі пачаць. Калі ўжо наліваў у тры чаркі каньяк, зьвярнуўся да доктара Шкрэты:

"Спадзяюся, вы не забудзецеся на таго няшчаснага бацьку. Я моцна за яго перажываю".

Шкрэта запэўніў Бэртлефа, што ўсё будзе добра, а Якуб запытаўся, пра што гаворка. Калі ж яму патлумачылі пра што (ацэнім тут шляхотную далікатнасьць абодвух мужчынаў, якія не назвалі Якубу ніводнага імя), — выявіў да невядомага апладняльніка вялікае шкадаваньне:

"Хто з нас не перажываў такога вопыту! Гэта адно зь вялікіх выпрабаваньняў. Тыя, хто ў ім здадуцца і стануць супраць сваёй волі бацькамі, пацерпяць пажыцьцёвую паразу. Яны такія ж злыя, як усе тыя людзі, якія прайгралі ды жадаюць падобнага лёсу ўсім астатнім".

"Сябры, — ускрыкнуў Бэртлеф, — і гэтак вы гаворыце пры шчасьлівым бацьку! Калі яшчэ пабудзеце тут дватры дні, убачыце майго цудоўнага сына і возьмеце назад свае словы!" "Не вазьму, — сказаў Якуб, — таму што вы ня сталі бацькам супраць сваёй волі".

"Дзякуй Богу, не. Стаў бацькам са сваёй волі ды з волі доктара Шкрэты".

Доктар Шкрэта спакойна пацьвердзіў і абвясьціў, што і ён мае на бацькоўства іншы погляд, чым Якуб і пра што, сярод іншага, сьведчыць і дабраславёны стан яго дарагой Зузі. Адзінае, дадаў, што выклікае ў мяне скепсыс адносна распладненьня, гэта неразумны выбар родзічаў. Дзіву даюся, як брыдкія асобіны рашаюцца сябе множыць. Напэўна, спадзяюцца, што цяжар брыдкасьці стане лягчэйшым, калі падзяліцца ім з нашчадкамі.

Бэртлеф назваў пазыцыю доктара Шкрэты эстэцкім расізмам: "Не забывайцеся, што Сакрат быў брыдкім. Больш таго, многія славутыя каханкі не вызначаліся цялеснай дасканаласьцю. Эстэцкі расізм амаль заўсёды ёсьць праявай недасьведчанасьці. Тыя, хто не спазнаў усяго сьвету любоўных радасьцяў, жанчыну могуць успрымаць толькі паводле таго, што бачаць. Але тыя, хто сапраўды спасьціглі, ведаюць, што вочы нам удзяляюць толькі неадпаведную частку таго, чым ёсьць жанчына. Калі Бог наказаў чалавецтву, каб кахалася і множылася, ён мсў на ўвазе і брыдкіх, і прыгожых. Ва ўсім астатнім, упэўнены, эстэтычныя крытэрыі — ад д'ябла, а не ад Бога. У раі ніхто прыгажосьць і брыдкасьць не адрозьніваў".

Пасьля гэтага ўмяшаўся ў дыскусію Якуб і сказаў, што эстэтычныя довады ня мелі ніякай ролі ў ягоным нежаданьні сябе множыць: "Мог бы прывесьці дзясятак іншых прычынаў, каб ня быць бацькам".

"Кажыце, мне цікава", — прамовіў Бэртлеф.

"Перадусім, не падабаецца мне мацярынства, — сказаў Якуб і задумаўся. — Сучасны век ужо разьвянчаў усе міты. Дзяцінства ўжо даўно не пара нявіннасьці. Фройд адкрыў сэксуальнасьць немаўлят і ўсё распавёў нам пра Эдыпа. Толькі Якаста застасецца дасюль захутанай, ніхто не пасягае сьцягнуць зь яе покрыва. Мацярынства ёсьць апошнім і найвялікшым табу і хавае ў сабе найвялікшы праклён. Няма большай прывязанасьці, чым маткі да дзіцяці. Гэтая прывязанасьць назаўсёды калечыць душу дзіцяці, а мацеры ў пару сталеньня рыхтуе найвялікшую любоўную муку, якая толькі ёсьць на сьвеце. Кажу, што мацярынства ёсьць праклятьце, і не хачу яго памнажаць".

"Далей", — казаў Бэртлеф.

"Яшчэ зь іншых прычынаў не хачу размнажаць мацярок, — казаў Якуб з праўдзівай роспаччу. — Мне падабаецца жаночае цела і агідна ўяўляць, як пешчаныя грудзі ператвараюцца ў торбы з малаком".

"Далей", — казаў Бэртлеф.

"Пан доктар нам засьведчыць, што да жанчынаў, якія ляжаць у лякарнях на аборце, лекары і сёстры ставяцца нашмат горш, чым да парадзіх, даюць ім адчуць усю сваю пагарду пры тым, што і самі за сваё жыцьцё хаця б аднойчы на такі крок павінны будуць пайсьці. Пагарда ў іх усё ж мацнейшая, чым хоць якая ветлівая ўвага, таму што культ нараджэньня ёсьць дыктат прыроды. Таму не шукайце ў прапагандзе захаваньня папуляцыі ніводнага разумнага аргумэнту. Думаеце, што з царкоўных мараляў пра нараджэньне да вас адзываецца голас Хрыста? Ці, можа, словамі

Адам Глёбус

БРЭХ

занатоўкі з нагоды прачытаньня тэкстаў пра кініка Дыягена Сынопскага

■■■

Сабака-жывёла брэша на злодзеяў і кусае ворагаў, а сабака-філёзаф кідаецца й выскаляецца на сяброў і суайчыньнікаў дзеля выратаваньня іх душаў.

■■■

Калі табе не падабаюцца паводзіны лысага, пахвалі ягоныя валасы, што пакінулі неразумную галаву.

■■■

Дабрыня першай сыходзіць зь вялікай і заможнай імпэрыі.

■■■

Шлях у царства мёртвых аднолькава кароткі зь любой кропкі зямлі й неба.

■■■

Нішто так моцна не сьціскае кулак, як злосьць.

■■■

Калі гаворыш разумнае, цябе амаль ня чуюць. Чым болей прамаўляеш значных рэчаў, тым меней маеш уважлівых слухачоў. У глупства найвялікшыя шанцы займець слухачоў і авалодаць аўдыторыяй. Паспрабуй на людзях забрахаць па-сабачы і пераканаесься.

■■■

Хлеб, намаляваны мастаком, як і хлеб, паказаны ў тэлевізіі, каштуе значна больш за сапраўдны, у гэтым і хаваецца найвялікшая эканамічная памылка.

■■■

На думку Плятона, Дыяген — гэта звар'яцелы Сакрат. Удакладню... Дыяген — Сакрат, які не гаворыць, а брэша. Зрэшты, галоўнае, што Дыяген зьяўляецца Сакратам, а якім — справа другая.

■■■

"Нават падробка пад мудрасьць — ужо філязофія", — казаў Дыяген Сынопскі. Сапраўды, каб навучыцца нешта рабіць, спачатку неабходна ўмець тое нешта падрабляць.

■■■

"Рабы служаць гаспадару, а кепскія людзі — страсьцям", — сьцьвярджаў Дыяген. У такім разе, лепей быць рабом пры разумным уладары, але гэта фантастычная пэрспэктыва.

■■■

Справакаваць дурнога чалавека на брахню досыць лёгка, дастаткова абразіць, назваць вар'ятам.

■■■

Энцыкляпэдыі — могільнікі інфармацыі. Чытаеш і спатыкаесься аб даты сьмерцяў і нараджэньняў.

■■■

Убачыўшы жанчын, што задушыліся на аліўкавым дрэве, Дыяген прабрахаў: "Вось каб на ўсіх дрэвах віселі такія плады!" У наш час эмансыпацыі гэткую экспрэсію паводзінаў пераўзысьці немагчыма, хіба нейкая Дыягеніха праверашчыць падобнае пра мужчынаў.

■■■

Дыяген абраў для жытла гліняную бочку, бо брэх у ёй і больш гулкі, і гучнейшы, і густы. Нездарма ён адзначаў сваё падабенства да настаўніка сьпеваў, які знарок бярэ іншы тон, каб вучні зразумелі — як трэба сьпяваць ім самім.

■■■

Калі прачытаў, што Дыяген ніколі не насіў абутку, бо ногі менш далікатныя за твар і вочы, і ён ніколі ня бачыў, каб чалавек хадзіў з вачыма, абутымі, як ногі, то падумаў, што акуляры кінік не ўзлюбіў бы яшчэ болей за чаравікі. Толькі, патрушчыць акуляры лепш за ўсё абцасам мужчынскага боту.

■■■

Дыяген заўважыў, што асноўнае спаборніцтва людзей зводзіцца да скіданьня адно аднаго пендалямі ў канаву. Мінула два тысячагодзьдзі, а Ніцшэ са сваім "падштурхні таго, хто падае" і Камю з "такой халоднай вадою", у якой топіцца самазабойца, так і стаяць разам з намі на беразе бруднай Дыягенавай канавы.

КАБ НЯ БЫЦЬ БАЦЬКАМ

"Вальс на разьвітаньне"

камуністычнай дзяржаўнай прапаганды да вас прамаўляе Маркс? Самім жаданьнем захаваць свой род чалавецтва на малой зямлі хутка задушыць сябе. Але прапаганда папуляцыі ідзе далей, і публіка пранятая да сьлёз, калі бачыць выяву маткі-карміцелькі ці грымасы немаўляці. Мне агідна. Калі я ўяўляю сабе, што разам зь мільёнамі астатніх меў шанец схіляцца з тупой усьмешкай над калыскаю, мяне прабірае мароз па сьпіне".

"Далей", — казаў Бэртлеф.

"Мушу, між тым, думаць і пра тое, у які сьвет дзіця пасылаю. Як возьме яго школа і будзе ўдзёўбваць яму ў галаву няпраўду, супраць якой сам цэлае жыцьцё марна змагаўся. Што, меў бы назіраць, як расьце з майго нашчадка дурань-канфарміст? Ці меў надзяліць яго сваімі поглядамі і назіраць за тым, як ён стане няшчасным, бо прыйдзе да тых самых канфліктаў, што і я?"

"Далей", — казаў Бэртлеф.

"І мушу таксама думаць пра сябе. У гэтай краіне дзеці церпяць за непаслушэнства бацькоў, а бацькі за непаслушэнства дзяцей. Колькі маладых людзей было выгнана са студэнтаў толькі за тое, што іх бацькі ўпалі ў нямілась! А колькі бацькоў на ўсё жыцьцё сталі амёбамі, абы толькі не пашкодзіць сваім дзецям! Той, хто хоча захаваць свабоду тут, ня сьмее мець дзяцей," — сказаў Якуб і перапыніўся.

"Вам не хапае далейшых пяці прычынаў, каб было дзесяць", — сказаў Бэртлеф.

"Аношні довад настолькі вялікі, што варты пяці, — сказаў Якуб. — Мець дзіця азначае прызнаць абсалютную вартасьць чалавека. Маючы дзіця, мы быццам гаворым: я нарадзіўся, пазнаў жыцьцё і лічу яго настолькі добрым, што яно вартае быць паўтораным".

"А вы не знаходзіце жыцьцё добрым?" — запытаўся Бэртлеф.

Якуб пастараўся быць дакладным і гаварыць асьцярожна: "Я ведаю толькі, што з вышыні сваёй дасьведчанасьці ніколі б ня мог сказаць, што чалавек ёсьць дасканалае стварэньне і мусіць быць паўтораным".

"Гэта ад таго, што ты пазнаў жыцьцё з найгоршага боку, — сказаў доктар Шкрэта. — Ніколі ня ўмеў жыць. Заўсёды думаў, што твой абавязак быць, як той казаў, прысутным. Быць у цэнтры падзеяў. Але што тыя твае падзеі? Палітыка. А палітыка ў жыцьці гэта найменш істотнае і найменш каштоўнае. Палітыкі брудная пена на рацэ, а ўласна жыцьцё ракі адбываецца нашмат глыбей. Тысячы гадоў нараджаюць жанчыны. Гэтым мераецца сапраўдная гісторыя. І ім папросту ўсё роўна, якая ўлада кіруе. Я, калі нацягваю гумовую рукавіцу і дасьледую жаночыя органы, нашмат бліжэй да цэнтру жыцьця, чым ты, які змагаецца за шчасьце людзкое".

Замест таго, каб сябе бараніць, Якуб ківаў на папрокі свайго прыяцеля галавою, і доктар Шкрэта ўзбуджана працягваў: "Архімэд у сваіх кругах, Мікельянджэла ў кавалку каменя, Пастэр у сваіх прабірках пераўтвараліі людзкое жыцьцё, вяршылі сапраўдную гісторыю, калі палітыкі..." Шкрэта замаўчаў і махнуў пагардліва рукою.

"У той час як палітыкі што? Скажы мне, — запытаўся Якуб. — Калі навука й мастацтва ёсьць самастойнай арэнаю гісторыі, дык палітыка, наадварот, ёсьць закрытая лябараторыя, дзе ставяцца нечуваныя экспэрымэнты над чалавекам. Досьледныя чалавечыя экзэмпляры там кідаюцца ў люкі, а потым ізноў выцягваюцца на сцэну, прывабленыя аплядысмэнтамі і прыстрашаныя пятлёю, ахвяры даносаў і вымушаныя даносчыкі. Я працаваў у той лябараторыі лябарантам, але некалькі разоў і сам служыў ахвярай вівісэкцыі. Ведаю, што я не стварыў ніякай каштоўнасьці (таксама як і ніхто з тых, хто працаваў са мною), але спазнаў больш, чым іншыя, што ёсьць чалавек".

"Разумею вас, — сказаў Бэртлеф, — і ведаю тую лябараторыю, хаця сам там ніколі ня быў лябарантам, заўсёды толькі мышшу. Вайна застала мяне ў Нямеччыне. Жонка, якую тады кахаў, мяне выдала гестапа. Прыйшлі да яе і паказалі фота, на якім я быў зазьняты ў абдымках іншай жанчыны. Спрацавала. Вы ж ведаеце, што каханьне часта прыпадабняецца да нянавісьці. Я ішоў у турму з унутраным адчуваньнем, што туды мяне прывяло каханьне. Хіба гэта не дзівосна — апынуцца ў руках гестапа і ведаць, што гэта — уласная прывілея чалавека, якога так моцна любяць?"

Якуб адказваў: "Калі што мяне адварочвала ад чалавека, дык у бальшыні тое, як яго жорсткасьць, нізкасьць і абмежаванасьць умеюць хавацца пад лірычнай маскай. Паслала вас на сьмерць, а сама перажывала гэта, як пачуццёвую дзею параненага каханьня. А вы ішлі пад шыбеніцу з волі абмежаванай бабы ды яшчэ ўяўлялі, што граеце ролю ў трагедыі, якую для вас напісаў Шэксьпір".

"Пасьля вайны яна прыйшла па мяне з плачам, — працягваў Бэртлеф, як бы ня чуючы Якубавых заўвагаў. — Я сказаў ёй: ня бойся нічога, Бэртлеф ніколі ня помсьціць".

"Ведаеце, — сказаў Якуб, — я часта думаю пра цара Ірада. Памятаю тую гісторыю. Калі ён даведаўся, што нарадзіўся наступны жыдоўскі цар, то, каб захаваць сабе трон, загадаў забіць усіх немаўлят. Я ўяўляю сабе Ірада інакш, хоць і ведаю, што гэта толькі гульня ўяўленьня. Як мне здаецца, цар Ірад быў адукаваным, мудрым і вельмі высакародным царом, які доўга працаваў у лябараторыі палітыкі і спасьцігнуў, што ёсьць жыцьцё, а што ёсьць чалавек. Ірад зразумеў, што чалавек ня мусіў бы быць створаны. Урэшце рэшт, сумненьні яго не былі такімі недарэчнымі й грэшнымі. Калі не памыляюся, і Госпад сумняваўся ў чалавеку і яго займала думка перакрэсьліць гэтае дзела".

"Так, — прысьведчыў Бэртлеф, — пра тое сказана ў шостым разьдзеле Кнігі Быцьця; выцераблю зь зямлі чалавека, якога я стварыў, бо шкадую, што яго ўчыніў".

"А, можа, гэта была толькі хвіля слабасьці Госпада, бо нарэшце ж дазволіў ён уратавацца Ною на сваім караблі і гісторыя чалавецтва пачалася знову. Ці можам мы быць упэўненыя, што Бог пра тую хвіліну сваёй слабасьці ніколі не шкадаваў? Хаця — шкадаваў ці не шкадаваў, што гэта мяняе? Бог сябе ня можа рабіць сьмешным, увесь час мяняючы свае рашэньні. Але хто ж тады быў ён сам, калі паслаў сваю думку ў галаву Ірада? Ці можам мы гэта разасобніць?"

Бэртлеф паціснуў плячыма і прамаўчаў.

"Ірад быў цар. Ён не адказваў за аднаго сябе. Ня мог казаць, як я: хай астатнія робяць што хочуць, а я сябе множыць ня буду. Ірад быў цар і ведаў, што мусіць вырашаць ня толькі за сябе, але й за іншых, і вырашыў за людзтва, што чалавек ня будзе болей паўтарацца. Так пачалося забойства немаўлят. Не было яно з такіх нізкіх помыслаў, як прыпісвае легенда. Ірадам кіравала тое высакароднае жаданьне вызваліць нарэшце сьвет з учэпкаў чалавецтва".

"Ваша тлумачэньне Ірада мне цалкам падабаецца, — сказаў Бэртлеф. — Падабаецца настолькі, што ад сёньняшняга дня я буду ўспрымаць забойства немаўлят як і вы. Але не забывайце, акурат у той час, калі Ірад вырашыў, што чалавецтва перастане існаваць, у Бэтлееме нарадзіўся хлопчык, які пазьбегнуў нажа. Той хлопчык потым вырас і сказаў людзям, што хопіць аднаго адзінага, каб на сьвеце жыць: узаемна любіць. Магчыма, што Ірад быў больш адукаваны і меў большы досьвед. Ісус быў маладзёнам і так шмат пра жыцьцё ня ведаў. Магчыма, што ўсё ягонае вучэньне і можна патлумачыць яго маладосьцю і недасьведчанасьцю. Яго наіўнасьцю, калі хочаце. А ўсё ж ён меў праўду".

"Праўду? Хто даказаў тую праўду?" — узбуджана запытаўся Якуб.

"Ніхто, — сказаў Бэртлеф. — Ніхто яе не даказаў і не дакажа. Ісус настолькі кахаў свайго Айца, што ня мог дапусьціць, быццам справа яго няслушная. Вяла к таму любоў, а ніяк ня розум. І таму спрэчку паміж ім і Ірадам можа вырашыць толькі нашае сэрца. Варта за гэта быць чалавекам ці не? Я ня маю ніякага доказу, але разам з Ісусам веру, што так". Потым ён паказаў з усьмешкай на доктара Шкрэту: "Дзеля гэтага і паслаў сваю жонку, каб лячылася тут у пана доктара, які ў маіх вачах ёсьць адным са сьвятых вучняў Ісусавых, бо ўмее рабіць цуды і абуджаць да жыцьця сьпячыя жаночыя ўлоньні. Дык вып'ем за яго здароўе!"

Прадмова і пераклад з чэскай
Алены Ціхановіч.

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы

Сымбалізм ўкараніўся ў мастацтва Эўропы напрыканцы XIX ст., дзякуючы найперш паэтам: Вэрлену, Рэмбо, Малярмэ. Словы, ператвораныя ў мэтафары, ствараліновую мову, мову сымбаляў, мову па-за моваю канкрэтнага свету.

Знаходка паэтаў была падхопленая мастакамі. Найперш у Францыі, дзе працавалі такія майстры, як Гюстаў Маро, Пюві дэ Шаван і Адылён Рэдон. Сюжэты іх палотнаў зводзілі гледача ў містычны свет аўтарскіх мрояў, таямнічых і цьмяных алегорыяў. Аднак перадусім гэта было цікавае мастацтва, якое хутка захапіла эўрапейцаў, летуценьнікаў і фантазёраў. Апроч французаў, сярод сымбалістаў сусьветнае славы дасягнулі швэйцарац Бёклін і ангелец Бёрн-Джонс. На пачатку XX ст. спадчына сымбалістаў аказалася тымі дражджамі, на якіх пачаў брадзіць нацыянал-рамантызм па ўсёй Усходняй і Сярэдняй Эўропе. Мастацтва Фінляндыі, Чэхіі, Польшчы, Літвы было наскрозь прапітанае сымбалізмам, больш-менш яснымі эратычнымі і нацыяналістычнымі алегорыямі. Паўставаньне Беларусі не прамінула гэтае фазы нацыянальнага самабудаваньня, ўвасобіўшы беларускі сымбалізм у творах і жыцьці Язэпа Драздовіча...

... Засьценак Пункі толькі два гады праслужыў Драздовічу бацькоўскім домам, па сьмерці бацькі сям'я мусіла прадаць гэты кут і выправіцца ў доўгі шлях ад адной арэнды да другой. Іскра, якую высякала гэтая частка беларускага грамадзтва — безьзямельныя вандроўныя шляхціцы — запаліла паходню беларушчыны. Адныя сем'і паўтаралі шлях Драздовічаў, як сям'я Купалы, іншыя наогул падаваліся на казённую службу аж у Расею, як сям'я Багдановічаў, але менавіта ў гэтых пакручастых шляхах дзеці агортвалі розумам бясконцасьць свае Бацькаўшчыны... Так гартавалася ўсьведамленьне СВАЙГО краю. Стадолішча, Кміты, Александрыя, Галічына, Мёры, паўтары дзясяткі прыстанкаў — яскравы й тыповы шлях прайшлі Драздовічы, маці, пяць сыноў і дзьве дачкі. Малодшы сын, Язэп, так і застаўся на ўсё жыцьцё беспрытульным, выправіўшыся з Александрыі да Вільні...

... Падчас вучобы ў Вільні, у школе маляваньня Трутнёва, са сьценаў якое выйшлі акадэмікі Альфрэд Ромэр і Марк Антакольскі, Язэп Драздовіч спрычыніўся да беларускае справы. Не спадзеючыся на падтрымку сям'і, ён увесь час шукаў сабе спосабу падзарабіць, спачатку ў майстэрні жывапісца Яблоноўскага, пасьля Пяркоўскага, маляваў карыкатуры для часопіса "Wilnianka". Але ўвосені 1908 году ён заходзіць у "Нашу Ніву"... Занатоўка Драздовіча пра жыцьцё земляробаў Дзісеншчыны і Полаччыны была зьмешчаная ў газэце 20 лістапада 1908 году пад псэўданімам Язэп Разора...

... У 1909 годзе ён дэбютуе ў беларускім друку як мастак, аздабляючы "Першы беларускі каляндар "Нашай Нівы" пад рэдакцыяй Сяргея Палуяна. Ужо ў гэтай першай аўтарскай працы вызначыліся рысы мастацкага стылю Драздовіча — сымбаліста і рамантыка. Зь цемры, дзе стаіць сьцяною яловы лес, прыхінуўшы вёску, насустрач сьвятлу сьпяшаецца араты, на пярэднім пляне другі аповед: пры карэньні старога дрэва, у папарацевым сувоі сьпіць ваярскі рыштунак — шалом, латы, а побач маладзенькі зялёны дубок, які порстка імкнецца ў жыцьцё. Так, ужо ў гэтым графічным творы знайшла сваё ўвасабленьне адна з драздовіцкіх тэмаў: старажытная і маладая Беларусь. Наколькі сюжэт малюнка на вокладцы аказаўся дапасоўным для маладога беларускага нацыяналізму, сьведчыць факт узнаўленьня малюнка Драздовіча на вокладцы календара за 1928 год...

... З вызначальных падзеяў, якія адбыліся ў першы віленскі пэрыяд жыцьця Драздовіча, зазначым Першую літоўскую выставу 1907 году. Бадай, менавіта тут навучэнец другога курсу школы Трутнёва пабачыў упершыню творы Чурлёніса. На выставу адгукнулася і "Наша Ніва". Першым, хто згадаў пра роднаснасьць некаторых твораў Драздовіча і Чурлёніса, быў Зьмітрок Бядуля ("Штрыхі аб беларускай культуры", "Беларускае жыцьцё", 28 студзеня 1920 году): "Шмат ёсьць у Драздовіча гэткіх багатых фантазіяў, напісаных у духу Чурлёніса, а зь беларускай інтэлігенцыі мала хто аб ім ведае". Напэўна, Бядуля меў на ўвазе тыя алегарычныя творы Драздовіча, якія былі створаныя ім падчас службы ў расейскім войску: "Трызна мінуўшчыны", "Брама будучыні", "Злыя чары","Дух зямлі", "Хаос смутку". Як пісаў сам Драздовіч, гэта пяць палотнаў, што "прарочаць будучыню"... Гаварыць пра непасрэдны ўплыў Чурлёніса, аднак, не выпадае і тут. Тое, што абодва гэтыя мастакі сымбалісты, сьведчыць толькі пра тэндэнцыю ў мастацтве тых гадоў, бо верагоднае знаёмства Драздовіча і з творамі паляка Мальчэўскага, альбо расейца Рэрыха. Урэшце не абмінуў сымбалізму і раньні Малевіч, чые творы таго часу можна пабачыць з творамі Чурлёнісам... Узорам мастакоўскае самабытнасьці й сталасьці Драздовіча тых гадоў стала вокладка кнігі "Курганная кветка" Канстанцыі Буйлы, якую мастак стварыў на замову Янкі Купалы. Жаночы вобраз у фантастычным уборы — адзін з самых таямнічых і рафінаваных у "чыстай красе" вобразаў у беларускім мастацтве. Недасяжнасьць і недатыкальнаць вобразу тут эфэмэрныя й чыстыя, як папараць-кветка, якую йдзі пашукай...

1921 год... За плячыма Драздовіча засталіся сем гадоў вайсковае службы, даўжэзны сьпіс адрасоў і мясьцінаў... Адным з плёнаў таго часу было й тое, што малады мастак зьведаў і далёкую Ўсходнюю Беларусь — Віцебск, Воршу, Полацак, Смаленск, Гомель... Ён бачыў рэвалюцыю ў Расеі, адчайныя захады ўзьняць дом Беларускае дзяржавы, спрабаваў прыстасавацца ў савецкім Менску. Зноў вайна... Рыскі мір. Гэты год прайшоў для Драздовіча пад знакам суцэльных клопатаў і згрызотаў душы. Ледзь пасьпеўшы прытуліцца да матчынага пляча, мастак наладзіў сам беларускую школку. Не пасьпеў азірнуцца — школу замкнулі польскія ўлады. Толькі ачуняў ад аднаго ўдару — арышт на тры дні, за агітацыю падчас аднадзённага перапісу насельніцтва ўвесну 1921 году. "Бяда, — піша ён у Беларускі музэй напрыканцы 1921 году, — што я бяспашпартны: не магу адведаць Вільню, бо састаю перад судом за камісарства ў аднадзённую перапісь".

16 сьнежня 1921 году Язэп Драздовіч піша ў сваім лісьце зь Лявонаўкі ў Беларускі музэй імя І.Луцкевіча ў Вільню: "Не зважаючы на надастатак матэрыялаў, я ў працягу гэтага лета змог вымаляваць адзін абраз сымбалічнае пагоні "Пагоня — Яр" (Ярылы). Можа, ня варта занадта хваліцца, але я ўжо заўважыў, што гэты мой абраз рабіў на адведаўшых мяне тут (адкінутага вялікім і дужым сьветам) нашых інтэлігентаў-беларусаў досыць моцнае ўражаньне".

Сымбалі, простыя й ясна чытаныя для беларусаў, выяўленыя праз міталягічныя алегорыі. Ярыла — паганскі бог Сонца, валадар Сусьвету, пераўвасобіўся ў ваяра Пагоні, толькі ягоны меч пераўтварыўся ў вогненны сполах (дарэчы, нярэдкая такая трактоўка старажытнага гербу і ў працах Чурлёніса). Калясальная пачвара — скрыдлаты цмок, які ўпіўся ў жывую Зямлю — сымбаль абсалютнага зла, зразумелы любому. Далёка ў небе, нібы палярнае зьзяньне, уздымаецца запавеса з чароўным горадам, горадам нябесным, які бароніць белая Пагоня. Бароніць плён рук чалавечых і плён ўзьнёслых думаў...

Пярэдні плян утварае асобную кампазыцыйную частку. Плястычна яна вырашана на супрацьпастаўленьні прастакутных геамэтрычных ліній (крыжы, камяні) і плаўных скругленых формаў (чэрап зь вянцом, каштоўнае начыньне, рыхлая субстанцыя зямлі-драпіроўкі). Уся гэтая частка кампазыцыі дадаткова жорстка акрэсьленая і супрацьпастаўленая кірунку другога пляну, ствараючы максымальнае дынамічнае напружаньне, змушаючы рухацца ўсю прастору палатна. Удары лякальных цёмных і сьветлых плямаў драматызуць настрой, даводзячы да афэкту ўспрыманьне алегарычнага сюжэту. Нібыта ад выбуху ўзараная зямля з хаосу камянёў, крыжоў, халодных скарбаў, вызваляе Дух. Цяжкі надмагільны крыж з лацінскім надпісам — Vita, Albarusia, Libertas, зрынуты. Жыцьцё, Беларусь, Свабода паўстаюць зь небыцьця, разьдзіраючы касьмічны дзірван...

Дыдактычны канцэптуалізм Драздовіча тут ня мэта, а сродак падтрыманьня ідэі, дакладней — ключ, пры дапамозе якога мы прачытваем усю складаную пабудову карціны. Аналягічна вырашаў падобную задачу і Франсіска Гоя, суправаджаючы свае містэрыяльныя афорты тэкстамі, уведзенымі ў кампазыцыйнае поле. "Пагоня Ярылы" блізкая паводле сымбалізму да творчасьці гішпанскага мастака. Прыгадаем дыптых Гоі "Свабода памерла. Свабода ўваскрэсла". На першым афорце у бяскрайняй чорнай прасторы пры магіле зьбіраюцца інфэрнальныя цені чалавекападобных пачвараў, яны цешацца са скону Свабоды і гатовыя захлопнуць яе труну вечным камянём. На другім афорце Свабода прачынаецца, наводзячы жах на чорныя постаці, сыпле праменьні ў Космас. І сама алегорыя і мэтады, якія скарыстаў Драздовіч, блізкія да госьцкіх. Мэтафары Цемры і Сьвятла, нетраў Зямлі і Космаса, супрацьпастаўляюцца найперш не канкрэтнымі прадметнымі вобразамі, а праз канфлікт жорсткіх і мяккіх ліній, чорных і белых плямаў.

Сэмантыка вобразаў Драздовіча ўнівэрсальная. Двубой Ярылы і цмока выклікае ў аданачасьсе асацыяцыі з хрысьціянскімі вобразамі Сьятога Юрыя і Сьвятога Ільлі. Выява чэрапа, неадназначная паводле сваёй сымболікі ўвогуле, як згадка пра марнасьць зямнога існаваньня альбо перамогу над сьмерцю, на палатне Драздовіча, у атачэньні дэталяў-падказак, чытаецца як сьвятая рэліквія, парэшткі магутнага валадара, чый дух уваскрасае, абуджаецца ад перуна Ярылы. Чэрап, чыста па-сымбалісцку, — пазытыўны сымбаль. Надпіс на крыжы зроблены на лаціне, тым самым пазначаючы эўрапейскі ўнівэрсалізм беларушчыны ў бачаньні Драздовіча. Сам Ярыла тоесны Пагоні, нацыянальнаму сымбалю, дзяржаўніцкаму пачатку Беларусі. У гэтым сэнсе "Пагоню" Драздовіча можна дараўнаць толькі да "Пагоні" Багдановіча. Па сіле мастацкага ўвасабленьня нацыянальнае сьвятыні гэтыя два творы — Багдановіча ў паэзіі і Драздовіча ў жывапісе — засталіся непераўзыдзенымі. Але яны сфармавалі цалкам новае, уласна беларускае прачытаньне старажытнага гербу, пры пасярэдніцтве паэта і мастака ён быў прыўлашчаны беларускай традыцыяй найноўшага часу.

Карціна, напісаная ў запале ад падзеяў ракавога году, пакінула глыбокі сьлед у памяці наступных пакаленьняў беларусаў. Яе шанавалі менавіта як абраз (як называў яе сам Драздовіч). У розных краінах ёсьць творы мастацтва, якія шануюцца як сымбалі нацыі, побач з гербам ці сьцягам: "Свабода на барыкадах" Дэлякруа, "Грунвальд" Матэйкі, "Мэксыка" Сікейраса. Для беларусаў у гэтым шэрагу стаіць "Пагоня Ярылы" Язэпа Драздовіча.

Сяргей Харэўскі

Язэп Драздовіч (1888, засьценак Пункі, Глыбоцкі пав. – 1954) жывапісец, графік, скульптар, пэдагог, этнограф, археоляг. Вучыўся ў Віленскай малявальнай школе (1906-10). У 1920 слухач курсаў Менскага настаўніцкага інстытуту. Заснавальнік мастацкай студыі пры Віленскай беларускай гімназіі.

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

заснавальнік ..... Павал Жук
рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ..... Лявон Рамашык
набор ..... Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ..... Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2400. 12 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 19[30], 24/8/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4902. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі горыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12